№ 18 (376) 14 траўня 2004 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

Заснаваная ў 1906. Адноўленая ў 1991. Выходзіць у пятніцы

## Балтыка чакае



«Наша Ніва» абвяшчае конкурс для падпісчыкаў. Галоўны прыз пераможцу — адпачынак на Балтыйскім моры. Каб узяць удзел у конкурсе, дасылайце копіі падпісных абанэмэнтаў на 2-е паўгодзьдзе 2004 году на адрас Рэдакцыі.

## Мы прыйдзем да ўлады ўсур'ёз і надоўга



Гутарка з намесьнікам старшыні БНФ Алесем Міхалевічам.

старонка 3

## Апазыцыя займаецца немаведама чым

Легенды і паданьні сучаснай палітыкі.

старонка 9

## Прафанацыя «Эўропы»

Міністэрства культуры не ўхваляе пабудовы гатэлю.

старонка 6

## Аэрапорт імя Мясьніковіча

Або Быкава ці Мулявіна.

старонка 10

# Ніхто не забыты



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Рэзалюцыя ПАРЭ — толькі пачатак.

старонка 2

# А ўсё ж закруцілася

Інтэлектуалы попу — Аляксандра й Канстанцін — сталі першымі ў гісторыі прадстаўнікамі Беларусі на «Эўрабачаньні». Выйгралі ці прайгралі, якая розьніца — першы блін можна й сабаку. Галоўнае, мы там ёсьць. Мы сталі цікавыя самі сабе.

Беларуская маскультура нараджаецца. Гадамі інтэлектуалы заклікалі: маскультура, паўстань. Вось яна нараджаецца, і нават за яе ня сорамна.

«АіК» добра ловяць аўтэнтычную народную манеру сьпеваў, хоць калядную песьню могуць засьпяваць як вясновую. «Мой Галілей» — у ёй ёсьць драйв. Нармальны белапоп. Каб жа шчэ па-беларуску… А то You're my pier I'm here. Шкада: уся Эўропа магла б пачуць, што гэта за такая беларуская мова, мэлёдыка-фанэтыка.

«АіК» — частка барысаўскага фэномэну. Нейкі энэргетычны выбух адбываецца ў вайскова-турэмным горадзе, зь якога выйшла за апошнія гады плеяда палітыкаў, бізнэсоўцаў, пісьменьнікаў, музыкаў.

Фантастыка: Беларусь перажывае бум папулярнасьці беларускае музыкі. А што тут незвычайнага, спытаўся б паляк ці эстонец. Але ў нашых палестынах дзіва дзіўнае. Беларускія гурты зьбіраюць тысячныя залі! Кліп за кліпам, прэм'ера за прэм'ерай! Госьці! Монтэвідэа! Мірны з Алесяй!!! Адкуль што ўзялося? З 50% айчыннае музыкі на радыё. Дзякуй клятаму Падгайнаму. І ніхто не наракае, і нікому ня стала горш. Гэта — скептыкам беларускага адраджэньня.



WWW.TVR.BY

**49-ы міжнародны музычны конкурс «Эўрабачаньне-2004» у Стамбуле праводзіцца ў жывым эфіры. Паўфінал адбыўся ў сераду, фінал — у суботу 15 траўня а 21-й вечера па сярэднеэўрапейскім часе. У конкурсе бяруць удзел 36 краінаў. Ён праходзіць у адным з найбольшых у Стамбуле спарткомплексаў «Abdi Ipeksi Arena», з заляй на 7500 месцаў. Дэвіз панэўрапейскага шоў — «Пад адным небам». Штогод відовішча прыцягвае больш за 100 мільёнаў тэлегледачоў. Бюджэт конкурсу складае 8,3 млн даляраў.**

## Памерці, але забясьпечыць



У Мірнага, Хадатовіч, Цылінскай просяць 25, а ня 100.

старонка 11

## Ultra-Вожык




Песьні пра кіраўніка нашай дзяржавы.

старонка 12

## Паэзія новага пакаленьня

падсьвечаны й тыражаваны глухі менск
дзівіць правінцыялаў ды іншую навалач
чысьцінёю
нават зімою будзе квітнець бэз
калі гэтага захочуць бамжы й героі

старонка 15

# Рэзалюцыя ПАРЭ — толькі пачатак

Ірына Красоўская,

жонка Анатоля Красоўскага, зьніклага ў 1999 г.



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Даклад Хрыстаса Пургурыдэса «Зьніклыя людзі ў Беларусі» прыняты Парлямэнцкай асамблеяй Рады Эўропы. Гэта — перамога! Гэта сьвятло ў канцы тунэлю для нас — родных і блізкіх тых, хто зьнік не на вайне, а быў выкрадзены ў цэнтры Эўропы ў мірны час, — Юр'я Захаранкі, Віктара Ганчара, Анатоля Красоўскага, Дзьмітрыя Завадзкага.

Даклад быў ухвалены ПАРЭ напярэдадні пятай гадавіны зьнікненьня Юр'я Захаранкі. Што для нас гэтыя гады? Гэта — чаканьне, надзея, гора, сьлёзы і бясконцая барацьба. Барацьба за выжываньне, барацьба за гонар нашых блізкіх, барацьба за высьвятленьне праўды, барацьба з уладнай дзяржаўнай машынай, якая спрабуе гэтую праўду схаваць чым глыбей, барацьба зь непрыхаваным цынізмам з боку афіцыйных газэт, тэлебачаньня і тых, хто называе сябе гарантам Канстытуцыі.

І ўсё-такі даклад прыняты! І гэта пачатак новага этапу ў пошуку праўды пра лёсы выкрадзеных людзей у Беларусі. Да апошняга моманту былі сумненьні ў тым, што ён будзе прыняты, — занадта доўга мы ішлі да гэтага, занадта сур'ёзныя абвінавачаньні супраць улады, занадта жорсткія меры. Але дзейсныя і справядлівыя.

Ніхто яшчэ не наважваўся ў афіцыйным дакумэнце такога ўзроўню шчыра і адкрыта сказаць:

— так, вышэйшыя службовыя асобы Беларусі падазраюцца ў дачыненьні да зьнікненьняў, і гэтаму ёсьць доказы;

— так, многія афіцыйныя асобы замешаны ва ўтойваньні праўды і абцяжарваньні расьсьледаваньня гэтых зьнікненьняў, уключаючы прэзыдэнта;

— так, у цэнтры Эўропы існуе дыктатарскі рэжым;

— так, неабходна рабіць жорсткія дзеяньні да ўстанаўленьня ісьціны ў справе выкрадзеных і ліквідацыі гэтага дыктатарскага рэжыму;

— так, Эўропа павінна дапамагчы Беларусі зьмяніць сытуацыю і вярнуцца да цывілізаванага жыцьця.

І гэта ня проста словы — для правядзеньня сапраўднага расьсьледаваньня прапануюцца канкрэтныя крокі:

— адхіленьне ад пасад генэральнага пракурора В.Шэймана, міністра спорту і турызму, былога міністра ўнутраных спраў Ю.Сівакова, камандзіра ЗАХРу Дз.Паўлічэнкі;

— прапанова судам тых краін, законы якіх прадугледжваюць міжнародную юрысдыкцыю па справах аб сур'ёзных парушэньнях правоў чалавека, пачаць працэсы супраць некаторых высокапастаўленых беларускіх чыноўнікаў за забойствы па палітычных матывах;

— прыпыненьне ўсіх кантактаў на вышэйшым узроўні зь беларускімі ўладамі да вырашэньня гэтага пытаньня.

Гэта толькі пачатак. Цяпер слова і справа за Камітэтам Міністраў Рады Эўропы, парлямэнтамі краін Эўрапейскага Зьвязу, судамі эўрапейскіх краін, прэзыдэнтамі і прэм'ер-міністрамі, праваабарончымі арганізацыямі, журналістамі і ўсімі людзьмі, якім неабыякавы лёс Беларусі як часткі Эўропы і яе будучыні.

**www.charter97.org**

## Андрэй Хадановіч
# Памяці дрэваў

На вуліцы, што галіма завецца Маркса,
дзе нават Карэніным гідка трапляць пад колы,
філфак, бы юнак на дапросе, цьвёрда трымаўся
у шэрым будынку Вышэйшай Партыйнай Школы.

І мы пачуваліся б тут, нібы на вакзале,
і ўсё было б тут паскудна, калі б ня дрэвы,
якія штогоду ў вясновай канцэртнай залі
выконвалі ролю ў бэза на разагрэве.

Вы ўчора яшчэ дажджом сьцякалі па кроплі,
цяклі за каўнер і тушшу паўзьлі па твары —
зялёныя, як ружовыя нашы соплі,
ружовыя, як зялёныя нашы мары.

Як файна ля вас разьліўное піва пілося
пад рыбу з шыкоўным іменем путасу,
а ўчора ад вас нічога не засталося,
і толькі ружовыя соплі ў носе нясу.

Бо вас паскідалі трупамі каля ўзбочча,
і гэтыя згадкі, і гэтыя словы ня лек вам,
ды толькі мясцовы паэт упарта балбоча,
складаючы штосьць зь недарэчнай назваю рэквіем.

Яму па-любому, як правільна — «дрэваў» ці «дрэў»,
бо ўчора ён не сустрэў вас — і захварэў.

# Забаронены канцэрт

Канцэрт у падтрымку навучэнцаў Беларускага ліцэю, які меўся адбыцца 14 траўня, не адбудзецца. Кіраўніку вучнёўскага самакіраваньня Ліцэю Франаку Вячорку затэлефанаваў дырэктар клюбу «Рэактар» Аляксей Кучко і адмовіў: маўляў, праз вас у клюбе могуць пачацца фінансавыя праверкі.

**АШ**

### «Быкаў на Свабодзе» і ў новым «Дзеяслове»

Прэзэнтацыя кнігі «Быкаў на Свабодзе» — збору інтэрвію і выступаў пісьменьніка Васіля Быкава ў эфіры радыё «Свабода» — адбудзецца 20 траўня а 18-й у Доме літаратара. Уваход вольны.

Невядомым раней апавяданьнем Быкава «Бутэлечка, альбо Прэзыдэнт на дрэве» адкрываецца 9-ы нумар «Дзеяслова». Поўная горкай іроніі прыпавесьць была напісаная пры канцы XX ст.




# Зьезд лібэралаў

Навамоднае слова «праймэрыз» гучала амаль у кожным выступе на зьезьдзе АГП. Партыя шукае патэнцыйных кандыдатаў у кандыдаты ў прэзыдэнты. Знайсьці Адзінага, паводле АГП, могуць толькі праймэрыз, палітычныя агледзіны (гэта значыць: хай **народ** сам скажа, каго ён хоча). «Хто замест яго?» — да гэтага пытаньня зноў і зноў вярталіся на зьезьдзе партыі 8 траўня. Партыя гатова падтрымаць любога Адзінага, улічваючы памылкі 2001 г.

Старшыня партыі Анатоль Лябедзька ў сваім выступе сказаў, што патэнцыйныя кандыдаты прыходзяць у партыю з прапановай аб супрацоўніцтве, але заклікаў сяброў «устрымацца ад спакусьлівых прапаноў».

Першым агучыў спакусьлівую прапанову Андрэй Клімаў, і партыя ад яе ўстрымалася. Клімаў, які некалькі месяцаў таму часова прыпыніў сяброўства ў АГП, зьвярнуўся па маральную падтрымку, зазначыўшы, што рэсурс партыі яму не патрэбен, ён пераможа сам. Клімаў добра ўвайшоў у ролю будучага прэзыдэнта і парэдзіне прамовы ўжо нават гарантаваў Лукашэнку бясьпеку ў выпадку яго адмовы ад пасады прэзыдэнта. Сваім саюзьнікам Клімаў абвясьціў ні больш ні менш Пуціна (з расейскай дагодлівасьцю назваўшы яго «Ўладзімер Уладзімеравіч») і размахваў паперкай з Крамля, дзе яму нібыта гарантуецца, што Лукашэнка ня пойдзе на трэці тэрмін. Кім дакумэнт падпісаны — Клімаў не сказаў, а сам дакумэнт паказаў толькі Палíткамітэту.

Маладыя дэлегаты зьезду Ўладзімер Чырвоненка, Аляксандар Цынкевіч, Ігар Шынкарык усё больш казалі пра парлямэнцкія выбары. Моладзь настроена на перамогу: зранку выбары, увечары імпічмэнт, а далей мы робімся гарантамі пераходнага пэрыяду. Напярэдадні зьезду ў партыю ўступілі Васіль Старавойтаў, Валянціна Палевікова і Людміла Пеціна, пацьвердзіўшы тэзыс аб АГП як партыі эліты.

Як госьці выступілі сябры партый камуністаў, зялёных, БНФ (В.Вячорка), лідэр незалежных прафсаюзаў А.Ярашук.

Працяг на старонцы 4.

### Горадня: ператрусы

Віктар Вягера, кіраўнік гарадзенскага КДБ, чарговы раз у авангардзе барацьбы з палітычнымі апанэнтамі рэжыму: у аўторак ягоныя падначаленыя ператрэсьлі адначасова сядзібы ТБМ, ТБШ і Фонду Сапегі. Сканфіскаваныя кампутары, на якіх рыхтавалася газэта «Дзень». У кулюарах гавораць, што гэта й было галоўнай мэтай вобшукаў, а ўлётка, якую распаўсюджваў прадпрымальніцкі лідэр Леванеўскі, была толькі падставай для расправы.

### Сідорскі, Латыпаў у Карлавых Варах

Адпачынак А.Лукашэнкі ў Аўстрыі й Славеніі стаў прыкладам для іншых дзяржаўных асобаў, паведамляе радыё «Рацыя». Прэм'ер Сяргей Сідорскі і кіраўнік адміністрацыі прэзыдэнта Ўрал Латыпаў у якасьці прыватных асобаў раскашавалі на славутым чэскім курорце, прычым прэм'ер там адсьвяткаваў сваё 50-годзьдзе.

### Трэці тэрмін: не

Калі на рэфэрэндум будзе вынесенае пытаньне пра адмену абмежаваньняў на правы займаць прэзыдэнцкую пасаду больш за два разы, 54,4% выбарцаў прагаласуюць супраць. Прыхільнікаў зьмены набіраецца ў два разы меней, — вынікі красавіцкага апытаньня «Новака».

### Трункі: навінкі «БелПІ»

«БелПІ» выпускае ў продаж новыя напоі маркі «Традыцыя»: дзевяць відаў духмянае гарэлкі з сэрыі «Гіт» (ананас, ядловец, мандарын ды інш.), а таксама настойку з хрэнам «Верадуб» і трунак «Тайна мудрасьці» з жэньшэнем — усё ў квадратных штофах.

### Эстонія: кампэнсацыя за савецкую акупацыю

У Эстоніі падрыхтаваная «Белая кніга» школы, нанесенай краіне ў 1940—1991. У Эстоніі рэпрэсавалі 180 тыс. чалавек, 90 тыс. загінула. Камісія таксама ацаніла ў $4 млрд школу ад разьмяшчэньня савецкай арміі ў Эстоніі.

### Аўта: беларускія грузавічкі

15 траўня «Юнісон», пераемнік заводу «Форд Юніён», пачне выраб малатанажных аўтамабіляў «Люблін-3» — дзевяцімясцовых бусікаў і грузавых фургонаў. У 2004 г. плянуецца сабраць 1000 машынаў.

**МБ; БелаПАН**

ПРАВАКАЦЫЯ

# Яўрэйскія скінхеды

Надоечы ў Сеціве зьявілася старонка з адмысловым зьместам — яе стваральнікі выступаюць ад імя беларускіх яўрэяў, называючы сябе «яўрэйскімі скінхедамі». Зьмест заяў гэтых «антыфашыстаў», якія нібыта знаходзяцца ў хаўрусе зь «лібэральнай апазыцыяй», зводзіцца да заклікаў імітаваць пагромы, руйнаваць могілкі ды інш., каб зваліць віну на ўлады — маўляў, Талмуд «дазваляе нам гэтак рабіць». Беларуская мова аб'яўляецца... антысэміцкай, а да яўрэяў залічваюцца Будны, Скарына, Цётка, Якуб Колас. У кожным вар'яцтве ёсьць свая лёгіка — старажытныя могілкі ды сынагогі насамрэч разбураюцца з санкцыі пэўных службовых асобаў, пра што «НН» неаднакроць пісала. Ім, напэўна, і выгадна перакласьці віну на «адмарозкаў».

Магу засьведчыць, што ніякага руху «радыкальнай яўрэйскай моладзі» ў Беларусі няма. На жаль, а мо й на шчасьце, мае 15—30-гадовыя суплямеңнікі цікавяцца хутчэй дармавымі паездкамі ў Ізраіль, чым лёсам Нямігі ці публікацыяй «Войны по законам подлости», — правяраў ня раз! Зьяўленьне правакацыйнага сайту сьведчыць аб тым, што прыхільнікі лёзунгу «падзяляй і ўладар» ня сьпяць у шапку, эксплюатуючы старыя юдафобскія стэрэатыпы, выдумляючы ўсё новыя штукі ды хітрыкі, каб нацкаваць яўрэяў на беларусаў і *vice versa*.

**Вольф Рубінчык, Менск**

# Strawberry Fields Forever

«Прэзыдэнт Польшчы Аляксандар Квасьнеўскі прызнаўся, што ў 1970-я нелегальна працаваў у Вялікай Брытаніі. Пра гэта ён паведаміў у інтэрвію брытанскаму тэлеканалу «Channel-4» падчас свайго афіцыйнага візыту ў Аб'яднанае Каралеўства. Каб зарабіць грошай і папрактыкавацца ў ангельскай мове, Квасьнеўскі, тады студэнт Гданьскага ўнівэрсытэту, працаваў бармэнам падчас летніх вакацыяў».

Вось яно як… Цікава, колькі сёньняшніх славянскіх нелегалаў у Брытаніі і ЗША вернуцца туды год праз 20 з афіцыйнымі візытамі? І ці ня пасьвіцца на «Клубнічцы» (яна ж «*Strawberry Fields Forever*» — www.sff2003.by.ru, сайт, прысьвечаны летнім падпрацоўкам беларускіх студэнтаў на ангельскіх фэрмах) будучы лідэр дзяржавы?

У любым выпадку, сэнсацыйная заява пана Квасьнеўскага дадае вобразу гастарбайтэра рамантычнасьці.

**Марыйка Мартысевіч**

# «Мы прыйдзем да ўлады ўсур’ёз і надоўга»

**Намесьнік старшыні Партыі БНФ, дэпутат Пухавіцкага райсавету Алесь Міхалевіч адказвае на пытаньні «НН» па выхадзе з турмы, дзе ён адседзеў 10 сутак як суарганізатар «Чарнобыльскага шляху».**



Алесь Міхалевіч: Я пайшоў у палітыку, бо мне падабаецца гэты занятак

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**«НН»: Ці актуальнае цяпер палітычнае пакутніцтва? Вы селі на 10 сутак за мерапрыемства, куды прыйшло 1000 чалавек.**

**Алесь Міхалевіч:** Я не плянаваў сесьці ў турму. «Чарнобыльскі шлях» праводзіцца з канца 80-х — з шэсьцем, са званом. Я лічу, што традыцыя павінна працягвацца. І калі паўстала пытаньне, хто будзе заяўнікам ад нашае Партыі, абралі мяне.

**«НН»: А гэтая традыцыя не замшэла? Традыцыя мусіць прыносіць задавальненьне альбо дывідэнды. Чарнобыль жа абрыд нават тым, хто ад яго пацярпеў.**

**А.М.:** Я не лічу, што ўвага да Чарнобылю мусіць прыносіць дывідэнды. Гэта пазыцыя чалавека, які называе сябе кіраўніком дзяржавы. А апазыцыя будзе з увагаю ставіцца да пытаньня, бо гэта пытаньне фізычнага выжываньня нацыі. Тыя, хто засталіся цяпер на заражаных тэрыторыях, — збольшага ня надта актыўныя людзі. Актыўныя пазьяжджалі. Я прыгадваю пачатак 90-х, калі кожны год у прычарнобыльскіх раёнах ствараліся суполкі, структуры БНФ, а праз год ад гэтых структураў нічога не заставалася, бо гэта ўсё былі людзі актыўныя, якія разумелі небясьпеку для сябе, сваіх сем’яў і папросту зьяжджалі. Нельга казаць, што Чарнобыль не прыцягвае ўвагі. Прыцягвае, і вельмі пільную, асабліва з боку навукоўцаў. Але трэба разумець, што ёсьць стомленасьць праблемаю і ўсьведамленьне таго, што цяпер нельга нічога зрабіць. Калі нічога нельга зрабіць, трэба проста жыць і радавацца жыцьцю. Што шмат хто й робіць.

**«НН»: Гэта быў Ваш першы тэрмін. Пра што думалася на нарах?**

**А.М.:** Я быў там зь сябрам — Аляксандрам Козелам з АГП, да таго ж у камэры знаходзіліся вельмі цікавыя людзі, якія адседзелі пэўныя тэрміны на зоне і ў турмах. Было цікава паглядзець, як жывуць тыя, каго цяжка залічыць да сацыяльных вяршкоў. Гэтыя людзі таксама не падтрымліваюць Лукашэнку, а чакаюць нейкага сыгналу ад нас, чым яны канкрэтна могуць дапамагчы.

**«НН»: Алесь, а ці трэба цяпер ладзіць акцыі супраціву? Людзі навучыліся неяк жыць, зарабляць, хоць і па-шэраму. Бяруць крэдыты, будуюць жыльлё, здаюць яго; бяруць крэдыты, набываюць футры й побытавую тэхніку. Гандлююць на рынку. Падзарабляюць у Польшчы, Літве й Расеі. Карацей, прыстасаваліся, на вуліцы ня пойдуць.**

**А.М.:** Актыўнасьць-пасіўнасьць надыходзіць хвалямі. Я лічу, мы цяпер на пачатку новай фазы актыўнасьці. Калі б мы цяпер перасталі ладзіць акцыі, хутка страцілі б навыкі вулічнай палітыкі. І калі хваля падымецца, мы ня здолелі б зарганізаваць яе ў канструктыўнае рэчышча.

**«НН»: І які ў выніку вобраз Беларусі як краіны і дзяржавы Вам бачыцца?**

**А.М.:** Беларусь — зялёная краіна з праэкалягічнай палітыкай, г.зн. з высокім працэнтам лясоў і добрай прыродай. Гэта краіна бяз атамнай энэргетыкі, якая пасьлядоўна выступае супраць атамных станцый і за зьнішчэньне ядравай зброі. Гэта прамысловая краіна з разьвітымі прадпрыемствамі, сфэрай паслуг і інфармацыйнымі тэхналёгіямі. Гэта краіна, дзе безумоўна забясьпечваюцца правы чалавека. Гэта краіна, беларуская ва ўсім.

**«НН»: Ідэальны вобраз Менску?**

**А.М.:** Перш за ўсё, трэба аднавіць архітэктурныя помнікі. Акрамя таго, Менск павінен станавіцца горадам 1-2 павярховай забудовы (я ня маю тут на ўвазе цэнтар). Ненармальна, калі бальшыня насельніцтва (пад 95%) жыве ў шматпавярховых блёках. Неабходна далучэньне (праз хуткую камунікацыю) гарадоў кшталту Фаніпалю, Заслаўя, Маладэчна й Мар’інай Горкі. Гэта паляпшэньне ўнутраных транспартных камунікацыяў (усіх вуліц, а ня тых, па якіх езьдзіць Аляксандар Рыгоравіч Лукашэнка) і павышэньне якасьці падменскай забудовы.

Той вобраз ідэальнага Менску, які я сабе ўяўляю, сфармаваны маёй біяграфіяй, сям’ёю. Я нарадзіўся ля Камароўкі і жыў там. Мой дом быў адміністрацыйна аднесены да вул. Харужай толькі ў пачатку 90-х, а да гэтага ён быў адзіным домам па вул. Пераможнай. І нумар яму быў не 1 або 2, а адразу 12. Іншых дамоў на абсурднай вуліцы не было. Бацькі мае пераехалі ў Менск. Маці з Пухавіцкага, бацька з Койданаўскага раёну. Мае бацькі заўсёды выступалі за тое, каб гістарычных помнікаў ня зносілі. Маці працавала ў Акадэміі навук, гэта было традыцыйна вальналюбнае асяродзьдзе.

**«НН»: Ці ёсьць у Вас пакрокавая стратэгія шляху да намаляванага відарысу?**

**А.М.:** Ніякія зьмены ня будуць немагчымыя, калі ўвесьці мясцовае самакіраваньне. Толькі тады мясцовыя кіраўнікі будуць праяўляць ініцыятыву, калі будуць залежаць ад выбарнікаў, а не ад начальства. У Беларусі няма нафты й газу, каб раздаць кожнаму жыхару ў выглядзе сацыяльных датацыяў. Нават калі 30% людзей здолеюць працаваць, раскрыўшы свой творчы патэнцыял, — мець сваю справу, свой бізнэс, свой дом — гэта і будзе шлях да нармальнай Беларусі, у якой нармальна жывецца.

**«НН»: А які сцэнар зьменаў, на Вашую думку?**

**А.М.:** Перш за ўсё гэта падрыхтоўка людзей, якія на ўсіх узроўнях увойдуць ва ўладу — на ўзроўнях гарадоў, мястэчак, вёсак. Якім чынам гэта адбудзецца? Крайнія варыянты — румынскі ці чэскі, бяскроўны. Наш варыянт будзе беларускі. Для мяне гэта ясна. Нармальны варыянт. Я перакананы, ён будзе некрывавы для простых людзей. Зьмены робяцца не адным крокам, ня толькі зьменаю кіраўніка дзяржавы, а цяжкай творчай працай на месцах.

**«НН»: Іншым суразмоўцам я задавала пытаньне, што ім не падабаецца ва ўласнай нацыі. Адказы былі розныя: зайздрасьць, хамства, п’янства й г.д. Што не падабаецца Вам?**

**А.М.:** Мы нармальны, здаровы народ. Няма нейкіх спэцыфічных дрэнных якасьцяў. П’янства — ад нерэалізаванага патэнцыялу. Цяпер улады заядаюць чужы век. Беларусы працавітыя! І я не іранізую, паезьдзіў па сьвеце, пабачыў розныя нацыі. Беларусы ня схільныя да рэзкіх зьменаў, кансэрватыўныя. Але гэта й добрая якасьць. Калі мы з паплечнікамі прыйдзем да ўлады, мы прыйдзем усур’ёз і надоўга дзякуючы гэтай якасьці. І я ўпэўнены, што народ аб гэтым не пашкадуе.

**«НН»: Мы пагаварылі пра сям’ю, у якой Вы нарадзіліся. Давайце пагаворым пра тую, што стварылі Вы самі.**

*А.М. надоўга задумваецца.*

**«НН»: Ох, ну няўжо цяжка расказваць пра любімых людзей?**

**А.М.:** Гэта такая інтымная сфэра, што баішся, як бы не нашкодзіць. Тым больш што мая жонка, Мілана, працуе ў дзяржструктуры. Яна выкладчыца ангельскай мовы. Маёй дачцэ 3 гады, яе завуць Леся Стэфанія. Мы жывём асобна ад бацькоў. Леся ходзіць у беларускамоўны садок і з гонарам глядзіць, як дзеткі ў публічных месцах торгаюць бацькоў за рукаво: мама, тата, тая дзяўчынка гаворыць па-беларуску.

**«НН»: Вы кажаце ёй пра тое, што былі ў турме?**

**А.М.:** Так. Яна сказала выхавальніцам: «Мой тата сядзіць у турме, таму што Лукашэнка нядобры чалавек». Тыя паставіліся непазытыўна, і я іх добра разумею. Мы не засяроджваем дзіцяці на палітыцы. Але з кожнай перадачай я атрымліваў малюнкі свае дачкі і памятаў пра яе кожную хвілю. Мне падабаецца мая сям’я. Я хачу яшчэ адно дзіця як мінімум.

**«НН»: Чаму Вы не ідзяце абірацца ў Мар’інай Горцы, дзе Вы узялі 75% галасоў?**

**А.М.:** У нас там чатыры фронтаўцы сталі дэпутатамі мясцовага савету, і адзін зь іх, лекар, ліквідатар аварыі на ЧАЭС, будзе абірацца ў ПП НС. Наша супольнае рашэньне. А я пайду ў Менску і тут таксама здолею прыносіць карысьць.

**«НН»: КДБ хацеў Вас прыціснуць за будаўніцтва катэджу ў Мар’інай Горцы?**

**А.М.:** Было так: паўгоду таму КДБ прапаноўваў мне «ўзаемавыгаднае супрацоўніцтва» і абяцаў правесьці ў ПП НС. Я адмовіўся. Між іншага, вэрбоўнік намякнуў: а што гэта ў некаторых заробак малы, а яны і кватэру ў Менску маюць, і катэдж у Мар’інай Горцы будуюць? Ну чыстая праўда: мы з маім сябрам Алесем Васьковічам будуем дом на дзьве сям’і ў прыстойным месцы ў цэнтры гораду. На жаль, ня тымі тэмпамі пасоўваецца будаўніцтва, як мы хацелі, але мы скончым і будзем мець там свой кут.

**«НН»: Якая, па-Вашаму, роля эліты ў кіраваньні дзяржавай, распараджэньні рэсурсамі краіны?**

**А.М.:** Пытаньне дэфініцыі — каго лічыць элітай? На пасадах мусяць быць творчыя, незалежныя людзі. Толькі такія людзі здольныя эфэктыўна кіраваць усімі працэсамі й праектамі ў грамадзтве. Талент таксама — гуртаваць вакол сябе крэатыўных і самастойных людзей ды выяўляць іх найлепшыя якасьці, каб яны пашыралі свой уплыў.

Працяг на старонцы 6.

# Зьезд лібэралаў

Працяг са старонкі 2.

Старшынём без неспадзяванак перавыбралі Анатоля Лябедзьку. У праграмным выступленьні ён зазначыў, што, нягледзячы на тое што АГП ня стала масавай партыяй, яна пераадольвае пяціпрацэнтны бар'ер, а значыць, зьяўляецца палітычнай сілаю. Паводле слоў Лябедзькі, АГП — самая рэйтынгавая і ідэалягічная партыя краіны, калі не лічыць папулярнага брэнду «Жаночая партыя».

Зьезд пад выяваю каня і дэвізам «Свабода—уласнасьць—законнасьць» адбываўся ў строгай адпаведнасьці з рэглямэнтам і парадкам дня (абед — паводле раскладу) і на належным тэхнічным узроўні: усе праграмныя дакумэнты былі выдадзены брашурай, выступы трансьляваліся на маніторы. Насуперак міту пра русафільскасьць АГП у перапынках гучалі запісы Данчыка, а ва ўзорах бюлетэняў як прыкладныя прозьвішчы кандыдатаў фігуравалі Ян Яновіч і Ігнат Ігнатовіч замест звыклых Пятра Пятрова і Івана Іванова.

Праграма партыі і пасланьне АГП да беларускага народу з прыстойным аналізам палітычнай і эканамічнай сытуацыі пацьвердзіла імідж «партыі прафэсіяналаў»: праграма зьмяшчае 12 старонак сыстэмных рэформаў у палітыка-прававой, замежнай, эканамічнай і гуманітарнай сфэрах.

Засталося толькі знайсьці Ігната Ігнатовіча альбо Яна Яновіча.

**Вераніка Дзядок**



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

# Асамблея зачыненых арганізацый



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Сяргей Мацкевіч нарадзіўся ў 1964 г. Скончыў фізычны факультэт БДУ. У грамадзкай дзейнасьці — з 1996 году. З таго ж году — сябра ГА «Цэнтар «Супольнасьць». Папярэднія два гады — намесьнік старшыні рабочай групы Асамблеі НДА.**

На сьвята салідарнасьці працоўных у Менску адбыўся V кангрэс Асамблеі дэмакратычных няўрадавых арганізацыяў Беларусі. Пра сытуацыю ў сэктары красамоўна сьведчыць той факт, што за два гады ад папярэдняга кангрэсу ўлады зачынілі 55 арганізацый. Замест Алеся Бяляцкага новым кіраўніком рабочай групы асамблеі на 2 гады абраны старшыня цэнтру «Супольнасьць» Сяргей Мацкевіч. Пра вынікі Кангрэсу ён расказаў карэспандэнту «НН».

**— Якія адбыліся перастаноўкі ў Рабочай групе Асамблеі?**

— У рабочую групу выбраны 43 чалавекі. Мяне абралі старшынём (папярэдні тэрмін я быў адзіным намесьнікам). Абрана таксама пяць намесьнікаў: Алесь Бяляцкі, Барыс Звоскаў зоймуцца абаронай праваоў НДА, а таксама пытаньнямі альтэрнатыўнага прызнаньня, у абавязках Ірыны Жыхар будзе арганізацыйнае разьвіцьцё ды стратэгічнае плянаваньне, Віталь Васількоў — адказны за працу з рэгіёнамі, а Вацлаў Арэшка — за камунікацыю ды імідж.

**— Што такое «альтэрнатыўнае прызнаньне»?**

— Працэдура, альтэрнатыўная дзяржаўнай рэгістрацыі. Г.зн. магчымасьць для аб'яднаньняў, якіх пазбавілі рэгістрацыі ў Беларусі, зарэгістравацца ў іншых краінах. Ідзя ў тым, каб паспрабаваць атрымаць міжнародны сэртыфікат для закрытых у Беларусі арганізацыяў, а таксама для тых, якім у рэгістрацыі адмовілі.

**— Гэта дапаможа спыніць ланцуг скасаваньняў рэгістрацыяў?**

— Ня трэба зацыклівацца на гэтай рэгістрацыі. Насамрэч, усе зачыненыя арганізацыі працуюць. А тое, што дзяржава больш ня можа іх кантраляваць пры дапамозе падатковай інспэкцыі й Мінюсту, толькі вызваляе ад лішняга клопату.

**— Ці слушнае рашэньне пра ўдзел НДА ў парлямэнцкіх выбарах?**

— Рашэньне пра ўдзел прымае кожная арганізацыя самастойна. Але меркаваньне большасьці ўдзельнікаў Кангрэсу мы агучылі. Шмат якія грамадзкія аб'яднаньні вырашылі прыняць удзел у выбарах — навошта ж ім пярэчыць?

На кангрэсе меліся таксама разгледзець Канцэпцыю разьвіцьця недзяржаўных арганізацый ды СМІ, распрацаваную філёзафам Алесем Анціпенкам. Але ў апошні момант А.Анціпенка сам вырашыў не рабіць прэзэнтацыі з прычыны таго, што канцэпцыя не магла быць прынятая як папярэдне няўзгодненая. Але да яе, пэўна, яшчэ дойдзе справа, бо гэта першая цэласная канцэпцыя разьвіцьця НДА ў Беларусі. Сутнасьць яе, паводле слоў аўтара, палягае ў тым, каб ажыцьцявіць разьвіцьцё НДА на падмурку прапагандаваньня ўступленьня Беларусі ў Эўразьвяз. Па часе канцэпцыя разьлічана на 10—15 гадоў.

**Зьміцер Дрыгайла**

На галоўнага рэдактара газэты «Дзень» **Міколу Маркевіча** 6 траўня ў Івейскім райаддзеле міліцыі склалі пратакол за згадку ў газэце незарэгістраванага страйкаму прадпрымальнікаў; наклад газэты быў арыштаваны на івейскім пасту дарожнай міліцыі яшчэ 11 красавіка. У Горадні супрацоўнікі КДБ 7 траўня правяліператрус у кватэры намесьніка старшыні Агульнанацыянальнага страйкаму прадпрымальнікаў **Аляксандра Васільева**, а таксама з дапамогай АМАПу ўварваліся ў кватэру старшыні страйкаму **Валер'я Леванеўскага**, які знаходзіцца за кратамі. Пасьля ператрусу на допыт у КДБ забралі 17-гадовую **Кацярыну Леванеўскую** і 20-гадовага **Зьмітра Леванеўскага**. Наваполацкага праваабаронцу **Зьмітра Салаўёва** 7 траўня аштрафавалі на 10 базавых велічыняў за тое, што ён не пусьціў прадстаўнікоў падатковай інспэкцыі ў свой офіс. Падчас акцыі «Мы памятаем» у Наваполацку былі затрыманы **З.Салаўёў**, **Ігар Макану**, сябар Партыі БНФ **Алесь Трубкін**, старшыня гарадзкой арганізацыі БСДГ **Ігар Валяеў**, сябры АГП **Аляксандар Цярэнцьеў**, **Сяргей Забродзкі**, **Валер Шаўчэнка**, **Ігар Сухарукаў** і карэспандэнт радыё «Свабода» **Вінцэсь Мудроў**. 11 траўня суд апраўдаў усіх, не знайшоўшы ў іх дзеяньнях адміністрацыйнага правапарушэньня. Гаспадарчы суд Гомельскай вобласьці 7 траўня не задаволіў пазову жаночага ГА **«Ініцыятыва»** да Гомельскага райвыканкаму. «Ініцятыва» дамагалася адмены рашэньня, паводле якога ёй нельга мець адрас у прыватным доме. 8 траўня Менская транспартная пракуратура прызнала **Аксану Новікаву** абвінавачанай у крымінальнай справе за паклёп на А.Лукашэнку. **Міхаілу Марынічу** 10 красавіка адмовілі ў хадайніцтве аб зьмене меры стрыманьня.

**АШ**

# Страшна выключыць

## Сасім працягне навучаньне

Мікіту Сасіма, лідэра баранавіцкіх «зуброў», зьбіраліся выключыць з каледжу лёгкай прамысловасьці. Пра гэта яму паведамілі яшчэ 16 красавіка на нарадзе ў дырэктара каледжу Аляксандра Ліса. Падставай была колькасьць прагулаў, да якіх залічылі й тыя дзесяць сутак, якія хлопец правёў у зьняволеньні: маўляў, прычыны, чаму ён «прагульваў» заняткі, — ягоная асабістая справа. Тады, на нарадзе, Сасіму прапанавалі тры варыянты: першы — навучэнец дае мэдычную спраўку, якая пацьвярджае, што ён хварэў; другі — Мікіта пераходзіць на платнае завочнае навучаньне, і трэці — яго проста выключаюць. Дарэчы, Мікіта Сасім — адзін з найлепшых навучэнцаў каледжу.

Які лёс напаткае Сасіма, павінна было вызначыцца 28 красавіка на настаўніцкім сходзе. Але ў гэты дзень хлопцу патэлефанавалі й сказалі, што ягонае «пытаньне» будзе разглядацца праз тыдзень, 5 траўня.

Непасрэдна ў гэты дзень каля каледжу сабраліся актывісты «Зубра» зь Менску, Барысава й Баранавіч з плякатамі «Мікіта, мы з табой» і «зуброўскім» сьцягам. Таксама «зубры» спэцыяльна для дырэктара прынесьлі вядро з локшынай. Праўда, дырэктар «падарунку» не атрымаў, бо нікога ў будынак не пусьцілі. Зрэшты, нічога не спатрэбілася.

Дырэктар адправіў Сасіма ўпрочкі, сказаўшы, што пытаньне аб выключэньні здымаецца й хлопец працягне навучаньне.

Акрамя актывістаў, да каледжу былі запрошаны й журналісты, у тым ліку два амэрыканскія карэспандэнты з газэты «The Hill» Пітэр Саводнік і Лэндан Нордмэн, якія працуюць над рэпартажам пра Беларусь. На ўваходзе ў каледж іх сустрэла загадчыца аддзелу інфармацыі гарвыканкаму Тацяна Жытко, якая вельмі настойліва запрашала «гасьцей гораду» ў выканкам, дзе «за сяброўскай гутаркай раскажа ўсю праўду пра горад Баранавічы». Амэрыканцы «адкруціліся».

За ўсім, што адбывалася, сачылі супрацоўнікі КДБ.

**Агата Ступакова, Баранавічы**

# Голая праўда

## Амэрыканцам папросту не пашанцавала

Віталь Тарас

**На пачатку траўня не засталося, бадай, ніводнага інфармацыйнага сайту ў Інтэрнэце, ніводнай масавай газэты ці тэлекампаніі, якія б не апублікавалі фатаздымкаў, зробленых нібы для порначасопісаў. Голыя людзі ляжаць штабэлем адно на адным. Жанчына ва ўніформе трымае на павадку за ашыйнік распранутага чалавека, які скурчыўся на цэмэнтнай падлозе. Тая самая жанчына з цыгарэтай у руцэ з усьмешкай паказвае на геніталіі мужчынаў, пастаўленых у шарэнгу. На галовах у іх — нешта накшталт каптуроў, што насоўвалі некалі інквізытары на ератыкоў. Але пра гэта — крыху ніжэй.**



УЛАДЗІМЕР ВЕЛЯНГУРЫН, «КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА»

**Парнаграфія вайны: чачэнскі варыянт.**

Напярэдадні Дня Перамогі адзін зь беларускіх каналаў паказаў фільм Рамана Палянскага «Піяніст». Наўрад ці шмат людзей дагледзелі яго да заканчэньня, бо паказ фільму завяршыўся а палове на другую ночы. Гэта ж усё-ткі не хакей. На экране дзьве з паловаю гадзіны марудна разгортваецца гісторыя варшаўскага піяніста Шпільмана: як ён выжыў падчас вайны ў пекле гета, падчас масавай дэпартацыі габрэяў у канцлягеры (у тым ліку ўсіх ягоных сваякоў), варшаўскага паўстаньня ды наступнага зьнішчэньня гітлерцамі Варшавы. Жахлівыя атрыбуты Галакосту зь яго нечалавечымі зьверствамі, зьдзекамі й прыніжэньнем чалавечае годнасьці, як гэта ні па-кашчунску гучыць, сталіся апошнім часам дзякуючы кінэматографу ледзьве ня штампам. Асабліва пасьля «Сьпісу Шындлера» галівудзкага майстра Сьпілбэрга. Фільм Палянскага, праўда, ня ёсьць чарговай ілюстрацыяй на тэму Галакосту — ён пра іншае. Але размова тут не пра мастацтва кіно, а пра асаблівасьці масавай культуры ды ўспрыманьня рэчаіснасьці праз экран.

На расейскім тэлебачаньні (а мо беларускім?) мільгануў сюжэт: Ала Пугачова выходзіць з кінатэатру пасьля прагляду стужкі Мэла Гібсана «Пакуты Хрыстовы». Яе ў гэты момант здымаюць усюдысныя фотарэпартэры. Рэдактар нейкага моднага выданьня тлумачыць — гэтыя фатаздымкі абавязкова будуць апублікаваныя, бо зорка шоў-бізнэсу выйшла з кінасэансу, маўляў, зусім іншым чалавекам. Варта паглядзець на яе вочы і г.д… Ці можна ўявіць сабе падобны сюжэт зь фільмам Палянскага, ці фільмам Адамовіча й Клімава «Ідзі й глядзі», ці «Звычайным фашызмам» Рома? Дарэчы, калі б апошнія два з названых фільмаў выйшлі сёньня, у Беларусі, хутчэй за ўсё, іх проста забараніў бы Дзяржрэгістар — за прапаганду жорсткасьці й гвалту, а таксама за паказ кінакадраў з Гітлерам.

«Пакуты» паводле Гібсана хваляць (у тым ліку царква) за… праўдзівасьць у адлюстраваньні ранаў і пакутаў Хрыста. Перамога рэалізму? Ці сацрэалізму? Сацрэалізм, як мы памятаем, — гэта адлюстраваньне рэчаіснасьці такой, якой яна павінна быць. У гэтым сэнсе галівудзкае кіно мала адрозьніваецца ад савецкага. Проста ў Галівудзе казкі для дарослых заўсёды ўдаваліся цікавейшымі, бо рабіліся з улікам псыхалёгіі гледача. Галівудзкія прадусары цяпер, мабыць, за локці сябе кусаюць пасьля праколу з Гібсанам. Выявілася, што Эвангельле — цудоўная казка, калі яе адаптаваць у адпаведнасьці з патрэбамі часу. Чым болей яна страшная й крывавая, тым болей прасьвятленьня ад шчасьлівага фіналу, а значыць — жаданьня плаціць за перажыты ў кіназале або ля тэлевізара катарсыс — ачышчэньне. «Джызус Крайст» сапраўды суперзорка! Як Ала Пугачова, ці нават яшчэ большая.

Гэты фільм як быццам упаў зь неба ў добра ўгноеную ідэалёгіяй глебу. Прычым ідэалёгіяй найвышэйшай пробы, а не якой-небудзь там «дзяржаўнай». Барацьба цывілізацыяў, процістаяньне хрысьціянскае культуры й ісламу, пра якія ўвесь час гаварылі Гантынгтан і Буш-малодшы, знайшлі сваё ўвасабленьне. Спачатку ў Іраку, на полі бою, а потым і на кінаэкране.

Што да фатаграфіяў з голымі іракцкімі вязьнямі, зь якіх зьдзекаваліся «простыя амэрыканскія хлопцы й дзяўчаты»… Фактычна амэрыканскія турэмшчыкі — а гэта, зразумелая рэч, ня простыя джы-ай, а адмысловая падабраная публіка — паводзілі сябе ў дачыненьні да іракцкіх вязьняў так, як звычайна паводзілі сябе хрысьціяне зь нехрысьціянамі. Можна ўспомніць канкістадораў у Лацінскай Амэрыцы або крыжакоў на Блізкім Усходзе. Адпаведным чынам абыходзіліся й абыходзяцца мусульмане зь «нявернымі». Так што заява лідэра іракцкіх шыітаў Аль-Садра, што яны будуць рабіць з амэрыканскімі палоннымі тое самае, што амэрыканцы рабілі з палоннымі ў турме Абу-Грайб, наўрад ці каго зьдзівіла. Хаця, праўду кажучы, і да гэтага радыкальныя ісламскія групоўкі абыходзіліся з закладнікамі (і ня толькі амэрыканскімі) ня надта гуманна. Такім чынам, і тут вяршэнствуе бібілійны прынцып — кроў за кроў, вока за вока.

Што ж да амэрыканцаў, непасрэдна схопленых за руку (дакладней — тых, хто трапіў у аб'ектыў фотаапарата), дык іх дзеяньні прадыктаваныя, думаецца, ня столькі ідэалёгіяй, колькі псыхалёгіяй. Псыхалёгія вайскоўцаў, якім даюць у рукі зброю ды ўладу над іншымі людзьмі і пры гэтым яшчэ як бы здымаюць зь іх маральную адказнасьць (за цябе думае і адказвае начальства), — яна паўсюль больш-менш аднолькавая. Дазволю выказаць сабе крамольную думку: калі б на старонкі прэсы трапілі фатаздымкі ахвяр «дзедаўшчыны», якая існавала заўсёды ў савецкім войску і застаецца, без усялякага сумневу, у сёньняшняй Беларусі, міжнародная грамадзкасьць была б шакаваная ня менш, а мо й больш, чым ад здымкаў з Абу-Грайб. Пра ўмовы ўтрыманьня вязьняў у прыёмніку-разьмеркавальніку на Акрэсьціна можна ня згадваць.

Дзякаваць Богу, у беларускіх «стараслужачых» няма магчымасьці зьдзекавацца з ваеннапалонных з прычыны іх адсутнасьці. У іхніх расейскіх калегаў такая магчымасьць ёсьць. Аб тым, што рабілі і робяць расейскія вайскоўцы ў Чачэніі, у тым ліку зь мірным насельніцтвам, у Маскве лічаць за лепшае маўчаць. І пра Жэнэўскую канвэнцыю пра абыходжаньне з ваеннапалоннымі там не ўспамінаюць. Так бы мовіць, няма вайны — няма канвэнцыі. Хаця выпадак з згвалтаваньнем і забойствам чачэнскай дзяўчыны, учыненых расейскім палкоўнікам, стаў прадметам судовага разьбіральніцтва, грамадзкая думка ў Расеі адназначна не на баку чачэнцаў. Расейцы ня хочуць ведаць пра пакуты чачэнскага народу. Яны хочуць глядзець фільм пра Хрыста, які выкупіў іх, расейцаў, грахі. Аднойчы й назаўсёды. Амэн!

> Калі б на старонкі прэсы трапілі фатаздымкі ахвяр «дзедаўшчыны», грамадзкасьць была б шакаваная ня менш, чым ад здымкаў з Абу-Грайб.

Журналіст радыё «Свабода» Андрэй Бабіцкі расказваў, як яго, сярод іншых «палонных», зьбівалі ў расейскім лягеры Чарнакозава. Зьбівалі штодня па некалькі разоў на дзень — пераважна нагамі. Зьбівалі проста так. Не дзеля таго, каб выбіць нейкія паказаньні, а каб жыцьцё «мёдам не здавалася», каб прынізіць, растаптаць і тым самым узьняцца ва ўласных вачох ці проста пацешыць садысцкія схільнасьці. Пра гэта нідзе ня пішуць, хоць фатаздымкі з Чарнакозава, відэафільмы ды іншыя матэрыялы, якія сьведчаць аб злачынствах расейскіх вайскоўцаў у Чачэніі, ёсьць. Ёсьць цэлыя дакумэнтальныя фільмы. Але паказваюць іх толькі на Захадзе.

Некаторыя менскія падлеткі, якія ўдзельнічалі ў акцыях апазыцыі, ведаюць, што такое атрымаць «дэмакратызатарам» па сьпіне. Зьняць пабоі пасьля акцыі не бяруцца лекары ніводнай з клінік. У іх ёсьць наконт гэтага інструкцыі. Некаторыя дзеці нават ведаюць ужо, што такое «слонік». Гэта калі міліцыянты надзяваюць на цябе адгазьнік і перацінаюць пальцамі шлянг… І гэта робіцца часьцей за ўсё не дзеля таго, каб выбіць прызнаньні, а проста так, як рытуал, — каб больш баяліся.

Амэрыканскім ахоўнікам у іракцкай турме не пашанцавала. Тое, што не прызначалася для чужых вачэй, іхнія, так бы мовіць, таямніцы душы, зрабіліся раптам здабыткам галоснасьці. Амэрыканцам, увогуле заходняй публіцы пашанцавала: у іх ёсьць незалежная прэса. Дзякуючы ёй і міністар абароны, і дарадца па нацыянальнай бясьпецы, і сам прэзыдэнт мусяць адказваць на непрыемныя пытаньні, адказваць перад Сэнатам, перад рознымі камісіямі, перад выбарцамі за дзеяньні якой-небудзь Лін Эванс ці іншых шарагоўцаў ды малодшых афіцэраў. Нават калі яны нікога не забілі, а проста «нанесьлі маральную шкоду».

Ці лягчэй ад гэтага іракцкім ваеннапалонным і іх родным? Безумоўна, не. Ці паскорыць гэта вывад амэрыканскіх войскаў з Іраку? Пакуль невядома. Ёсьць меркаваньне, што вайну ў Віетнаме ЗША прайгралі тады, калі па амэрыканскіх тэлеканалах пайшлі рэпартажы з фронту. Тады тэлерэпартажы яшчэ былі чорна-белыя. На пачатку 90-х Сі-Эн-Эн вяла ў жывым этэры трансьляцыю абстрэлу танкамі Белага дому ў Маскве.

Чалавецтва да ўсяго прызвычайваецца. Кадры генацыду ў Руандзе, бамбаваньняў Косава ці Іраку ўжо мала каго потым зьдзіўлялі і ўсё меней цікавілі шырокага гледача. Нават кадры зь нямецкім людажэрцам, які павячэраў сваім госьцем-добраахвотнікам, амаль ня выклікалі шоку. (Як сказаў адзін знаёмы філёзаф, гэта была ягоная асабістая справа.)

Вайна не адмяняе алімпіяду, і наадварот. І там, і там — відовішча. І адно, і другое можна прадаць. А тэлевізар заўсёды можна пераключыць на іншы канал. Праўда, як правіла, людзям не падабаецца. Ім падабаецца казка з шчасьлівым фіналам. Але праўду, як і сьмерць, не выбіраюць. Аднойчы яна прыходзіць у ваш дом, голая і непрыстойная, як само жыцьцё. А ўжо што адбываецца паміж вамі далей — гэта вашая асабістая справа.

# Прафанацыя «Эўропы»

## Міністэрства культуры не ўхваляе пабудовы гатэлю

Вакол праекту адбудовы гатэлю «Эўропа» захоўваецца інтрыга: Міністэрства культуры не ўхваляе пабудовы гатэлю. Галоўны архітэктар Менску Руслан Белагорцаў кажа, што парамэтры гатэлю мусяць адпавядаць даваенным узорам, але сама «Эўропа» ня будзе стаяць на ранейшым месцы: бульвару на вул.Леніна й суседняга дому ніхто бурыць ня будзе. Значыць, будынак перасунуць у бок кансэрваторыі й паставяць на падмурках колішняга гарадзкога тэатру, канчаткова зьнішчыўшы іх. У гарвыканкаме карэспандэнту «НН» патрапіў дакумэнт, накіраваны з ураду.

Гэта «Заключэньне аб месцы разьмяшчэньня аб’екту ад 28 красавіка 2004 г. №01-05/195» — за подпісам намесьніка міністра Ўладзімера Грыдзюшкі. Паводле гэтага дакумэнту, будаўнічыя работы мяркуецца ажыцьцяўляць на тэрыторыі гісторыка-культурных каштоўнасьцяў — будынку кансэрваторыі (вул.Інтэрнацыянальная, 30) і архітэктурнага ансамблю жылых дамоў і бульвару побач. Мінкульт прыходзіць да наступных высноваў:

«Не выключаем магчымасьці разьмяшчэньня праектаванага аб’екту на скрыжаваньні вуліц Леніна й Інтэрнацыянальнай. Разам з тым, беручы пад увагу месца разьмяшчэньня праектаванага гатэлю і кіруючыся палажэньнямі арт.5, 7, 27, 29, 44, 48 Закону Рэспублікі Беларусі «Аб ахове гісторыка-культурнай спадчыны», якія вызначаюць неабходнасьць захаваньня асяродзьдзя існаваньня /…/, неабходна:

1. Ажыцьцявіць падрыхтоўку гісторыка-архітэктурнага апорнага пляну тэрыторыі кварталу /…/;

2. Правесьці археалягічныя пошукі на ўсім участку, адведзеным пад будаўніцтва, што абумоўлена неабходнасьцю вывучэньня каштоўных у гісторыка-культурных адносінах археалягічных аб’ектаў і культурнага слою, з улікам якіх можа быць падрыхтавана навукова-мэтадычнае абгрунтаваньне праектнага рашэньня;

3. Правесьці гісторыка-архіўныя дасьледаваньні па будынку Менскага тэатру, які раней існаваў па адрасе вул.Інтэрнацыянальная, 28, і будынку былога гатэлю «Эўропа»;

4. Улічваючы мэмарыяльную культурна-гістарычную значнасьць будынку тэатру, у якім у 1852 г. адбылася адна з самых значных падзей у гісторыі беларускай культуры — прайшла прэм’ера першай беларускай нацыянальнай опэры «Ідылія» («Сялянка»), лібрэта для якой напісаў В.Дунін-Марцінкевіч, музыку — С.Манюшка і К.Крыжаноўскі, лічым неабходным разгледзець магчымасьць навукова абгрунтаванага поўнага культурнага яго аднаўленьня або частковага мэтадам пластычнага ўвасабленьня вобразу будынку, які раней існаваў на гэтым месцы/…/

Старшыня Менскага таварыства аховы помнікаў Уладзімер Дзянісаў кажа, што падмуркі менскага гарадзкога тэатру якраз і ёсьць гісторыка-культурнай каштоўнасьцю, узятай пад дзяржаўную ахову яшчэ ў 1979 г. «Калі ў 1984 г. будынак тэатру быў зьнішчаны, гэта выклікала сур’ёзны скандал. Пасьля гэтага скандалу ў 1985 г. Савет Міністраў БССР прыняў спэцыяльную пастанову. Паводле яе, «Збор помнікаў гісторыі й культуры Беларусі» быў прызнаны афіцыйным дакумэнтам. Падмуркі, якія захаваліся ад будынку тэатру, былі ўключаны ў гэты Збор. Пазьней з ініцыятывы Міністэрства культуры гэтая пастанова была скасаваная. Але 18 сьнежня 2002 г. на пасяджэньні Рэспубліканскай навукова-мэтадычнай рады разглядалася пытаньне аб уключэньні тэрыторыі гарадзкога тэатру ў Дзяржаўны сьпіс гісторыка-культурных каштоўнасьцяў. І рада дала даручэньне Дэпартамэнту па ахове гісторыка-культурнай спадчыны, каб ён канчаткова вырашыў пытаньне (пастанова №80). За ўключэньне тэрыторыі тады прагаласавалі ўсе прысутныя на пасяджэньні рады. Паводле дзейнага заканадаўства, тэрыторыя будынку тэатру з таго моманту, як пачало разглядацца пытаньне аб уключэньні яе ў Сьпіс, ужо знаходзіцца пад дзяржаўнай аховай і лічыцца гісторыка-культурнай каштоўнасьцю без катэгорыі», — адзначае гісторык.



**Так выглядаў будынак былога менскага гарадзкога тэатру ў 1944 г. Перад ім зь левага боку — магілы савецкіх жаўнераў, якія пазьней перанесьлі на Вайсковыя могілкі.**

Як жа аднаўляць гатэль, не зьнішчаючы рэштkaў тэатру? Намесьнік старшыні Дэпартамэнту па ахове гісторыка-культурнай спадчыны Ігар Чарняўскі кажа, што гатэль проста ня мусіць быць дакладнай копіяй даваеннай «Эўропы»: «Неабходна браць пад увагу новую горадабудаўнічую сытуацыю, пры якой архітэктура будынку гатэлю павінна гарманіяваць з нэакласыцызмам будынку Беларускай акадэміі музыкі і элемэнтамі рэнэсансу, уласьцівымі комплексу будынкаў па вул.Леніна». Разам з тым, памяць пра тэатар і першую пастаноўку «Сялянкі», лічыць Чарняўскі, захаваць неабходна. Паводле інфармацыі «НН», у адным з варыянтаў пабудовы гатэлю частка яго фасаду будзе паўтараць фасад тэатральнага будынку.

Гісторык Менску Захар Шыбека лічыць, што падобныя падыходы ня маюць нічога супольнага з узнаўленьнем «Эўропы»: «Калі гатэль будуць ставіць ня там, дзе ён быў, і выглядаць ён будзе іначай, дык навошта ўвогуле яго ставіць там? Можна паставіць яго ў іншым месцы Старога гораду (напрыклад, на месцы аўтастаянкі на скрыжаваньні вуліц Інтэрнацыянальнай і Герцэна) і пазначыць на шыльдзе, што так выглядаў гатэль. Дакладна ўзнавіць будынак тэатру — для гораду важней».

**Аркадзь Шанскі**

# Як змагацца са сьвіньнямі

Абласная адміністрацыя «спусьціла плян» на кожны з 22 раёнаў Менскай вобласьці: адукацыйныя ўстановы маюць выгадаваць за год 1400 сьвіней. Дзе шукаць праўды настаўнікам? Юрыст Кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў Уладзімер Адынец кажа, што найперш — у мясцовых упраўленьнях Дзяржаўнай інспэкцыі працы пры Міністэрстве працы й сацыяльнай абароны. Не павінны заставацца ўбаку і прафсаюзы, якраз і створаныя для абароны сваіх чальцоў.

«Школьная сьвінагадоўля», задуманая ўладамі Меншчыны, супярэчыць беларускаму заканадаўству, найперш — Працоўнаму кодэксу, зазначыў Ул. Адынец. 41-ы артыкул Канстытуцыі Беларусі кажа: «Прымусовая праца забараняецца, апрача працы ці службы, вызначанай прыгаворам суду ці ў адпаведнасьці з законам аб надзвычайным і ваенным становішчы». У арт.13 ПК таксама гаворыцца пра забарону прымусовай працы: «Прымусовай працай лічыцца работа, якую патрабуюць ад работніка пад пагрозай прымяненьня якога-небудзь насільнага ўзьдзеяньня, у тым ліку ў якасьці:

1) сродку палітычнага ўзьдзеяньня ці выхаваньня альбо ў якасьці меры пакараньня за наяўнасьць ці выяўленьне палітычных поглядаў ці ідэалягічных перакананьняў, супрацьлеглых усталяванай палітычнай, сацыяльнай ці эканамічнай сыстэме;

2) мэтаду мабілізацыі й выкарыстаньня працоўнай сілы для патрэбаў эканамічнага разьвіцьця;

3) сродку падтрыманьня працоўнай дысцыпліны;

4) сродку пакараньня за ўдзел у страйках».

У.Адынец нагадвае, што ўсе віды работ рэгулююцца працоўнай дамовай, якую падпісвае работнік пры прыёме на працу: «Там у пісьмовай форме адлюстраваныя ўсе функцыі, якія работнік павінен выконваць. Усё астатняе магчыма толькі з згоды самога работніка».

Калі ж да сьвінагадоўлі будуць прыцягнуты самі вучні, дык гэта пагражае парушэньнем яшчэ й Закону аб адукацыі. Арт.48 гэтага Закону недвухсэнсоўна кажа: «Забараняецца прыцягненьне навучэнцаў і выхаванцаў грамадзянскіх устаноў адукацыі без іх згоды і (ці) бяз згоды іх законных прадстаўнікоў да працы, не прадугледжанай навучальнымі плянамі, навучальнымі й выхаваўчымі праграмамі».

У.Адынец адзначыў, што настаўнікі маюць поўнае права пратэставаць.

**АШ**

# «Мы прыйдзем да ўлады ўсур’ёз і надоўга»

**Працяг са старонкі 3.**

**«НН»: Пашыралі на каго? На дэмас, народ, паспалітага чалавека? А хіба яны бываюць у прыродзе?**

**А.М.:** Гэта пытаньне хутчэй для часопісу «ARCHE», але я адкажу. Даводзіцца чытаць, што наша нацыя яшчэ не сфармавалася. Магу пагадзіцца: сфармавалася толькі тая нацыя, якая ўжо памерла. А народ, які жыве, фармуецца ўвесь час. І беларускі народ аб’ектыўна ёсьць як атаесамленьне нейкага «мы». Людзі кажуць «мы» пра беларускі народ, які ўключае людзей расейскай нацыянальнасьці, што нарадзіліся і жывуць тут, і Казімера Баляслававіча, якога ўсе называюць палякам, але таксама ўключаюць у «мы». Я як палітык не працую для абстрактнага народу, не служу нейкаму абстрактнаму народу. Вакол мяне дастаткова цудоўных людзей. За тыдзень я наведваю з паўтузіна розных мясцовасьцяў, і ўсюды — кампэтэнтныя разумныя людзі. Я бачу людзей, для якіх працую як палітык. Мне здаецца, што тыя людзі, якія гавораць пра абстрактны народ, забываюцца, што народ складаецца з канкрэтных людзей. Немагчыма рабіць добра народу, калі ты робіш дрэнна кожнаму канкрэтнаму індывідууму.

**«НН»: Ваша эга, крэда, хобі?**

*А.М. задумваецца.*

**«НН»: Ну, у Вас жа ёсьць нейкі ўнутраны вобраз сябе?**

**А.М.:** Так. Маё існаваньне непарыўна зьвязана з палітыкай. У мяне ня так, як кажуць некаторыя людзі: «Я пайшоў у палітыку, бо ў такі неспрыяльны для Бацькаўшчыны час ня маю права быць убаку». Я пайшоў у палітыку, бо мне падабаецца гэты занятак. Я той шчасьлівы чалавек, чыё хобі стала працай. Цудоўная магчымасьць, калі ты можаш займацца любімай справай і табе яшчэ за гэта плацяць. У палітыцы можна зрабіць шмат творчага, пазытыўнага. Люблю падарожнічаць — езьдзіў у Бразылію, нядаўна ў ПАР, але ня менш люблю езьдзіць па Беларусі — у пасёлак Сьвір, напрыклад, ці ў Пяршаі Валожынскага раёну, ці ў зону. І захад люблю, і ўсход. Гэта ад мае мамы — яна, апрача таго што займала прыстойную пасаду ў Інстытуце генэтыкі й цыталёгіі, была лектаркаю таварыства «Веды». Перш чым паехаць у камандзіроўку зь лекцыямі, мама даставала атляс гістарычна-архітэктурных помнікаў Беларусі і выбірала, куды ёй ехаць — у Нясьвіж, Мір, Гальшаны. А яшчэ я захапляюся нумізматыкаю — гэтае хобі дасталося ад бацькі. Я калецыяную манэты, што хадзілі па тэрыторыі Беларусі за ўсю яе гісторыю, і яшчэ — юбілейныя манэты Рэспублікі Беларусі. Вы і не ўяўляеце, як іх шмат, хаця пра гэта мала хто ведае.

**«НН»: Я бачыла Вас у краме і маршрутцы. Вы гаварылі пабеларуску. А я не заўжды рашаюся: не люблю, калі на мяне глядзяць.**

**А.М.:** А Вы зноў паспрабуйце. Ніхто ўжо ні на кога не глядзіць. У Менску шмат тых, хто ў побыце карыстаецца мовай. Тое кіслотнае асяродзьдзе, якое склалася было ў сярэдзіне 90-х, зьнікла. Цяпер у Менску гэта ўсё спрыяльна. Хто баіцца быць сабой, той стаіць перад небясьпекай зьнікненьня.

**Гутарыла Сьвятлана Курс**

# Унівэрсытэт дзеля ўнівэрсытэту

## То шыюць, то поруць — усё ніткам гора

У Баранавічах пачаліся адукацыйныя рэформы. Адны навучальныя ўстановы зачыняюць, іншыя аб'ядноўваюць. Гэтыя тэмы цяпер абмяркоўваюць амаль у кожнай сям'і, бо тыя зьмены закранаюць большасьць гарадзкіх ВНУ і ССНУ.

Так, галоўны брэнд цяпер — Баранавіцкі ўнівэрсытэт. Паводле чутак, ён будзе створаны шляхам аб'яднаньня чатырох навучальных установаў гораду — Вышэйшага пэдагагічнага каледжу, філіі Беларускага нацыянальнага тэхнічнага ўнівэрсытэту, філіялу Беларускага інстытуту правазнаўства і філіялу Берасьцейскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту.

З такою рэарганізацыяй згодны толькі рэктар пэдкаледжу Пётар Шоцкі. На базе навучальнай установы, якой ён кіруе, і маюць заснаваць унівэрсытэт.

Студэнты філіялу БНТУ не задаволеныя такой хадою спраў і напісалі ліст з пратэстам да Лукашэнкі. Падпісаліся пад ім 274 з 300 студэнтаў. Матывуюць навучэнцы тым, што паступалі яны некалі ў вядомую ва ўсёй краіне ВНУ, а зараз атрымаюць дыплёмы нейкага нікому не вядомага местачковага ўнівэрсытэту.

Не падабаецца аб'яднаньне й выкладчыкам: шмат хто страціць працу, шмат хто — добрыя заробкі й незалежнасьць ад дзяржаўных плянаў. Усе астатнія рэктары таксама паціху абураюцца. Выкладчыкі спрабуюць дазнацца праўды, аднак дагэтуль няма дакладных зьвестак аб тым узьяднаньні. Нават ня можа нічога патлумачыць у Міністэрстве адукацыі Юры Сьцепанчук — загадчык упраўленьня вышэйшай і сярэдняй адукацыі. Паводле яго слоў, пытаньне толькі дасьледуецца і іншай інфармацыі пакуль даць нельга. Але ўжо на пачатку траўня ў горадзе чакаюць Лукашэнку, які прыедзе глядзець будынкі новага ўнівэрсытэту.

Сам унівэрсытэт, маркуюць, будзе знаходзіцца ў кашарах былога Каледжу МУС, які расфармавалі 19 красавіка. Ён рыхтаваў міліцыянтаў зь сярэдняй спэцыяльнай адукацыяй. Як выявілася, грошай на міліцэйскую навуку не хапае, дый патрабуюцца органам супрацоўнікі з вышэйшай адукацыяй. Хопіць і тых, якіх выпускае Акадэмія МУС і Магілёўскі каледж МУС. Таму апошніх курсантаў з Баранавіч перавялі ў Магілёў. Выкладчыкаў адправілі на пэнсію ці ўладкавалі ў выцьвярэзьнік, ДАІ ці крымінальны вышук. А самых маладых наагул адправілі на працу ў Лунінецкі й Ганцавіцкі раёны.

Акрамя таго, сёлета зьбіраюцца зачыніць у горадзе і Баранавіцкую мэдвучэльню. На яе базе, згодна з рашэньнем Міністэрства аховы здароўя, будзе створана навучальная ўстанова, якая зоймецца перападрыхтоўкай кадраў. Летась Міністэрства дазволіла мэдвучэльні толькі камэрцыйны набор студэнтаў. У сувязі са зьменамі ў мэдыцынскай вучэльні будзе скарочана 10 выкладчыкаў.




Усё гэта адбываецца, як лічаць чыноўнікі ад мэдыцыны, праз вялікую колькасьць мэдработнікаў, што рыхтуюць навучальныя ўстановы краіны. Акрамя баранавіцкай, такі самы лёс чакае й Полацкую мэдвучэльню. Зьменшацца наборы ў Берасьцейскую і Слонімскую. А бабруйскую зьбіраюцца наагул зачыніць. На фоне такіх перамен пашчасьціла толькі Пінскай мэдычнай вучэльні, набор у якую крыху павялічыцца. Самой Баранавіцкай мэдвучэльні ў жніўні сёлета афіцыйна спаўняецца 60 гадоў, аднак існавала яна даўней: за немцамі ў горадзе працавала мэдычная школа…

Баранавіцкія мэдыкі лічаць, аднак, што лішку кадраў у горадзе не існуе: амаль усе, хто хоча працаваць, за месяц-другі працу атрымліваюць. І праз якія два гады Баранавічы паўстануць перад праблемай недахопу кадраў.

Ці палепшыцца адукацыя ад такіх пераменаў, пакажа час, пакуль жа ў галовах баранавіцкіх выкладчыкаў, студэнтаў і бацькоў толькі неспакой і думкі аб будучым лёсе.

**Руслан Равяка, Баранавічы**

### Інстытут кіраваньня зачыняецца

**300 студэнтаў прыватнага Інстытуту кіраваньня (БПІК) 12 траўня пратэставалі ля Міністэрства адукацыі. Разам з Сучасным гуманітарным інстытутам, Прыватным тэхнікумам эканомікі й кіраваньня, Ваўкавыскім і Берасьцейскім прыватнымі тэхнікумамі эканомікі й права БПІК пазбавілі ліцэнзіі. Інстытуту закідаюць брак навучальных плошчаў і нізкую якасьць адукацыі. У ім навучалася 1900 чалавек.**

### Дасьледаваньні полацкіх Курапатаў

Полацкія ўлады вырашылі правесьці на месцах асобных масавых пахаваньняў адмысловыя працы з закладкай шурфоў. Ля Баравухі дасьледаваньні будуць весьціся з 7 да 11 чэрвеня, а ля Чарнешчыны — з 14 да 18 чэрвеня. Краязнаўца Міхась Баўтовіч сьцьвярджае, што ля Баравухі, хутчэй за ўсё, адбываліся расстрэлы габрэяў з полацкага гета. А вось ля Чарнешчыны магчымы розныя пахаваньні. Існуе вэрсія, што там былі расстраляныя ў 1941 г. савецкія вязьні, якія рамантавалі вайсковы аэрадром. Пачалася вайна, і вязьняў не пасьпелі эвакуяваць. Відавочна, хавалі ля Чарнешчыны і памерлых вязьняў, змардаваных катаргай. Ёсьць і сьведчаньні, што ў тых самых кар'ерах расстрэльвалі ня толькі саветы, але й немцы.

Полацкая грамадзкасьць патрабавала прывесьці ў парадак месцы расстрэлаў даўно. Адно зь месцаў масавых расстрэлаў у 1937—41-м ужо ўшанавалі вернікі мясцовай грэка-каталіцкай парафіі. У гарадзкім раёне Бельчыца яны ўсталявалі двухмятровы крыж і на кожныя Дзяды праводзяць ля яго малебен у гонар бязьвінна закатаваных.

**Васіль Кроква, Полацак**

### Пратэст супаць высечкі

Пятнаццацьцю суткамі арышту пакараны бялынічанін Сяргей Нікіценка. Такім чынам судзьдзя Аліна Міцькова ацаніла «экалягічны патрыятызм» хлопца, які зьбіў некалькі «грыбкоў», зробленых зь пянькоў дрэваў, зьнішчаных падчас суцэльнай высечкі. На судзе хлопец заявіў, што такім чынам пратэстуе супраць масавай высечкі дрэваў. Дарэчы, а 5-й гадзіне раніцы ў мінулы аўторак у цэнтры Бялынічаў былі сьпілаваны найстарэйшы ў раёне 300-гадовы дуб. На пень, які застаўся на месцы дрэва, людзі кладуць жывыя кветкі.

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

### Глыбокае пастарэла

Калі зазірнуць у любы апошні даведнік, то часам заснаваньня Глыбокага будзе названы 1514 г. Але дзякуючы пошукам мясцовых краязнаўцаў Язэпа Бунта і Ўладзімера Скрабатуна горад пастарэў на цэлае стагодзьдзе. У Варшаўскім архіве была знойдзена грамата Вітаўта, у якой князь пацьвярджае права валоданьня Глыбокім аднаму са сваіх падданых. Хаця гэты факт быў устаноўлены гадоў сем ці восем таму, афіцыйная ўлада не хацела яго прызнаваць. Але пасьля таго як у мінулым годзе суседняя Шаркоўшчына адзначала свой паўтысячны юбілей, пазыцыя глыбоцкіх уладаў зьмянілася. Кіруюць раёнам цяпер у большасьці выхадцы з Глыбоччыны, таму іх абурыла, як гэта нейкая Шаркоўшчына можа быць старэйшай за іх горад. Сьвяткаваньне 490-годзьдзя Глыбокага прымеркавана да 3 ліпеня. У гэты дзень 60 год таму горад быў вызвалены савецкімі войскамі.

### Крамольны плякат

За ўсе дзесяць гадоў кіраваньня краінай Аляксандар Лукашэнка яшчэ ні разу ня быў у Глыбокім. Але сёлетняй восеньню яго тут чакаюць. Да Глыбокага нарэшце дойдзе прыродны газ, а запальваць газавы факел бацька, відаць, нікому, акрамя сябе, не давярае. Шмат хто з глыбачан спадзяецца, што перад прыездам Лукашэнкі мясцовыя ўлады скончаць нарэшце будаўніцтва стадыёну, якое вядзецца ўжо не адзін год.

Дарэчы, адзін раз у Глыбокім прэзыдэнта ўжо чакалі. Меўся ён прыехаць у чэрвені 2002 г., ды зь нейкіх прычынаў гэтага не адбылося. Аднак улады тады зрабілі шмат працы па добраўпарадкаваньні гораду — адрамантавалі вуліцы, збудавалі сучасны чыгуначны пераезд, навялі парадак у парку. Але самае цікавае — гэта тое, што ўлады памянялі плякат на мясцовым «Белым доме», як глыбачане называюць Дом Саветаў. Там доўгі час вісеў плякат з надпісам «Квітней, незалежная Беларусь!». Каля яго нават любілі фатаграфавацца мясцовыя апазыцыянэры. Перад прыездам прэзыдэнта «крамольны» плякат прыбралі і замянілі на «Квітней, Глыбоцкі край!». Вось да чаго мы дажыліся: нават праслаўляць сваю краіну баімся.

**Зьміцер Лупач, Глыбокае**

### Памяць аб зьніклых

Напярэдадні 5-годзьдзя трагічнай даты выкраданьня Юр'я Захаранкі, у Мёрах на дошках аб'яў зьмешчаныя ўлёткі з партрэтамі зьніклых дзеячоў. Гэта ня першая такая акцыя. З зайздроснай для іншых райцэнтраў рэгулярнасьцю тут гэткія ўлёткі зьяўляюцца, пачынаючы зь лютага, штотыдзень і праз дзень-два гэтак жа таямніча зьнікаюць. Да гонару невядомых расклейшчыкаў улёткі ніколі не расклейваліся на слупах, платах ці сьценах будынкаў — выключна на дошках аб'яваў.

**В.Ралейна, Мёры**

### Антусевіч інфармуе выбаршчыкаў

Дэпутат Гарадзенскага гарсавету, сябар Беларускага незалежнага прафсаюзу і партыі БНФ Сяргей Антусевіч карыстаецца новай формай інфармаваньня выбаршчыкаў. У першым нумары ўласнага бюлетэню «Гарадскія навіны» ён тлумачыць, што распаўсюджаньне газэты — выдатная магчымасьць дайсьці да максымальна магчымай колькасьці людзей. Па-другое, далёка ня ўсе выбаршчыкі могуць завітаць на прыём да дэпутата.

Народнаму абраньніку ўдалося адстаяць інтарэсы работнікаў ААТ «Гродня-Азот». Размова ішла пра павелічэньне кошту атрыманых кватэр у 140-кватэрным доме. Людзі павінны былі заплаціць першапачатковы ўнёсак, які даходзіў ажно да 11 тысяч даляраў. Да вырашэньня праблемы былі падключаны старшыня гарсавету, дырэктар прамысловага гіганту, старшыня гарвыканкаму. Цэны ў выніку былі зьменшаны. 129 работнікаў прадпрыемства ўдзячныя свайму дэпутату.

**Антон Лабовіч, Горадня**

### Газ за ўласны кошт

На газіфікацыі прыватнага сэктару ў аршанскім Задняпроўі будавалі свае перадвыбарныя праграмы кандыдаты ў дэпутаты — прадстаўнікі намэнклятуры. Дэпутатамі іх абралі, але праблему газіфікацыі пакуль ня вырашылі і наўрад ці вырашаць. У Задняпроўі налічваецца 1500 прыватных домаўладальнікаў, але правесьці «блакітнае паліва» да сваіх сядзібаў, як аказалася, цяпер згодныя ўсяго 155. І ўся справа ў дарагоўлі праектаваньня ды пабудовы вулічных сетак: кожнаму гаспадару трэба аддаць газавікам да 1,5 тыс. у.а. І колькі б ахвотныя ні грукалі ў высокія кабінэты — усё дарэмна, бо ў адпаведнасьці з Канцэпцыяй разьвіцьця газіфікацыі краіны, ухваленай Радай міністраў 19 лістапада 2002 г., «фінансаваньне работ разьмеркавальных газавых сетак да індывідуальных дамоў павінна ажыцьцяўляцца за кошт індывідуальных забудоўшчыкаў». Вось вам, выбаршчыкі, і абяцанкі-цацанкі.

### Апазыцыю — у парк

Першым публічным актам новай структуры Аршанскага гарвыканкаму — ідэалягічнага аддзелу — стала інфармацыя ў мясцовым друку наконт арганізацыі грамадзянамі масавых акцый. Згодна з рашэньнем гарвыканкаму за №911 ад 12 сьнежня 2003 г. (дарэчы, да гэтага часу аб ягоным існаваньні мінакі ня ведалі) правядзеньне мітынгаў па розных пытаньнях грамадзка-палітычнага жыцьця дазволена на гарадзкім стадыёне. Для пікетаваньня і акцый з колькасьцю ўдзельнікаў да 20 чалавек адведзена пляцоўка ў Прыдняпроўскім парку побач з гарадзкім ЗАГСам. Раней мясцовыя апазыцыянэры ладзілі пікеты перад Гарадзкім цэнтрам культуры. І хоць асобныя зь іх незадаволеныя такім рашэньнем, здаецца, новае месца значна лепшае за старое, бо зь яго ня толькі адкрываецца цудоўны спазор на Дняпро, але й побач шматпавярховыя жылыя дамы, Цэнтральная плошча з унівэрмагам, буйны аўтобусны прыпынак. Так што розгалас ад апазыцыйных акцый павінен быць шырэйшым.

**Яўген Жарнасек, Ворша**

### Чаму бяруць дзяцей

19 прыёмных сем'яў, у якіх выхоўваецца 26 дзяцей, створаны ў раёне. Найбольш ахвотна дзяцей, чые бацькі пазбаўлены правоў гадаваць сваіх дочак і сыноў, бяруць да сябе вясковыя сем'і. Яно і зразумела: гаспадыні такой сям'і гарантаваны штомесячны заробак, які нашмат большы, чым яна можа атрымаць у калгасе, працоўны стаж і матэрыяльная дапамога на прыёмных дзяцей.

**Базыль Ліцьвіновіч, Бялынічы**

### Маці-гераіню стрыгуць бясплатна

З гэтага часу ў Магілёве нараджэньне кожнага трэцяга і наступных дзяцей будзе заахвочваццa матэрыяльна. Такую пастанову прынялі магілёўскі гарвыканкам. Апрача прадугледжаных дзяржавай штомесячных выплат, сям'і будзе аказваццa аднаразовая матэрыяльная дапамога ў памеры 50 базавых велічынь (950 тыс. руб.). Яе пачалі плаціць у канцы красавіка. А жанчын, узнагароджаных Ордэнам Маці, раз на месяц будуць бясплатна абслугоўваць у цырульнях гораду.

**Алеся Чыж, Магілёў**

# Вольныя муляры

## ПТВ імя Ф.Пэтраркі правяло набор па спэцыяльнасьці



ГЛЕБ ЛАБАДЗЕНКА

**Сярод двух дзясяткаў пераможцаў конкурсу былі два гадаванцы Беларускага ліцэю — Глеб Лабадзенка і Кацярына Вялес. Увогуле «пэтраркаўцы» былі маладзейшыя за «арсеньнеўцаў»: журы сёлета зьнізіла верхнюю ўзроставую мяжу. У выніку выпрабаваньнем для журы сталі багата прадстаўленыя сэксуальныя матывы. Удзельнік конкурсу Алесь Квіткевіч нават на заключным гала-канцэрце прачытаў твор пра свой першы сэксуальны досьвед. Каб прэзэнтаваць бардаў, на Спатканьні зладзілі вечарыну «Ў джазе толькі Ляўры, альбо Вечарына сьвятое Вальпургіі». Адбылася яна, як і мае быць, 30 красавіка, перад Вальпургіевай ноччу. На думку сяброўкі журы Г.Кісьліцынай, у будучыні конкурс можа мець адмысловую намінацыю для бардаў. Але моладзь сышлася ня толькі дзеля забавы. На здымку — майстар-кляса з мовазнаўцам Юрасём Бушляковым. Творы паэтаў — удзельнікаў конкурсу імя Пэтраркі — на старонцы 15.**

2 траўня ў межах Спатканьня маладых літаратараў паводле вынікаў літаратурнага конкурсу імя «беларускага паэта дакупалаўскага пэрыяду» Францэска Пэтраркі адбыўся «круглы стол» са шматабяцальнай назвай «Куды пайсьці друкавацца маладому літаратару». Сытуацыю на часопісным рынку асьвятлялі чатыры рэдактары: Эдуард Акулін («Дзеяслоў»), Валерка Булгакаў («ARCHE»), Зьміцер Вішнёў («Тэксты»), Сяржук Сахараў («Студэнцкая думка»).

«Круглы стол» уразіў удзельнікаў разнастайнасьцю поглядаў, меркаваньняў, пазыцыяў. Так, С.Сахараў амаль з парогу адрэзаў, што «CD» вершаў не друкуе і што беларуская паэзія — гэта «соплі па сьцякле», якія сучасным «маладым і злым» нафіг упалі. Мілагучны бард і тонкі лірык Э.Акулін рашуча не пагадзіўся з сп.Сахаравым. «Гэтыя соплі — той цэмэнт, на якім трымаецца беларуская нацыя», — зазначыў сп. Акулін.

Што тут яшчэ можна дадаць? «Будуйма!»

**Марыйка Мартысевіч**

# Справа Караленкі: працяг



**Хведара Караленку судзяць за любоў да «Песьняроў».**

Суд Менскага раёну скіраваў справу праграміста Хведара Караленкі — стваральніка неафіцыйнага сайту «Песьняроў» — на пераафармленьне ў АБЭЗ.

5 траўня ўжо ў трэці раз Хведар наведаў залю суду. Першае судовае паседжаньне, што мелася адбыцца 22 красавіка, было адкладзена з прычыны няяўкі другога боку. Інтарэсы Ігара Лучанка й Сьвятланы Пенкінай абараняе кантора па абароне аўтарскіх правоў РУППІУ (Рэспубліканскае ўнітарнае прадпрыемства праўі інтэлектуальнай уласнасьці). Яго прадстаўнікі не зьявіліся і 27-га. Кажуць, што паехалі ў важную камандзіроўку — у Рызе якраз праходзіць канфэрэнцыя па праблемах аўтарскіх правоў.

Адвакат Караленкі Андрэй Бастунец падаў два хадайніцтвы пра спыненьне справы: па-першае, адсутнічае скарга пацярпелага — самога Лучанка (заяву падавала РУППІУ); па-другое, сэрвэр, дзе разьмешчаны .mp3-запісы «Песьняроў», знаходзіцца ў ЗША, а на pesniary.com маюцца толькі спасылкі на іх. Судзьдзя абодва хадайніцтвы адхіліў.

5 траўня нарэшце зьявіліся прадстаўнікі РУППІУ. Намесьнік дырэктара прадпрыемства Андрэй Шэлест выступаў ў якасьці пацярпелага. Судзьдзя перад пачаткам разьбіральніцтва абвясьціў, што бакі маюць права на прымірэньне і ў гэтым выпадку справа будзе закрыта. Сп.Шэлест не пажадаў ісьці на «міравую» і папрасіў прыцягнуць Караленку да адміністрацыйнай адказнасьці. Настойваў на тым, што былі парушаны аўтарскія правы, бо Караленка без дамоў з праваўладальнікамі выкарыстоўваў творы «Песьняроў». Усе спробы давесьці, што на сайце былі толькі спасылкі на песьні, што Караленка на «распаўсюдзе» не ўзьбіваўся на грошы і г.д., былі марнымі. У якасьці сьведкі з боку «песьняроўскага» сайту мусіў выступіць старшыня рады дырэктараў tut.by Юры Зісер, але суд яго так і ня выслухаў. У працэсе разьбіральніцтва не ўдалося ўстанавіць месца парушэньня раён, дзе гэтае парушэньне зафіксаваў супрацоўнік міліцыі. Але гэтая справа належыць кампэтэнцыі іншага суду, калі меркаваць па месцы жыхарства Караленкі. Судзьдзя прыняў рашэньне накіраваць справу зноў у АБЭЗ з далейшым яе афармленьнем у суд па месцы парушэньня.

**Сяргей Будкін**

### «П’ета» ў Бабруйску

У Бабруйску можа зьявіцца мэмарыял у памяць ахвяраў бальшавізму «П’ета», створаны Валяр’янам Янушкевічам. З прапановай дапамагчы ва ўстаноўцы помніка да міністра культуры Леаніда Гулякі зьвярнуўся старшыня дабрачыннага фонду «Памяць ахвяраў сталінізму Беларусі» Валянцін Пaборцаў. Ставіць скульптуру (Божую Маці, якая аплаквае Хрыста, зьнятага з крыжа) зьбіраецца сам фонд на ахвяраваньні. Прадстаўнікі КДБ прапанавалі Пaборцаву ставіць «П’ету» ў Курапатах, але ён адмовіўся: там, маўляў, стварaецца свой комплекс, у які «П’ета» ня ўпісваецца.

### Фэст царкоўнай музыкі

У Гайнаўцы (Беласточчына) ідзе штогадовы Міжнародны фэст «Гайнаўскія дні царкоўнай музыкі». Пачаўся фэст канцэртам Дзяржаўнага акадэмічнага хору імя Г.Цітовіча. За сем дзён канцэрты дадуць 35 калектываў з Польшчы, Беларусі, Расеі, Баўгарыі, Фінляндыі й інш. Спаміж іншых выступіць хор «Kyeremateng» з Ганы (Афрыка).

### Эксклюзіў у кнігарнях

У кнігарнях зьявіўся трэш-бэстсэлер — «История Беларуси. Досоветский период» Я.Грашчанка. Каштуе ўсяго 1740 руб. Для параўнаньня: цана звычайнай кніжкі па гісторыі Беларусі пачынаецца ад трох тысяч.

### Колькі каштуе нарадзіцца тут?

Новая акцыя менскіх дыскарняў: кошт замежных кампактаў зьнізіўся зь 5 да 3 тысяч рублёў. Як кажуць супрацоўнікі крамаў, рыхтуецца месца для пласьцінак коштам ад 10 тысяч. Абяцаюць ліцэнзійныя праграмы з буклетамі. Гэтыя зьмены плянаваліся яшчэ год таму, але ж у прадпрыемства «West-records», уладальніка найбуйнейшых менскіх дыскарняў, тады пачаліся праблемы з падаткамі. Беларускія ж выканаўцы ўжо даўно прадаюць цэлы шэраг альбомаў па цане ад 8 да 15 тысяч. Самымі дарагімі аказаліся «чырвонае» выданьне «Я нарадзіўся тут» і «Менск—Бэрлін» ад «Крыві» (15 тыс.). Затым ідуць дарагое выданьне «Дому культуры» і «Справаздача. Gold» «N.R.M.», усе альбомы Вайцюшкевіча, «Спадчына нежывых вёсак» Кірчука (9500).

### Саюз пісьменьнікаў — у эміграцыю

На папярэджаньне, вынесенае Мінюстам Саюзу пісьменьнікаў, адгукнулася Міжнародная супольнасьць пісьменьніцкіх саюзаў (былы Саюз пісьменьнікаў СССР). У тэлеграме за подпісам старшыні арганізацыі Сяргея Міхалкова гаворыцца, што Саюз пісьменьнікаў «павінен быць захаваны любым чынам». Паводле словаў старшыні СБП Алеся Пашкевіча, С.Міхалкоў прапанаваў дапамогу на выпадак юрыдычнай ліквідацыі Саюзу пісьменьнікаў: беларуская арганізацыя можа быць зарэгістраваная ў Маскве.

### Музэй павялічыўся

Новы корпус Музэю гісторыі й культуры (вул.Фрунзэ, 19) адкрыецца 18 траўня. У будынку першай паловы XIX ст., дзе раней быў штаб тылу Ўзброеных Сілаў, адкрыецца выстава «Праз далячынь стагодзьдзяў»: іканапіс, народны жывапіс, ткацтва, саломапляценьне, разьба. У новы корпус пераедуць музэйныя фонды (338 тыс. адзінак).

### Помнік Мазэпу

У Галацы (Румынія) адкрылі помнік гетману Івану Мазэпу. Помнік стаіць у парку Волі за 5 км ад румынска-ўкраінска-малдаўскай мяжы.

**АВ; БелаПАН**

### Новая «Крама»

Песьню «Mein Faterland, auf wiedersehen», што прагучала на фэсьце «Генэралы айчыннага року» і ўвайшла ў аднайменны зборнік, можна лічыць разьвітальнай з той групай, якую ўсе добра ведаюць, і зь яе рамантычнай эпохай. «Цяпер будзе новая «Крама» — магчыма, больш жорсткая па гуку, бяз клявішных», — паведаміў Ігар Варашкевіч. Падчас першага жывога выкананьня сапраўды можна было палічыць «Mein Faterland» за лебядзіную песьню «Крамы». Але Варашкевіч кажа, што ня так усё сумна. Проста «Крама» будзе крыху іншая. Якая — дазнаемся ўжо ў гэтым годзе. Альбом пад рабочай назвай «Бывай, мая Радзіма» выйдзе, магчыма, ужо ўвосень, таксама выйдзе дыск з найлепшымі песьнямі, перавыданьне «Гарэлкі на лёдзе» (ангельская вэрсія «Хворага на рок-н-рол») і жывы канцэрт «Наваполацак-1996». «Крамаўскі» канцэрт у ТЮГу, што плянаваўся на 7-га, перанесены на 28 траўня. «Крама» выступіць з акустычнай праграмай. «За 13 год існаваньня групы акустычны канцэрт будзе ўпершыню», — зазначае Варашкевіч. Так што старыя гіты загучаць па-новаму.

**СБ**

### «Беларускія песьняры» ў Крамлі

Ансамбль «Беларускія песьняры» 15 і 16 траўня выступае з канцэртамі ў Крамлёўскім палацы зьездаў Масквы. Да канцэртаў, якім прадусары вырашылі надаць характар юбілейных, ансамбль падрыхтаваў новы альбом. Ён атрымаў назву «35,5». 35 гадоў самім «Песьнярам» ды яшчэ 5 — гэтаму ансамблю. Рэпэртуар альбому складуць 16 песень, усе яны выконваюцца па-беларуску. Збольшага гэта творы, якія раней не выдаваліся і ня так часта гучалі на канцэртах. Асноўныя аўтары песень — бас-гітарыст Аляксандар Кацікаў ды выканаўца на клявішных Алег Аверын. Ёсьць сюрприз — твор аўтарства гітарыста Віктара «Малыша» Малчанава, вядомага цяпер з удзелу ў групе «Цмок і Малыш». Гэтая песьня, якую выконвае Алег Аверын, — адзіная, якая была напісана Малчанавым падчас ягонай працы ў «Песьнярах». Каб не ўздымаць нездаровых настрояў пэўных людзей, у альбом вырашана не ўключаць ніводнай песьні аўтарства Ўладзімера Мулявіна. Як паведаміў Алег Аверын, бліжэй да канца лета ён мяркуе скончыць запіс сольнага праекту — праграмы, вытрыманай у стылістыцы клясычнага року.

**Зьміцер Падбярэскі**

# Нататкі аб пазыцыі

## Легенды і паданьні сучаснай палітыкі

Алесь Кебік




### «У апазыцыі няма новых ідэяў»

І колькі ні моршчы лоб, яны, новыя, не прыходзяць. Ці то таленту бракуе і празарлівасьці? Ці то досьведу не стае і харызмы? Але хіба тыя ідэі, што праклямуюцца, павінны быць нейкімі новымі? Хіба ня тыя ж ідэі свабодаў і дэмакратычнага ўладкаваньня прывялі да перамогі дэмакратаў у суседніх краінах?

Аднак жа ў нас гэтыя ідэі чамусьці «не гучаць». І тады прыходзіць думка, што іх гучаньне можна падмяніць, да прыкладу, камунальнымі бунтамі. Узяць, так бы мовіць, народ не абстракцыямі, а — за жывое. Толькі ж ад аднае думкі пра экстэнсіўнасьць гэткага шляху апускаюцца рукі.

Дык чаму ж яны не гучаць? Самая лепшая (задушэўная і якраз старая, знаёмая, «вечная») песьня можа ў адным выкананьні літаральна заваражыць публіку, а ў іншым — паплысьці міма нот і пакінуць адчуваньне прыкрасьці ды сораму за артыста. Праблема, значыць, у выканаўцу, у ягоным іміджы і вобразе, якія ў гучаньні палітычнай ідэі іншы раз маюць шмат большую вагу, чым нават зьмест сказанага. Мы, публіка, верым або ня верым найперш вам, а ня вашым ідэям. І калі мы вам сымпатызуем, мы падтрымаем вас, а ня вашыя праграмы (якія ў вас ва ўсіх — «аднолькавыя»). Разумею, што сытуацыя перакасабочаная, але сёньня яна такая ёсьць. І няма ніякіх ідэяў, якімі б апазыцыя магла «вярнуць сабе давер народу». Гэта якраз вобразам сваім апазыцыя мусіць вярнуць давер народу да сваіх ідэяў. А для гэтага яна мусіць мець прынцыпы і гэты самы цэльны, не расколаты вобраз.

### «Апазыцыя ня мае сымпатыяў народу»

Не выклікае сымпатыяў той, хто ня мае прынцыпаў. Вось жа, сёньня гаворка ідзе пра самы непрыемны для апазыцыі, самы нежаданы ў абмеркаваньнях прынцып, які парушаецца на кожным кроку. Дапускаю нават, што нехта зараз адкладзе газэту, каб не псаваць сабе настрою. Тым ня менш. Гаворка ідзе пра мову.

Калі вы апазыцыя, дык вы мусіце несьці ў сабе вобраз заўтрашняе Беларусі — не такой, як сёньня. Лепшай. Зразумелай. Трэба зусім ня ведаць гісторыі, каб уяўляць, што незалежная і дэмакратычная Беларусь пад бокам у Расеі можа адбыцца як білінгвістычная ці як расейскамоўная краіна.

Ня буду паўтараць довады на карысьць беларускамоўнасьці дэмакратыі — усе іх цудоўна ведаюць, як цудоўна ведаюць і тое, што быць беларускамоўным сёньня — значыць, найчасьцей, — ісьці на прынцып. Магчыма, гэта самы цяжкі прынцып, які ў нас усяляк стараюцца нівэляваць.

Ня буду паўтараць і довады адваротнага боку. Яны не вытрымліваюць крытыкі. Скажу толькі, што беларуская нацыя, як сучасны палітычны суб'ект, паўстала (ці толькі паўстае) менавіта на мове, а не, скажам, на рэлігіі ці грашах, ці таму, што гэта ўсяго толькі інэрцыя таго, што існавала ў мінулым, ці там у выніку геапалітычных разборак. І няма беларуса, які б не разумеў па-беларуску. А сукупны адказ нацыі на беларусізацыю школы напачатку 90-х гучаў калі не захоплена, дык так: мы ўжо, вядома, па-беларуску не загаворым, а вось дзеці нашы — павінны.

Не, публіка ня будзе асуджаць дэмпрэсу за мэнтальна чужую ёй, публіцы, мову Цютчава і Фета. І апазыцыйных лідэраў — за іхную нічым не матываваную агітацыю за «независимость и против диктатуры». І адважных маладзёнаў — за расьцяжку над Нямігай: «Он должен уйти». Публіка можа і ўхваліць. Толькі адчуе пры гэтым неўсьвядомлены, але глыбокі ўнутраны дыскамфорт: і ад дэмакратычнага Фета, і ад «независимости», і ад гэтага «уйти». Бо публіка ў абсалютнай масе сваёй так не гаворыць і ня чуе. Назавеце яе мову суржыкам, піджынам, трасянкай, але гэта зусім не расейская мова, а тое, што дае публіцы ўнутранае права ў кожным перапісе называць роднай моваю беларускую. Мэнтальнасьці ад рэальнасьці аддзяляе адзін крок. Усяго адзін прынцыповы крок, які мусіла б зрабіць дэмакратыя, калі яна рэальна прэтэндуе на вобраз людзей з будучыні. З той самай будучыні, якая расьпісаная ў іхных праграмах у выглядзе дэмакратычнай, незалежнай, эўрапейскай Беларусі.

Аднак тым, хто парушае ўласныя прынцыпы, даверу няма. Адчуўшы свой душэўны дыскамфорт, публіка іншы раз возьме дый скажа: ня нада нам такой апазыцыі...

Між іншым, усе прарывы беларускай суб'ектнасьці за мінулыя 100 гадоў удаваліся толькі ў гэтым базавым прынцыпе, на якім і заснаваная была нацыя, а пасьля й дзяржава. Праўда, і каштавала гэта заўсёды максымальна. Скажам, паэту Ўладзімеру Дубоўку адна толькі фраза «Нам няма чаго губляць, апрача расейскай мовы» абышлася ў пяць судзілішчаў, ГУЛАГ і страту Бацькаўшчыны. Затое словы ягоныя — хоць сёньня пішы на расьцяжках.

### «У апазыцыі няма моцнага лідэра»

Моўна пасьлядоўны і харызматычны Зянон Пазьняк на саму моўную пасьлядоўнасьць наклаў стэрэатып сваёй харызмы. Гэта многіх бянтэжыць, а многім служыць галоўным апраўданьнем іхнае моўнае непасьлядоўнасьці. Інакш кажучы, дзякуючы яму гэты прынцып успрымаецца як крайнасьць. А самі яны — многія — пачуваюць сябе людзьмі ўраўнаважанымі. Можа быць, Пазьняк і вінаваты ў тым, што беларускамоўнасьць асацыюецца з радыкалізмам, а білінгвізм — з памяркоўнасьцю. Але ў Пазьняка паранейшаму ёсьць прыхільнікі — і ў першую чаргу дзеля таго, што ён стварыў сабе вобраз чалавека прынцыповага.

У часы Сталіна або Гітлера першай асобе ў краіне таксама не было альтэрнатывы, а ўсялякая апазыцыя асуджалася большасьцю народу. Падабенства сытуацыі ў тым, што і тады і цяпер уся ўлада сканцэнтраваная ў руках аднаго чалавека, дзяржаўныя рашэньні прымаюцца аднаасобна і таемна, а апазыцыйным палітыкам закрыты доступ на БТ. Нехта трапна заўважыў, што невядомага нікому дырэктара саўгасу ніхто б ня ведаў і ён ніколі б ня стаў першай асобай, калі б не трансьляцыі на БТ...

### «Апазыцыя займаецца немаведама чым»

Змаганьне з аўтарытарызмам — безумоўна, важная і першаступенная справа. Але зусім не адзіная важная.

У інтэрвію аднаго ангельскага дасьледніка ў часопісе «Arche» прагучалі словы пра тое, што сёньня «вэрсія нацыянальнай ідэнтычнасьці а-ля БНФ або яе славянасабраўскі варыянт ня могуць перамагчы ў беларускім грамадзтве». Няхай сабе ня могуць, але ці такія вэрсіі сапраўды ёсьць у прыродзе?

Лукашэнка, магчыма, і хацеў бы нешта такое вымысьліць у выглядзе сваёй ідэалёгіі, але ня мае на тое інтэлектуальнага патэнцыялу. Апазыцыя такі патэнцыял мае, але недаацэньвае свае магчымасьці. Сапраўды, гэта яна мусіць займацца стварэньнем сучаснай беларускай нацыі як палітычнага суб'екта. Мець канцэпцыю такога стварэньня. А ў працы над канцэпцыяй зьняць з парадку дня такія фантомы, як білінгвістычная або расейскамоўная Беларусь, вызначыць базавыя прынцыпы гісторыі і геапалітыкі, знайсьці параўнальныя мадэлі і г.д. Сёньня ж пры тым, што, здаецца, усе апазыцыйныя праграмы пісаныя-перапісаныя, шмат якія істотныя (для народу) пытаньні застаюцца там неадказанымі. У выніку за словамі пра тое, што трэба рабіць, не паўстае будучыні. А што будзе заўтра? Якімі будзем мы «пры вас» краінай, народам?

Улічваючы, што працэс фармаваньня нацыі — рэальнасьць, нельга спадзявацца, што ён завершыцца стыхійна. Маўляў, куды сабе хоча, туды і йдзе, захацеў — спыніўся, захацеў — павярнуўся направа-налева. Стыхійна гэты працэс ператвараецца ў бясконцае таптаньне на месцы. Ён заўсёды патрабуе рукатворнага завяршэньня. І калі ў вас няма ўлады, скажыце хаця б, якім вы гэтае завяршэньне бачыце. Намалюйце ваш праект. І ня бойцеся напалохаць нас сьмелымі рашэньнямі.

У сёньняшнім нашым сьвеце, у эўрапейскім атачэньні нацыянальны стандарт уваходзіць у адзіны «пакет» стандартаў жыцьця. Але ён — самы першы. І каб пачынаць гаварыць пра макраэканамічныя паказчыкі, неабходныя, скажам, для далучэньня да ЭЗ, трэба спачатку зьняць першае пытаньне. А яно ў нас якраз самае недапрацаванае. Хтосьці разважае пра ірляндзкую мадэль, хтосьці — пра швайцарскую, хтосьці мысьліць катэгорыямі пачатку мінулага стагодзьдзя, кагосьці заносіць у футуралёгію. А ў выніку лідэры аб'яднанае апазыцыі нібы праз таемную дамоўленасьць міжсобку вырашаюць гэтага пытаньня не чапаць, бо яно можа нашкодзіць іхнаму адзінству. Вось жа, рэч у тым, што гэтае пытаньне — першае: якой вы бачыце краіну і нацыю, прыйшоўшы да ўлады.

Разважаць, нібыта гэта ўсё мусіць нейкім чынам вырашыцца само, — тое самае, што ладаваць сьцены будынку, падмурак якога павінен нейкім чынам сфармавацца «сам» — у сілу, так сказаць, прыродна-гістарычных асаблівасьцяў.

Лукашэнка не дае і ня можа даць народу адказу на пытаньне, хто такія беларусы і што такое Беларусь. Гэта як Польшча? Ці гэта як Тамбоўская губэрня?.. Калі б такі адказ у яго знайшоўся, дык у параўнаньні мусіла б прысутнічаць аднаасобная ўлада кіраўніка. Калі ж бы ён сказаў, што гэта як Туркмэністан — яму б не паверылі. Таму ў яго адказу і няма. Гэты адказ мусіць мець апазыцыя. Беларусь і яе народ павінны намацвацца намі ня горш, чым Польшча ці тая ж Тамбоўшчына. Нават ніколі не бываўшы там, мы маем акрэсьленыя вобразы таго, што гэта такое. Нашмат больш акрэсьленыя, чым вобраз уласнае краіны і сябе саміх.

Напэўна, апазыцыя пабойваецца акрэсьліць сваё бачаньне краіны ня толькі таму, каб не рассварыцца міжсобку, але й таму, што такі вобраз можа «не спадабацца» народу. Аднак тут вернемся да раней сказанага: гэты вобраз і ёсьць прынцып, прынцыпы падабаюцца, а непрынцыповыя не выклікаюць сымпатыяў.

### «У апазыцыі няма адзінства»

Ёсьць адзінства тэхнічнае. «Саюз вужа і яжа», як кажа Лукашэнка. Маецца на ўвазе, што адсутнічае ідэйнае адзінства ў лягеры правых і ў лягеры левых, затое асобныя правыя партыі адзіночацца з асобнымі левымі.

Аднак гэта сьведчыць толькі пра несфармаванасьць палітычнага спэктру. Ён недафармаваны ў недафармаванай нацыі. Можа быць, самі назвы партыяў яшчэ ня значаць таго, што яны значаць. Бо яшчэ не напоўненыя тым зьместам. Праўдзівае адзінства апазыцыі публіка разгледзіць ня ў назвах, а якраз у тым супольным, кансалідаваным прынцыпе — у тым вобразе краіны, які тая набудзе з прыходам апазыцыі да ўлады. Выглядае, што якім бы гэты агульны вобраз ні быў, але наяўнасьць яго агульнага дасьць апазыцыі нашмат большую падтрымку, чым кансалідаванае замоўчваньне складаных пытаньняў нацыянальнага развіцьця.

Зьвёўшы ўсё сказанае да аднаго параўнаньня, прапаную родную мову ў якасьці няпростай, але адзінай рэальнай альтэрнатывы цяперашняму палітычнаму рэжыму.

# Прыватны фэст на Дзень Перамогі

Ужо 20 год запар у вёсцы Забродзьдзе на Вялейшчыне 9 траўня зьбіраецца грамада дзеля ўшанаваньня Дня Перамогі. Ладзіць мерапрыемства мастак Барыс Цытовіч — тамтэйшы жыхар, які ператварыў глухі куток у сапраўдны музэй пад адкрытым небам.

Пасьля заканчэньня Тэатральна-мастацкага інстытуту ён разам з жонкай Валянцінай у 1974 г. пераехаў сюды на сталае жыхарства. У саракагадовы юбілей перамогі ў Забродзьдзі быў закладзены мэмарыяльны парк і нарадзілася традыцыя сьвяткаваньня гэтай падзеі шырокім колам сяброў, землякоў і гасьцей з розных куткоў. Дрэвы былі пасаджаны пісьменьнікамі і мастакамі, вайскоўцамі і вучнямі, і цяпер на высокім беразе ракі Нарачанкі вырас ладны парк.

З часам сядзіба мастака і суседнія хаты ператварыліся ў сапраўдную экспазыцыю, якая падае лад жыцьця пачатку мінулага стагодзьдзя і ўтрымлівае як этнаграфічныя рысы звычайнай вёскі, так і цікавыя рэчы вайсковага побыту часоў першай сусьветнай. Апошнія экспанаты невыпадковыя, бо гэтыя мясьціны багатыя на падзеі і той вайны. Намаганьнямі мастака ў лесе недалёка ад вёскі ля шашы на месцы вайсковага шпіталю і могілак пастаўлена маленькая каплічка ў памяць палеглых царскіх жаўнераў. Менавіта малебен на гэтым месцы пад суправаджэньне звона, выробленага з артылерыйскай гільзы, распачынае сустрэчы 9 траўня. Так было і цяпер, калі ўжо ў дваццаты раз зьехаліся людзі рознага веку (усяго недзе дзьве сотні), каб сустрэцца з нагоды Перамогі.

Нягледзячы на сучасную афіцыйную падрымку ўсяго зьвязанага з вайной, трэба з прыемнасьцю адзначыць, што аніякага ціску і нават прысутнасьці вэртыкалі на гэтым мерапрыемстве не было, а мясцовыя апаратчыкі прадстаўлялі толькі сябе і ня ціснуліся да мікрафонаў з прамовамі. Дарэчы, і прамоў фактычна не было; пэўна, праз тое і атмасфэра была досыць прыемнай і сьвяточнай: іграла музыка — з дынамікаў і жывая, чыталіся вершы, гучалі тосты і за зьбітымі тут жа, на беразе, драўлянымі сталамі падымаліся келіхі. Гэтым разам ізноў было багата гасьцей — вэтэраны, моладзь, вялейскі дзіцячы турклюб, аматары старых аўтамабіляў зь Менску на сваіх рарытэтных аўто, жыхары навакольных паселішчаў. Былі заўважаны такія цікавыя і не заангажаваныя ў такіх сустрэчах асобы, як кіраўнік «Ліцьвінаў» сп.Бярбераў і сп.Верамейчык — са славутага Залесься. Адначасова тут праходзіў пленэр, на які прыехалі дзесяць мастакоў зь Нямеччыны, іх працы (у розных жанрах) былі паказаны цікаўным гледачам.

Сёлета да сьвяткаваньня была прымеркавана яшчэ адна цікавая падзея: на грошы, што сп.Цытовіч атрымаў як ляўрэат спэцыяльнай прэміі ППРБ у галіне выяўленчага мастацтва, ён заклаў ля парку драўляную капліцу ў гонар сьв.пакутнікаў Барыса і Глеба, якая, калі дасьць Бог, адчыніць свае дзьверы роўна праз год, калі ў Забродзьдзе зноў прыедуць людзі. Пакуль жа, лепшы за ўсе помнікі, тут застаецца стаяць у памяць аб сваім гаспадару — салдату той вайны — моцны малады дуб Васіля Быкава.

**Усевалад Сьцебурака,**
Забродзьдзе—Менск

АПЫТАНЬНЕ «НН»

# Аэрапорт імя Мясьніковіча

**Варшаўскі аэрапорт носіць імя Шапэна, пад Парыжам ёсьць аэрапорт дэ Голя. А вось аэрапорт у Гданьску атрымаў імя 60-гадовага Леха Валэнсы. Мэр гораду зьвяртаўся па дазвол да былога прэзыдэнта Польшчы і аднаго з самых вядомых палякаў у сьвеце. Пачэсна ж насіць імя паважанага чалавека. Прысвоіць імя жывога можна толькі тады, калі гэты чалавек зрабіў для краіны нешта неаспрэчна важнае. «У гонар каго з жывых беларусаў можна было б назваць аэрапорт «Менск-2»?» — з такім пытаньнем карэспандэнт «НН» зьвярнуўся да студэнтаў менскіх ВНУ.**

Студэнцтва намагалася аджартавацца. Філфакаўцы называлі прозьвішчы сваіх навуковых кіраўнікоў, выкладчыкаў ды сяброў. Студэнтка 3-га курсу ЭГУ Дар'я прапанавала «адлётную» кропку назваць «у чэсьць Сашы і Сірожы»: маўляў, «аэрапорт імя Сашы і Сірожы» ідэнтыфікуе краіну, у якую вы прыехалі.

Студэнт 4-га курсу факультэту філязофіі і сацыяльных навук БДУ Аляксей прапанаваў ушанаваць фізыка Жарэса Алфёрава: «Хоць і жыве ў Расеі, але ж нарадзіўся тут». Скептычна ацаніў сытуацыю з гонарам нацыі гістфакавец Алег: «Найлепшыя людзі летась памерлі, іх і трэба ўшаноўваць». Дзеячы культуры застаюцца галоўным гонарам нацыі. Прозьвішчы Быкава і Мулявіна назвала ці не палова апытаных. Калі браць палітыкаў, то гісторыкі згадвалі дзеячоў БНР (пры гэтым рабілі агаворку, што гэтыя імёны прыгадаюць хіба ў «фантастычнай Беларусі»), філёзафы прапаноўвалі назваць менскі аэрапорт у гонар новага прэзыдэнта: як толькі зьявіцца — адразу і назваць.

Што да цяперашняга кіраўніка дзяржавы, дык «імя Лукашэнкі ўспрымалася б негатыўна», — так мяркуе Вольга з «наргасу». «Зрэшты, у нас іншых прэзыдэнтаў няма, гэта амэрыканцы могуць выбіраць, а называць такі важны пункт трэба толькі ў гонар кіраўніка дзяржавы. Гэта твар усёй краіны. Мабыць, таму не называюць, бо ня хочуць паказваць сапраўдны твар», — разважае Аляксей з мэханіка-матэматычнага факультэту. Будучы сацыяльны пэдагог Мікалай і хацеў бы назваць «Менск-2» у гонар нейкай дзяржаўнай фігуры, але ня бачыць неадыёзных постацяў: «Тут бы падышла кандыдатура Мясьніковіча — каб давесьці нелягічнасьць яго прызначэньня ў кіраўнікі Акадэміі навук».

Некаторыя студэнты знаходзіліся пад уражаньнем ад спартовых перамог: «Аэрапорт імя Макса Мірнага», — з усёй моцы закрычалі ў дыктафон тры навучэнкі «ін'язу». Гэтаксама прапаноўваліся кандыдатуры Глеба, гімнастаў, біятляністаў. А вось спрактыкаваная ў паездках перакладчыца Ксенія хацела б ушанаваць пры жыцьці Валянціна Акудовіча: «Усё роўна ў астатні сьвет мы трапляем праз Маскву ды Варшаву, Беларусі на міжнароднай мапе нібыта няма, як і Акудовіча, таму гэта было б сымбалічна».

Беларус яшчэ не атрымліваў Нобэлеўскай прэміі (той жа Валэнса яе атрымаў) і не напісаў сусьветнага бэстсэлеру. «У нас няма сучасных герояў, пакуль наш шлях можна акрэсьліць так: ад Скарыны да Скарынкіна», — зазначае навуковец Арсень Ліс. Таму няхай завецца пакуль наш аэрапорт «другім Менскам». Месца вакантнае. І хочацца верыць другакурсніку гістфаку БДУ: «Яго назавуць калі-небудзь у гонар мяне!»

**Сяргей Будкін**

## Ня маючы шанцаў стаць беспрацоўным

Пачварная кантрактная сыстэма, якая мае сэнс толькі ў дачыненьні да кіраўнікоў арганізацый і прадпрыемстваў, паступова робіцца агульнадзяржаўнай сыстэмай найму для ўсіх работнікаў. Дзяржава ў асобе прэзыдэнта вырашыла зрабіць усіх беларускіх грамадзян часова працуючымі. Кантракт толькі на год. А пасьля году пераходзь у стан «часова не працуючых», ня маючы ніякіх шанцаў стаць беспрацоўным. Бо пры спыненьні кантракту чалавек ня будзе набываць нават статусу беспрацоўнага. Гонар стаць беспрацоўнымі цяпер будуць мець тыя, хто падпадае пад скарачэньне штатаў або закрыцьцё прадпрыемстваў.

Вось і будзе ўлада рапартаваць, што ў Беларусі самае нізкае беспрацоўе — 2%. Зьдзекам са здаровага сэнсу будуць гучаць словы штатных прапагандыстаў з тэлебачаньня, што ў суседніх странах беспрацоўе складае 8—15%, а Беларусь квітнее. І хто будзе аналізаваць, колькі новых гастарбайтэраў пачне працаваць у Расеі, Польшчы?

Аляксандар Лукашэнка прыйшоў да ўлады пад сьцягам абароны ўсіх пакрыўджаных, а праз дзесяцігодзьдзе стварае сыстэму занятасьці, у якой працоўныя ня маюць ніякіх магчымасьцей і правоў, калі ня будуць лізаць адно месца кіраўніцтву. Гэта прызнае ён сам, калі заяўляе з экранаў, што даў кантрактную сыстэму і дырэктыву, каб кіраўнікі маглі рабіць з працоўнымі ўсё, што патрэбна. Праўда, яго крышку засмучае тое, што матэрыяльнае стымуляваньне да кантрактаў па максымуме атрымліваюць розныя кумы і сябры кіраўнікоў, але гэта невялікія страты ў параўнаньні з поўнай залежнасьцю працоўных ад наймальнікаў. У выніку атрымліваецца ідэальная аўтарытарная дзяржава: усе правы належаць наймальнікам, а грамадзяне ператвараюцца ў бясправны натоўп, калі маюць «шчасьце» працаваць.

Супраціў гэтаму становішчу можа ісьці ў двух кірунках. Па-першае, гэта барацьба за адмену кантрактнай сыстэмы, як у агульнадзяржаўным маштабе, так і праз індывідуальнае адмаўленьне ад кантрактаў. Масавыя звароты ў Канстытуцыйны суд, міжнародныя арганізацыі наконт адсутнасьці ў Беларусі права на сталую працу павінны даць свой плён. Па-другое, павінна быць прадэманстраваная салідарнасьць з ахвярамі цяперашняга рэжыму — актывістамі Свабоднага прафсаюзу з Полацкай ЦЭЦ, накіраваная як на аднаўленьне іх на працы, так і на матэрыяльную падтрымку сем'яў актывістаў.

**Леанід Гаравы,** дэпутат
Гарадоцкага райсавету

«НН» з радасьцю друкуе ў газэце і на сайце www.nn.by чытацкія лісты, водгукі і меркаваньні. З прычыны вялікага аб'ёму пошты, мы ня можам пацьвярджаць атрыманьне Вашых лістоў, ня можам і вяртаць неапублікаваныя матэрыялы. Рэдакцыя пакідае за сабой права рэдагаваць допісы. Лісты мусяць быць падпісаныя, з пазнакай адрасу. Вы можаце дасылаць іх поштай, электроннай поштай ці факсам. Наш адрас: а/с 537, 220050, Менск. E-mail: nn@promedia.by. Факс: (017) 284-73-29.

# Сёмуха Нератку


АНАТОЛЬ КЛЯШЧУК

Якаў Джугашвілі загінуў у палоне, але каб служыць ворагам — не служыў! Выдатны прыклад для пераймання. Дзякую аўтару ліста.

Паважаны сп-ру Юрась Нераток!

Я знаёмы з Вамі па Вашых публікацыях у Інтэрнэце і, прызнаюся, знаёмства мне вельмі прыемнае. А можа, і Вы якую маю «перакладчыцкую вяшчыцу» чыталі. Бо неяк добра ж мы адразу паразумеліся. Ну, можна было не высылаць грошай на туалетную паперу, чорт зь ёю, з папераЙ, неяк падатруся, — я іх адправіў Вам назад, бо я ж разьлічваў на бартэр, але для наданьня сытуацыі адмысловай пікантнасьці можна было б і грашыма... Цаню высока Вашу іронію, прымаю яе. Нават сам з сабою разам дружна рагачу. І, мабыць, абодва мы добра расшалопалі, што не праз гэта так узьвіўся на дыбкі наш салідны «ЛіМ», дзе і я колісь гадоў 6—7 папрацаваў і захаваў добрую памяць пра калегаў.

А тут гэты ідыёцкі пратэст супроць нейкай дробязі, пасьля — ЛіМаўскі адлуп вуснамі Галубовіча, у выніку чаго я страціў Лёневу павагу, а сам ён расчараваўся ўва мне і запаў у глыбокую дэпрэсію. Як лёгка дэпрэсаваць чалавека! Але ж якое тут рады дасі, чым зноў зачараваць Галубовіча? Іншага выйсьця сабе ня бачу, як толькі пастарацца неяк выжыць бязь Лёневай павагі. Але паверце, павеяла нечым такім блізкім, родным і дарагім, не раўнуючы як прывітаньнем з таго, рэжымнага, сьвету, — ах, залаты савецкі час, калі бухгальтарка акуратна вылічвала з майго заробку адзін месячны аклад на дзяржаўную пазыку незалежна ад таго, падпісваўся я на яе ці не, — і ніякага табе клопату, ніякіх турбацый галаве, ніякіх пратэстаў і дурных авантур, сядзі сабе, Вася, роўна, не высоўвайся, дыхай носам — і будзе табе добра. І, бог таму сьведка, было добра, неяк прасьцей і, я сказаў бы — дэмакратычней! Бяз гэтых цяперашніх правоў асобы і свабоднага выбару. Бяз гэтых выбрыкаў і падкіндэсаў з падпіскай-непапіскай. «ЛіМу» дзякаваць трэба за адраджэньне сьвятой традыцыі, якая для мяне абярнулася нават крутым барышом, — ніякіх вылікаў з пэнсіі, а жывая падпіска за чужыя грошы, за Вашы, Юрась, грошы, заадно і падвышка накладу «ЛіМу» — прафіт не абы-які! Яшчэ й агульнае яднаньне на плятформе беларускасьці, без барыкадаў, палітыкі і ўзаемнага паглуму!

А што ж Галубовіч?.. А пры чым тут Галубовіч! Ён верна служыць дзяржаўна-холдынгаваму «ЛіМу», як раней верна ж служыў недзяржаўнай «Крыніцы», а сам «ЛіМ» служыць уладзе, якая чамусьці ня надта песьціць несэрвібільных пісьменьнікаў, бо, мабыць, усё-такі недавыхавана недасканалай паэзіяй Быкава. А паслужлівы «ЛіМ»? — а на ваўка яму тое выхаваньне, калі пад панам і так добра, умей толькі прагінацца, і хто тут яму штось закіне ў дакор! Мабыць, меў-такі рацыю той расейскі паэт, калі напісаў: «Люди холопского звания — сущие псы иногда». Такі наш «ЛіМ». Зачапіце толькі — мамэнтам павагу страціце, хоць, як на мой густ, дык лепей безь яе! Вы думаеце, «ЛіМ» перапрасіўся? Перааформіў падпіску? А хваробу! — ня будзьце аж такі наіўны, каб паверыць у такую бздуру. Як горды гішпанскі гідальга, праігнараваў ён пратэст, а свой гвалт ЛеГалізаваў, праз Галубовіча, які сваёй калейкай дагадзіў «ЛіМу», бы ксёндз Магдзе, і цяпер спрабуе апраўдацца перад панам біскупам за грэшную распусту.

Але і на Галубовіча я каменя за пазухай ня трымаю. Бо разумею яго: чалавеку жыць трэба, сям'ю карміць трэба — чалавеку шмат чаго на гэтым сьвеце трэба. А нам жа, старэйшым і малазабясьпечаным, ужо мала чаго трэба, нам жыць нават прасьцей: атрымаў пэнсію, дзе ў дадатак падзарабіў, дзе ашчадзіў, дзе ўкраў (а што Вы думалі, чаму й не! — дзяржава абабрала нас да галечы і сёньня думае не пра тую, невядомую нам, вечнасьць, а пра сваю вечнасьць на гэтым сьвеце. Якое ж тут дзіва, што ўварваць кавалак які ў дзяржавы, праехаўшыся зайцом, — гэта акт справядлівасьці, альбо, кажучы па-марксісцку, гэта і ёсьць экспрапрыяцыя ў экспрапрыятара!). Жыві і нагульвай сала, выкаблучвайся, бы вош на шкліне! Слабода ж бо, слабода, бля, слабода! — гэтая мая выключная алілуя «ЛіМу»!

Я атрымаў і колькі прыватных лістоў ды званкоў ад калегаў. Адны асуджаюць, другія ўхваляюць. Вось адзін калега піша (імя не назаву, бо ліст прыватны, думкай паважанага аўтара я даражу, хоць зь ёю нязгодны): «Дзікунскім падаўся твой учынак. Калі ласка, уяві сябе ў ролі бацькі, сын або дачка якога трапілі ў палон (да ворагаў), і толькі па гэтай прычыне ты адракаешся ад свайго дзіцяці, клянеш і прылюдна топчаш яго. А падобнага не дазваляў сабе нават такі людажэрац, як Сталін. Газэта «Літаратура і мастацтва» — у палоне!»

Хто яго ведае, як там было ў таго Сталіна, адно вядома — сын яго Якаў Джугашвілі загінуў у палоне, але каб служыць ворагам — не служыў! Выдатны прыклад для пераймання. Дзякую аўтару ліста.

Пісьменьнікі, «ЛіМ», «НН» і ўлада — ня ворагі, ніхто нікога не запаланяе, гэта супрацоўнікі аднаго грамадзтва, кожны са сваім разуменьнем дабра і зла, але ж кожны павінен працаваць у рамках прынятых чалавецтвам законаў маралі і этыкі, агульных для ўсіх. У дадзеным канкрэтным выпадку «ЛіМ» адзін такі закон пераступіў — пагвалтаваў Богам дадзеную чалавеку свабодную волю выбару паміж дабром і злом, сіламоц навязаўшы пісьменьніку волю сваю — халопскую.

За гэта яму, «ЛіМу», асуда і ганьба, а Вам, калега, шчырая падзяка за Ваша добрае сэрца, жаданьне дапамагчы ў цяжкі час і (NB) за Закуцьце, у падобным на якое прайшло маё дзяцінства.

З глыбокай павагай да Вас,

**Васіль Сёмуха**

# 25 мэдалёў: памерці, але забясьпечыць

**Беларускі бюджэт сёлетніх Алімпійскіх гульняў трымаецца ў поўным сакрэце. Але вядома, што неймаверныя сродкі былі выдаткаваны летась на рэканструкцыю больш як 30 спартовых аб’ектаў — 13,3 мільёна даляраў. У 2004-м на набыцьцё мяккага інвэнтару і экіпіроўкі пайшло звыш за 800 тысяч «зялёных». Фармакалягічныя і бялкова-вітамінныя прэпараты ў першым квартале абышліся ў 180 мільёнаў рублёў. Апрача таго, на спартовае абсталяваньне заплянавана патраціць 1,4 мільёна даляраў.**

Трохі болей за тры месяцы засталося да таго часу, калі на радзіме Алімпіяды будзе запалена полымя XXVIII летніх Алімпійскіх гульняў.

Палітыка кіраўніцтва Беларусі ў галіне вялікага спорту найлепшым чынам укладаецца ў канву векапомных савецкіх пяцігодак: выканаць пастаўленую задачу любой цаной, чаго б гэта ўсім нам ні каштавала. Бо ў якім яшчэ кірунку, як ня ў спорце, краіна можа апынуцца на 23-й пазыцыі ў сусьветным сьпісе сярод 199 дзяржаў? Мажліва, толькі ў рэйтынгу праваабарончай арганізацыі «Freedom House», дзе Аляксандар Лукашэнка фігуруе ў першай дваццатцы вялікіх дыктатараў сучаснасьці.

У традыцыйным красавіцкім «Пасланьні прэзыдэнта нацыянальнаму сходу і беларускаму народу» Лукашэнка (які зьяўляецца і старшынём Нацыянальнага алімпійскага камітэту) ва ўльтыматыўнай форме паўтарыў агучаную яшчэ пасьля сыднэйскай алімпіяды задачу: «Я думаю, што і ўрад, і міністар, і іншыя ведаюць дакладна, што зборная мусіць завяваць ня менш за 25 мэдалёў. Гэта і прагноз, і цьвярозы разьлік нашых магчымасьцяў, і наказ нашага народу беларускім спартоўцам. Можна наконт гэтага «выскаляцца». Прыгадваць дэвіз заснавальніка алімпійскага руху П’ера дэ Кубэртэна: «Галоўнае не перамога, а ўдзел». Гэта ўсё добра. Але нам патрэбен вынік — 25 мэдалёў. Няшмат, 25. Я ж сто не прашу».

У сваім выступе Лукашэнка не абмінуў трохразовага алімпійскага чэмпіёна і аднаго зь лідэраў парлямэнцкай групы «Рэспубліка» Ўладзімера Парфяновіча: «Калі ня ведаеце, як гэта рабіць, у Парфяновіча спытайце. Вярніце яму нармальныя чалавечыя пачуцьці, хай прыгадае свае перамогі на Алімпійскіх гульнях і справай зоймецца. Дапамажа вам перад Алімпіядай сплянаваць, як гэта зрабіць. І калі будзе больш за 25, мы ўсе скажам: «Малайчына, Валодзя, ты ўспомніў, як было раней». Вось тады і ў палітыцы слова будзе гучаць вельмі моцна і магутна».

Парфяновіч, як вядома, узначальвае Беларускую фэдэрацыю веславаньня на байдарках і каноэ, якая, згодна з плянам Мінспорту, мусіць прывезьці з Грэцыі адзін з 25 мэдалёў.

## Пропуск у Атэны

У часы Старажытнае Грэцыі алімпійскае спартовае сьвята ладзілася ў невялічкім горадзе Алімпія ў «сьвятарны месяц», які пачынаўся зь першай поўні пасьля летняга сонцастаяньня, і адбывалася праз кожныя 1417 дзён, што складалі «алімпіяду» — грэцкі алімпійскі год.

Гэтак жа й сёньня Алімпіяда для спартоўцаў пачынаецца за чатыры гады да афіцыйнае цырымоніі адкрыцьця спаборніцтваў. Складаны, шматэтапны трэніровачны працэс, адбор у склад нацыянальных камандаў — усё гэта папярэднічае галоўнаму ў спартовым сьвеце старту чатырохгодзьдзя. Завяяваньне алімпійскіх ліцэнзіяў — запаветных «квіткоў», што даюць права выступаць на Гульнях, — адзін з галоўных складнікаў перадалімпійскага марафону.

Кошт алімпійскіх пропускаў у разнастайных відах спорту значна адрозьніваецца. Калі дзюдаістам на сусьветным першынстве — найхутчэйшы спосаб адбору ў Атэны — неабходна было патрапіць у лік шасьці найлепшых пры колькасьці ўдзельнікаў 50—70 у кожнай вагавой катэгорыі, дык барцам вольнага стылю дастаткова было прабіцца ў дзясятку, дый прэтэндэнтаў на ўзнагароды там у два разы меней. Адсюль і розьніца ў колькасьці завяяваных на плянэтарным форуме ліцэнзій: дзьве ў дзюдо (пры двух мэдалях) і пяць ліцэнзіяў у вольнай барацьбе (адна ўзнагарода). Тыя атлеты, хто ня здолеў прайсьці адбор праз галоўныя старты — чэмпіянаты сьвету і кантынэнтаў, — маюць шанец зрабіць гэта,назьбіраўшы пэўную колькасьць балаў на міжнародных турнірах найвышэйшай катэгорыі.

У тых дысцыплінах алімпійскае праграмы, дзе лік вядзецца на сэкунды і хвіліны (лёгкая атлетыка, плаваньне), галоўная ўмова адбору — кваліфікацыйныя нарматывы «А» і «Б». Дэманструеш больш высокі вынік, які падпадае пад «А»-катэгорыю, — і за алімпійскую ўзнагароду могуць змагацца адразу тры прадстаўнікі тваёй краіны. Нарматыў «Б» дае дазвол на мінімальнае прадстаўніцтва каманды ў відзе.

На сыднэйскай Алімпіядзе-2000 у дваццаць адной дысцыпліне праграмы выступаў 141 беларускі спартовец. Гэтым разам Міністэрства спорту і турызму разьлічвае на 160—180 вакансіяў, прычым з улікам футбольнай зборнай, адбор для якой адбудзецца на чэрвеньскім чэмпіянаце Эўропы сярод моладзі.

У адпаведнасьці з рэгляментам Міжнароднага алімпійскага камітэту (МАК) у агульны склад беларускай дэлегацыі могуць быць уключаны каля сотні афіцыйных асобаў (55% ад ліку атлетаў). Мяркуецца, што ў Атэны накіруюцца 67 трэнэраў, 15 мэдыцынскіх супрацоўнікаў і 17 функцыянэраў, уключаючы штаб дэлегацыі з 6 чалавек. Акрамя таго, у Грэцыю паедзе група з 8 журналістаў-газэтчыкаў і 16 тэлевізійшчыкаў.

Сёньня ўжо 130 атлетаў выканалі алімпійскія кваліфікацыйныя нарматывы. Алімпійскі адбор быў завершаны ў грэка-рымскай і вольнай барацьбе, спартовай і мастацкай гімнастыцы, конным спорце, скачках у ваду, сынхронным плаваньні, скачках на батуце, кулявой стральбе, фэхтаваньні і цяжкай атлетыцы. Канчатковы склад спартовай дэлегацыі будзе вызначаны выканкамам НАК пасьля 15 чэрвеня.

## Па чым мэдаль

Напярэдадні Алімпіяды-2000 у сьценах Міністэрства спорту і турызму называлася лічба ў 10 мільёнаў даляраў ЗША. Столькі было выдаткавана на падрыхтоўку нашай каманды. Беларускі бюджэт сёлетніх Гульняў на радзіме Алімпіяды трымаецца ў поўным сакрэце. Але вядома, што неймаверныя сродкі былі вылучаныя летась на рэканструкцыю больш як 30 спартовых аб’ектаў — 13,3 млн даляраў. Адна толькі міні-лябараторыя для вызначэньня наяўнасьці ў крыві забароненага стэроіду эрытрапаэтыну абыдзецца ў 450 тыс. даляраў.

З улікам зробленага інвэставаньня старшыня аргкамітэту па падрыхтоўцы беларускіх спартоўцаў віцэ-прэм’ер Уладзімер Дражын адзначыў: «Нагадваю: існуе жорсткая ўстаноўка. Ніякіх крокаў назад! І, падкрэсьліваю, галоўная ўвага павінна быць удзелена дысцыпліне — падмурку максымальнага выніку… Прэзыдэнт краіны і НАК, а таксама ўрад зрабілі ўсё магчымае для спартовай галіны».



АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

**Гімнастка Іна Жукава заваявала алімпійскую ліцэнзію яшчэ летась.**

Але ня ўсё так проста, як здаецца нашаму чынавенству. У падрыхтоўцы спартоўцаў да Гульняў былі дапушчаны сур’ёзныя пралікі. Папершае — у мэдыцынскім забесьпячэньні і абслугоўваньні атлетаў. У чым і прызнаўся міністар спорту Юры Сівакоў пасьля лютаўскай нарады ў Мінспорту. Ашаламляльным вынікам гэткай недальнабачнасьці сталіся допінгавыя дыскваліфікацыі чэмпіёнкі сьвету і Алімпійскіх гульняў Яніны Карольчык (лёгкая атлетыка), чэмпіёна сьвету і прызёра Алімпіяды Генадзя Алешчука (цяжкая атлетыка), а таксама пераможцы Эўрапершынства і этапаў Кубку сьвету 17-гадовай Аляксандры Герасімені (плаваньне). Створаны ці не ў апошні момант Цэнтар спартовай мэдыцыны наўрад ці пасьпее за тры месяцы зрабіць усё тое, чаго не было выкана за чатыры гады.

Па-другое, ужо цяпер можна канстатаваць нечаканыя страты патэнцыйных мэдалёў на этапе заваёвы ліцэнзій. Слаўная некалі каманда гімнастаў, у складзе якой неаднаразовыя чэмпіёны сьвету і Эўропы, на апошнім плянэтарным форуме ня трапіла нават у тузін найлепшых. Таму прадстаўляць Беларусь на атэнскім гімнастычным памосьце будуць усяго двое. Канкрэтныя прозьвішчы назавуць перад Алімпіядай, але найхутчэй у Атэны паедзе Дзяніс Савянкоў у кампаніі ці то з Іванковым, ці то з Касьпяровічам. Яшчэ адзін заплянаваны мэдаль — у таэквандо — ужо дакладна ня будзе здабыты, бо алімпійскай ліцэнзіі беларусы тамака не атрымалі.

Па-трэцяе, колькасьць узнагародаў, здабытых у алімпійскіх дысцыплінах летась, — 24. Зь іх 7 — на рахунку лёгкай атлетыкі, на якую і ўскладаецца галоўная надзея. Па два прызавыя месцы былі завяяваныя прымамі нашае каманды — вясьляркай Кацярынай Хадатовіч і велатрэкаўкай Натальляй Цылінскай. Шмат у чым ад таго, ці здолеюць слаўныя беларускія жанчыны ў чарговы раз вярнуцца на радзіму са шчытом, і будзе залежаць лёс 25 узнагародаў.

**Кастусь Лашкевіч**

## Гісторыя беларускага алімпізму

вядзе свой пачатак ад 1912 г. Ураджэнец Горадні коньнік Караль Румэль прадстаўляў на стакгольмскіх Гульнях Расейскую імпэрыю. Праз 40 гадоў у фінскім Хельсынкі дэбютавала каманда СССР, у склад якой патрапілі і сямёра прадстаўнікоў БССР. Практычнае далучэньне суверэннае Беларусі да сусьветнага алімпійскага руху адбылося 10 гадоў таму, калі наша каманда пад белчырвона-белым сьцягам стартавала на зімовых Гульнях у нарвэскім Лілехамэры. У 1996 г. незалежная Беларусь упершыню ўзяла ўдзел самастойнай камандай на XXVI летніх Гульнях у Атлянце. За месяца на Алімпе змагаліся 155 беларускіх атлетаў у 22 відах спорту. Амэрыка падаравала нам 15 узнагародаў (1 залатая, 6 срэбных, 8 бронзавых) і першую алімпійскую чэмпіёнку — Кацярыну Хадатовіч зь вёскі Асечына Крупскага раёну, якая першынствавала ў спаборніцтвах па акадэмічным веславаньні. Зь мінулых Гульняў у Сыднэі (Аўстралія) беларуская каманда прывезла 17 мэдалёў (3-3-11) і 23-е месца сярод 199 краін сьвету ў неафіцыйным камандным заліку.

## Першымі зь беларускіх алімпійцаў

на зямлю Старажытнае Элады прызямляцца стралкі з луку й майстры парусная спорту — 30 ліпеня (цырымонія адкрыцьця Гульняў адбудзецца 13 жніўня). Апошнімі — 25 жніўня (за чатыры дні да цырымоніі закрыцьця) — група лёгкаатлетаў. Пералёт зь Менску ў Атэны будзе ажыцьцяўляцца рэгулярнымі рэйсамі авіякампаній «Lot» (Польшча) і «Austrian Airlines» (Аўстрыя). Для вяртаньня на радзіму чартэр наладзіць «Белавія». Важнай акалічнасьцю ёсьць і тое, што МАК вяртае краіне-ўдзельніцы выдаткаваныя на праезд сумы, а пражываньне ў алімпійскай вёсцы гасьцям нічога не каштуе.

## Афіцыйны спонсар

беларускай алімпійскай каманды — сусьветна вядомая фірма «Champion», якая распрацавала цывільны (сьветла-сталёвы колер галоўнага гарнітуру) і спартовы (цёмна-сіняя афарбоўка) строі для нацыянальнай каманды. Усё гэта з імпартнай тканіны будзе пашыта на чатырох супольных беларуска-італьянскіх прадпрыемствах «Дынама-Праграм».




## Пасадзіў Dead rap'ky

Зборнік, «БМА-груп», 2004

Рэпку вырошчвалі два гады. За гэты час кірунак якраз пасьпеў сканаць без падтрымкі і заахвочаньняў. Тое пацьвердзіў канцэрт-прэзэнтацыя зборніку, што адбыўся ў мінулым месяцы. Найлепшыя рэп-каманды сабралі толькі пару дзясяткаў гледачоў. Выступалі па схеме «абавязалка+сваё», зь невялікай ахвотай выціскаючы зь сябе нязвыклыя беларускія словы, а потым з імпэтам пераходзячы да расейскамоўных чытанак. Адсюль — недарэчнасьці з рыфмамі, вымаўленьнем, русізмамі. Так, напрыклад, рэпэры з «L-dil» сьпяваюць «Ладна, хопіць тлумачыць, што захад сонца ідзе, для цябе, Беларусь, гэта ўсё па барадзе…». Наймацнейшыя трэкі складанкі — «Пасадзіў Dead rap'ky / Rap not dead», «Цуд на Каляды» й «Дзень без гарэлкі» Памідорава. З посьпехаў — Сярогава «Лялька», натуральная і ненацягнутая. Тое ж можна сказаць пра тройку песень (Стэп, Чыманок, Пан Жыжма), а таксама шыкоўны паўкавэр «N.R.M.» «Паветраны шар» («Нестандартны варыянт»).

Адзнака – 3 (з 10)




## Ідэалёгія

«UltraВожык», 2004

Песьні пра кіраўніка дзяржавы пачалі складаць ужо ў першыя месяцы ягонага праўленьня. У сярэдзіне 90-х была папулярная песьня «Ляпісаў», якая так і называлася — «Лукашэнка». Міхалок узяў мэлёдыю і тэкст «Песьні пра Бурацiна», замяніўшы толькі слова ў прыпеве. Шкада, што ў альбомах яе так і ня выдалі.

У 96-м Кася Камоцкая сьпявала «Прэзыдэнт, ідзі дамоў», потым нейкія ананімы здагадаліся пакласьці недарэчныя выказваньні прэзыдэнта на электронную музыку. Песьні з назвамі «Гэта — член?», «Я прэзыдэнт пака» ды іншыя добра вядомы тым, хто бывае ў Інтэрнэце. З год таму па адрасе www. luka.rocks.it паўстаў цэлы музычна-палітычны праект «UltraВожык», прысьвечаны толькі песьням пра прэзыдэнта ці зь яго ўдзелам. Нарэшце, «сьціплыя героі труда» адзначыліся сапраўдным дыскам. Гэта сынгл з чатырма песьнямі. Пад дэнс-музыку ў першым трэку можна вывучыць асновы дзяржаўнай ідэалёгіі — «прадмет, які вучыць правільна жыць, думаць і чэсна галасаваць на выбарах». Ёсьць на кружэлцы і жартаўлівы «хваласьпеў», такое сабе блюзавае прысяганьне — «Кагда я стану прэзыдэнтам».

Можна пачуць і голас «самога»: у песьні «Вусаты дэмакрат» каронныя фразы, скампіляваныя разам, утвараюць даволі дакладны партрэт «выканаўцы». Асабліва прабірае выказваньне «Мяне можна ўпракнуць толькі ў том, што тое, што я гавару, можна была б не і гаварыць».

Праект-лідэр у кірунку музычнай сатыры. Зроблена зь любоўю…




## Залатыя яйцы

«Ляпіс Трубяцкой», «Вэстрэкардз», 2004

На тле мінулых дыскаў групы «Залатыя яйцы» падаюцца найменш гітовымі, але ад гэтага ня менш цікавымі і прыцягальнымі. Да таго ж, Сірожа і Паша нарэшце запелі па-беларуску, у запісе нават узялі ўдзел Кірчук і Дзьмітрыеў з «Троіцы». Міхалок кажа, што раней гуказапісвальныя кампаніі дыктавалі свае ўмовы і былі катэгарычна супраць гэтага, цяпер жа «Ляпісы» спачатку запісалі дыск, а ўжо потым прадалі на яго правы. Таму ў групы былі больш разьвязаны рукі. Магчыма, адсюль ня толькі «беларускасьць», але і альтэрнатыўнасьць гучаньня групы. Радыёфарматных песень практычна няма — хіба што вольная інтэрпрэтацыя «шлягеру» групы «Secret Service» пра паштальёнаў (мэлёдыю пазнае кожны). «Ляпіс» стаўся больш прыпанкаваным (што відаць зь песьняў «Лета ў Беларусі», «Курачкі»), яшчэ больш паглыбіўся ў рэгі-ска стылістыку.

Асабліва вартая ўвагі кампазыцыя «Любові капец», сыграная з аркестрам МУС РБ. Хай бы яшчэ зь дзясятак песень зрабілі — во цікавы выйшаў бы супольны праект! Дзіўнай вясёлай драйвавай песьняй «Рамонкі» сканчаецца альбом. Сам Міхалок кажа, што ў гэтым трэку папраўду беларускую яму ўдалося сказаць пра такія рэчы, пра якія па-расейску было б сорамна сьпяваць: «Ня ведаю нават чаму. Можа, таму, што некаторыя словы ў расейскай мове больш жорсткія».

Адзнака – 9 (10)

**Сяргей Будкін**

# Генэралы ўкраінскага року

**Дыск «Крамбамбулі» з удзелам Алега Скрыпкі выдае найбуйнейшая і найлепшая ўкраінская музычная кампанія «Lavina-music». Шырока вядомыя ва Ўкраіне беларускія «Ляпісы». Прыхільнасьці паўднёвых суседзяў паедзе шукаць і гомельскі рэпер Сярога. Падчас наўпростых — не праз Маскву — кантактаў з украінцамі выяўляецца, колькі ў нашай музыцы паралельнага.**










**Гэтыя й многія іншыя дыскі ўкраінскіх выканаўцаў можна замовіць праз Інтэрнэт з рэсурсу www.umka.com.ua. Дастаўка ў краіны СНД каштуе тры даляры.**

Сярод «лавінаўскай» прадукцыі — дыск гурту «Скрябін» з эстэтычнай назвай «Натура». Альбом выкананы ў такім сучасным рок-поп-гоп стылі. Што, дарэчы, таксама найбольш пасуе да азначэньня кірунку «Крамбамбулі 1S». На дыску як «прадусар гуку» пазначаны Ільля Лагуценка з расейскага «Мумия Троля», што надало запісу пэўны «муміётролеўскі» прысмак. Нягледзячы на ўсе гэтыя адносныя падабенствы, кружэлка мае яскравы нацыянальны калярыт. Што таксама родніць заходнеўкраінскіх выканаўцаў з нашымі візуальнымі «вандроўнікамі ды алькаголікамі».

На дыску 11 трэкаў з красамоўнымі назвамі: «Мовчати», «Червоні колготки» (ці першавынаходнікі «Ляпісы» сваіх «Чырвоных кальсонаў»?), «Відстань», «Спи собі сама», «Давай з тобою займатися любов'ю», «Дівчина Кончіта», «ВодаВогонь» ды інш. Пры ўсіх паралелях зь цяжкасьцю ўяўляю, як Лявон Вольскі, напрыклад, прасьпявае: «Відстань, я вб'ю тебе: ти тормознута; відстань, забудь мене — насиплю яду тобі в чай». Альбо Зьміцер Вайцюшкевіч, які цяпер робіць беларуска-італьянскую праграму: «Бун джорно сіньйоріта; дівчина Кончита: солодка, як халва, дешева, як трава…» А ў выкананьні «Скрябіна» гэта ня рэжа слыху. Свой калярыт, свая весялосьць. Розьніца ў мэнталітэтах?

Пры жаданьні можна знайсьці й даволі нам блізкае: «Розсказали по радіо, що знов піднимуться ціни на газ». Альбо такія дыямэнты, як «Давай помовчу тобі просто на вушко».

Адзінае, што пасьля ўсіх прыемных адкрыцьцяў шчыра зьдзівіла, — афіцыйны сайт гурту www.skryabin.ru выкананы цалкам па-расейску ды робіцца ў Пецярбургу.

### «Плач» нацыяналістаў

Калі «Скрябіна» можна тыпалягічна параўнаць з «Крамбамбуляй», дык украінскі «N.R.M.» — гэта львоўскі «Плач Єремії». Ён атрымаў шырокае прызнаньне задоўга да таго, як ва Ўкраіне зьявіўся музычны бізнэс.

«Плач» мае за плячыма 13 гадоў гісторыі, шэсьць студыйных альбомаў і безьліч канцэртаў, падчас якіх гурт інакш як «флагман українського інтелектуального року» і не называюць. Чаго варты толькі мэга-гіт «Вона» («Яна») — баляда, якую ўкраінцы незалежна ад моўнага вызначэньня ўпадабалі значна больш за модныя заходнія павольныя кампазыцыі. Каму апошнія гады даводзілася адпачываць на Крымскім узьбярэжжы, той ведае, што рабілася ўлетку на тамтэйшых дыскатэках.

Нядаўна складанка выбраных песень «Плачу Єремії» выйшла асобным дыскам у музычнай анталёгіі «Українська колекція». Дыск склалі лірычныя кампазыцыі, а таксама песні «що їх співали вояки Української повстанської армії». Варта адзначыць, што бацька лідэра гурту Тараса Чубая Рыгор, чые вершы таксама «кладуцца» на музыку «Плачу», — рэпрэсаваны ў 60-х паэт-дысыдэнт.

«Акадэмічныя» выданьні, кшталту «Ўкраінскай калекцыі», на постсавецкай прасторы дагэтуль існавалі толькі для расейскага року ды расейскага ж шансону. Таму варта парадавацца за паўднёвых суседзяў ды паспадзявацца, што хутка нешта падобнае займеем і мы. Пакуль жа назьбіралі толькі на «Справаздачу» «N.R.M.».

### Іх партызаны

Калі ўжо казаць пра такія рок-легенды Ўкраіны, як «Скрябін» ды «Плач Єремії», нельга абысьці ўвагай іх сумесную працу — альбом «Наші партизани», які выйшаў у 2000 г. і быў прысьвечаны ўсё таму ж паўстанцкаму войску. Нешта накшталт нашага супольнага «Я нарадзіўся тут», толькі ў больш акрэсьленай фольк-рокавай тэматыцы, лірычна-маршава-гімнавага характару. Посьпех сумеснай працы быў своеасаблівы. Дыск выйшаў накладам 1000 асобнікаў, і цяпер кожны яго рарытэтны асобнік каштуе 50 гривен (прыблізна 10 даляраў), а попыт усё не зьмяншаецца. Заплянавана хуткае перавыданьне.

Гэта яшчэ адзін важкі аргумэнт на карысьць таго, што «Скрыпка дрыгвы» ўсё ж павінна зьявіцца. Такія гіты, як «Паўстанцам 1863», абавязкова трэба выводзіць у шырокія масы.

На заканчэньне варта паўтарыць мэту, якую ставілі перад сабой стваральнікі Кіеўскага фан-клюбу «N.R.M.»: усталёўваць беларуска-ўкраінскія музычныя кантакты. Тады, можа, і ня будзе такіх праблемаў, калі празь неразьбяруху на расейскіх фабрыках, што займаюцца выпускам музычнае прадукцыі, пад пагрозай аказваюцца заплянаваныя рэлізы «Генэралаў айчыннага року», «срэбнай» «Справаздачы» энэрэмаўцаў ды другога «Ліцэйскага» дыску… Дарэчы, дыскі ўкраінскіх выканаўцаў, пра якія йшла гаворка вышэй, ды шмат-шмат якія іншыя можна замовіць праз Інтэрнэт з рэсурсу www.umka. com.ua — дастаўка ў краіны СНД каштуе тры даляры.

А ў пэрспэктыве варта было б запрасіць суседзяў з-пад жоўта-блакітнага сьцяга на тых жа «Генэралаў айчыннага року» ў якасьці ганаровых гасьцей. Нам ёсьць што прапанаваць адзін аднаму, і далей справа толькі за арганізацыяй. «Ляпісы» ды «Крамбамбуля» першыя свае крокі на ўкраінскі музычны рынак ужо зрабілі. Галоўнае — не спыняцца!

**Алесь Квіткевіч**





## «Рэактар»

**19 траўня,** у сераду, — вялікі канцэрт гурту «Стары Ольса», прэзэнтацыя альбому «Ладзьдзя роспачы». Квіткі: танцпол 6000, столік 8000. Т.: 649-08-88, 766-24-25, 400-67-74.

## «Крама» ў «Гудвіне»

**13 траўня** — жывая музыка, канцэрт гурту «Крама». Т.: 226-13-06, 626-13-03.

## Фінал футбольнага кубку

**16 траўня** адбудзецца фінал кубку Беларусі па футболе. У 18.30 на стадыёне «Дынама» сустрэнуцца ФК «Гомель» і ФК «Салігорск».

## Выстава Шунейкі

У галерэі «Мастацтва» (пр.Скарыны, 12) — выстава Яўгена Шунейкі «Праект глябальнага мастацтва», прымеркаваная да 50-годзьдзя аўтара.

Экспазыцыя — каля 20 пастэляў з пэйзажамі эўрапейскіх гарадоў і вобразамі жанчын. Шунейка вядомы шырокай публіцы з канца 80-х — пачатку 90-х, калі друкаваў у часопісе «Мастацтва» артыкулы па гісторыі сусьветнага мастацтва. Цяпер ён выкладае ў Акадэміі мастацтваў і Беларускім ліцэі.

## Аўтагонкі

**16 траўня** ў Салігорску аб 11.00 пачнуцца аўтамабільныя й матацыклетныя гонкі. Будзе перакрыты кавалак дарогі ад скрыжаваньня пр.Міру і вул. Казлова да скрыжаваньня вул. Казлова і вул.Заслонава.

## 12+1 у БДУ і ў Берасьці

**18 траўня** на філфаку Белдзяржунівэрсытэту — літаратурнае кабарэ. Такую форму абралі арганізатары для творчай сустрэчы зь пераможцамі конкурсу маладых літаратараў імя Н.Арсеньневай. Пачатак а 12.45, аўдыторыя 307. Вядуць спатканьне Ганна Кісьліцына й Андрэй Хадановіч.

Сустрэча ў Берасьці адбудзецца **20 траўня** аб 11-й на філфаку ўнівэрсытэту.

## Забытыя прывіды

**21 траўня** ў Беларускім ПЭН-Цэнтры адбудзецца прэзэнтацыя кнігі Вадзіма Болбаса «Забытыя прывіды мрояў». Пачатак а 19-й. Уваход вольны.

## Спулчэкер

**21 траўня** а 14-й у Лінгвістычным унвэрсытэце (Захарава, 21) у пакоі 213а адбудзецца прэс-канфэрэнцыя з нагоды стварэньня кампутарнае праграмы праверкі беларускае артаграфіі.



## Ігры багоў

**19 траўня** ў Моладзевым тэатры эстрады гурт «GUDA» прэзэнтуе новую сольную праграму «Ігры багоў». Сцэнарны падмурак праграмы складаюць некалькі міталягічных сюжэтаў, у якія арганічна ўплеценыя старадаўнія абрадавыя песьні. Паралельна із сьпевамі будзе разгортвацца сцэнічная дзея, дэманстравацца відэашэраг. Упершыню фальклёрны матэрыял будзе прэзэнтаваны ў гэткай натуральнай для жанру канве. Прэзэнтацыя адбудзецца ў рамках праекту «Легенды Вялікага Княства». Кошт квітка — 4000—5000 руб. Замовы праз т. 8-029-616-84-90. Пачатак а 19-й.

## Канцэрты

**Канцэртная заля «Менск»**

**20** (чц) — «Дзідзюля» — флямэнка, рытмы Ўсходу. Квіткі: 15000—25000.

**Дом афіцэраў**

**19** (ср) — танцавальны псыхоз «Pops foundation». Т.: 779-95-53.

**Бітлз-назаўсёды**

**15 траўня** (сб) на адкрытай пляцоўцы ля Машэрава, 14 адбудзецца 1-ы міжнародны музычны фэст «Бітлз-назаўсёды». Уваход вольны. Пачатак а 15-й.

## Выставы

**Арцяшок (Галівудзкія весялухі)**

**З 13 траўня** ў малой залі Музэю сучаснага мастацтва працуе праект «Арцяшок (Галівудзкія весялухі)».

**Юй Чжэньцы: «Любімая Беларусь»**

**У Музэі сучаснага мастацтва** экспануецца выстава фатаздымкаў пасла КНР Юй Чжэньцы «Любімая Беларусь і замежжа ў фокусе». Гэта першая выстава майстра па-за межамі радзімы.

**Лесдрэўтэх**

**З 18 да 21 траўня** ў НВЦ «Белэкспа» можна будзе наведаць 5-ю спэцыялізаваную выставу «Лесдрэўтэх». Даведкі праз т. 234-01-31.

**Рэзка. І зварка**

**З 18 да 21 траўня** «Экспафорум» (пр.Машэрава, 14) запрашае на 3 выставы: «Белпрамэкспа-2004», «Энэрга- і рэсурсазахаваньне-2004» і «Зварка і рэзка-2004».

## Тэатры

**Імя Янкі Купалы**

**13** (чц), **19** (ср) — «С.В.*».
**14** (пт) — «Каханьне ў стылі барока».
**15** (сб), **20** (чц) — «Парфён і Аляксандра».
**16** (ср) — «Таполевая завея».
**17** (пн) — «Ромул Вялікі» (гістарычна недакладная камэдыя).

**На сцэне Палацу культуры прафсаюзаў**

**21** (пт), **22** (сб) — «Смак яблыка».

**Малая сцэна**

**15** (сб) — «Салямэя».
**16** (ндз) — «Барух-Эмануэль».
**19** (ср) — «Беларусь у фантастычных апавяданьнях».
**20** (чц) — «Муж для паэтэсы».
**22** (сб) — «Налу».

**Опэра**

**15** (сб) — «Іялянта».
**16** (ндз) — «Аіда».
**20** (чц) — «Чароўная флейта».
**22** (сб) — «Пікавая дама».

**Балет**

**18** (аўт) — «Жызэль».
**19** (ср) — «Спартак».
**21** (пт) — «Кармэн-сюіта», «Карміна-бурана».
**23** (ндз) — «Лебядзінае возера».

**Музычны тэатар**

**14** (пт) — музычнае шоў «Галяктыка каханьня».
**15** (сб) — «Вясёлая ўдава».
**16** (ндз) — «Шахеразада», «Новыя амазонкі».
**18** (аўт), **19** (ср) — «Юнона і Авось».
**20** (чц) — «Капялюш Напалеона».

**Тэатар імя Горкага**

**13** (чц) — «Перад захадам сонца».
**14** (пт) — «Зьвеставаньне Марыі».
**15** (сб) — «Дэтэктар хлусьні».
**16** (ндз) — «Суцяшальнік удоў».
**18** (аўт) — «Амфітрыён».
**19** (ср) — «Вольны шлюб».
**20** (чц) — «Анджэла ды іншыя».
**21** (пт) — «Ад'ютант-Ка Яго Вялікасьці».

**Тэатар «Дзе-я?»**

**14** (пт) — «Гарбата зь вярблюдам».
**20** (чц) — «Шалёныя грошы».
**21** (пт) — «Квадратура круга».

**Тэатар беларускай драматургіі**

**17** (пн) — «Чорны квадрат».
**15** (сб), **18** (аўт) — «Адэль».

## Спэктаклі для дзяцей

**Тэатар імя Янкі Купалы**

**15** (сб), **16** (ндз) — «Афрыка».

**Опэра**

**23** (ндз) — «Горад майстроў».

**Тэатар юнага гледача**

**18** (аўт) — «Рыцар Ордэну Сонца».
**20** (чц) — «Тарас на Парнасе».
**21** (пт) — «Тая, што зьдзейсьніла цуд».
**22** (сб) — «Сястра мая Русалачка».
**23** (ндз) — «Дзень нараджэньня ката Леапольда».

**Экспэрымэнтальная сцэна**

**21** (пт) — «Апошняя дуэль».
**16** (ндз) — «Айбаліт-2002».

## Клюбы

**«Bronx»**

**14** (пт), 22.00 — live: Svet & All Boogie Band — акустычны блюз.
**15** (сб), 22.00 — Sunglasses party dj Санчас (Масква), dj Paliony, dress code: sunglasses.
**19** (ср), 22.30 — live music: «Дыліжанс».
**20** (чц), 22.00 — клюбны чацьвер: dj Kulikov.
**21** (пт), 22.00 — live music: Тані Фарэда (вакал).
**22** (сб), 22.00 — Bergamo, dj Grizzly.

**«X-Ray»**

**14** (пт), 22.00 — Антонаў.
**15** (сб), 22.00 — Noche.
**21** (пт), 22.00 — Yulik, dj Арлоў (італа дыска).
**22** (сб), 22.00 — топ.

**«Presto»**

**14** (пт), 23.00 — Jet Sounds presents. Uma.

**«Ямайка»**

**14** (пт), 21.00 — pre/arter party; 21.00—24.00 — dj Даша Пушкіна.
3.00—XXX — dj List, dj Noche.
**15** (сб), 3.00 — after party; 3.00—XXX — dj Санчас (Масква); 3.00—7.00 — dj Grizzly.
**21** (пт), 21.00 — pre/arter party; 21.00—24.00 — dj Даша Пушкіна; 3.00—XXX — dj Noche, dj Zmeev.

**«Гудвін»**

**14** (пт), 21.00 — жывая музыка: «Mojo Blues».
**15** (сб), 20.00 — жывая музыка: «N.C.» — джаз-трыё.
**16** (ндз), 20.00 — жывая музыка: акустычнае джаз-трыё.

**«NC»**

**16** (ндз), 18.00 — «Metal fest».
**21** (пт), 18.00 — «Hardcore vs Rap».

**«West World Club»**

**15** (пт), 22.00 — dj Kucho (Мадрыд, Гішпанія).

## Кінатэатры Менску з 14 да 16 траўня

**«Аўрора»** (253-33-60)

«Нават ня думай-2: Цень незалежнасьці» (прэм'ера): **14** (пт) 18.30; **15, 16** (сб, ндз) 14.30 (іл), 18.30.
«Мільён год да нашай эры»: **14** (пт) 17.00, 19.00, 21.00.
«Як адчапіцца ад хлопца за 10 дзён»: **15, 16** (сб, ндз) 15.00 (іл), 17.00, 19.00, 21.00.
«Егер»: **14—16** (пт—ндз) 16.30, 20.30.

**«Бярэсьце»** (272-87-91)

«Нешчасьліўцы»: **14** (пт) 15.00, 17.00, 21.00; **15, 16** (сб, ндз) 13.20 (іл), 15.10, 17.00, 21.00.
«Заплямленая рэпутацыя»***: **14—16** (пт—ндз) 19.00.

**«Кастрычнік»** (232-93-25)

«Пакуты Хрыстовы»****: **14, 15** (пт, сб) 16.10, 18.30, 21.00 (пад.); **16** (ндз) 16.10 (іл), 18.30, 21.00 (пад.).

**«Масква»** (223-27-10)

«А вось і Полі»: **14** (пт) 17.00, 19.00 (пад), 21.00 (пад); **15, 16** (сб, ндз) 19.00 (пад), 21.00 (пад).
«Мільён год да нашай эры»: **15** (сб) 15.00, 17.00; **16** (ндз) 15.00 (іл), 17.00.

**«Мір»** (284-37-71)

«50 першых пацалункаў»: **14** (пт) 19.10, 21.10; **15, 16** (сб, ндз) 15.00, 19.10, 21.10.
«Блубэры»: **14** (пт) 16.50; **15, 16** (сб, ндз) 16.50 (іл).

**«Перамога»** (223-77-66)

«А вось і Полі»: **14** (пт) 14.40, 19.00, 21.10; **15, 16** (сб, ндз) 14.40 (іл), 16.50, 19.00, 21.10.
«Монстар»**** («Оскар-2004»): **14** (пт) 16.50.

**«Піянер»** (227-64-87)

«Халодная гара» («Оскар-2004»): **14** (пт) 18.00, 20.40; **15, 16** (сб, ндз) 15.20, 18.00, 20.40.
«У сузор'і Быка»: **14** (пт) 16.00; **15, 16** (сб, ндз) 13.40.

**«Цэнтральны»** (227-34-16)

«Нават ня думай-2: Цень незалежнасьці» (прэм'ера): **14—16** (пт—ндз) 13.00, 15.00, 19.00, 21.00.
«Неслужбовае заданьне»: **14** (пт) 11.00, 17.00; **15, 16** (сб, ндз) 11.00 (іл), 17.00.

(іл) — ільготны сэанс (скідка 50% для ўсіх гледачоў)
(пад) — падоўжаны сэанс
Рэйтынгавыя абмежаваньні:
*** — дзеці да 16 год не дапускаюцца;
**** — дарослым з 18 год.

## Юнаму гледачу

**«Аўрора»**

«Юрка — сын камандзіра»: **14** (пт) 12.30, 14.30.
«Карпарацыя монстраў»: **15, 16** (сб, ндз) 12.30.

**«Бярэсьце»**

«Дзявятая застава»: **15, 16** (сб, ндз) 11.50.

**«Масква»**

«Блізард»: **15, 16** (сб, ндз) 13.00.

**«Мір»**

«Скарб»: **15, 16** (сб, ндз) 12.30.

**«Перамога»**

«Кніга джунгляў-2»: **15, 16** (сб, ндз) 13.10.

**«Піянер»**

«Як справіцца з бацькам»: **14** (пт) 14.00.
«Геркулес»: **15, 16** (сб, ндз) 10.20.
«Сьцюарт Літл-2»: **14—16** (пт—ндз) 12.00.

**Аўтары паласы: Сяргей Будкін, Сяргей Петрыкевіч; АШ; НБ**

КІНО Ў МЕНСКУ

# Буйная рыба яшчэ не сплыла

**Пакуль кінапракат упарта запрашае нас у камэрцыйную краму Мэла Гібсана і прапануе пазбавіцца нават намёкаў на розум у моднай макулятуры «Нават ня думай-2», варта ўзгадаць фільм, які зьяўляецца сапраўдным Кіно і яшчэ не сышоў з экранаў.**



CINEMA.COM

«БУЙНАЯ РЫБА» («Big Fish»)
ЗША, 2003, каляровы, 124 хв.
**Жанр:** Трагікамэдыя з элемэнтамі казкі
**Адзнака:** 8 (з 10)

Кінарэжысэра Ціма Бёртана («Сонная лагчына», «Эдвард — рукі-нажніцы») заўжды цікавілі страшныя казкі. Але што будзе, калі казку сутыкнуць з рэчаіснасьцю?

Стары Эд Блум (Альбэрт Фіні, а ў юнацтве — Эван Макгрэгар) усё жыцьцё распавядаў показкі, так што ягоны сын Уіл нават ня ведае, што праўда, а што не. Перад сьмерцю бацькі сын вырашае разабрацца, дзе ісьціна. І высьвятляецца, што праўда і выдумка пераплецены ў жыцьці дзіўным і незвычайным чынам. Асілак (сапраўдны гігант Мэцью Макгроры), употайкі вывезеныя з камуністычнай Карэі сіямскія блізьняты, паэт-гангстэр, які перакваліфікаваўся ва ўплывовага бізнэсоўца, дырэктар цырку, а па сумяшчальніцтве ваўкалак (Дэні дэ Віта), закаханая ведзьма — усё гэта і фантазіі, і праўда.

У межах адной сцэны адбываецца пераход ад дзівосаў да штодзённасьці, ад сьмеху да жалю — і гэта прыкмета такога найкаштоўнейшага жанру, як трагікамэдыя. Тут трагікамэдыя пабудаваная на казках, і самая неймаверная хлусьня, самая незвычайная фантазія жывуць з намі, як нязмушаная і свабодная дзіцячая гульня. І гэта сьведчаньне таго, што не ачарсьцвела яшчэ чалавечае сэрца.

**Андрэй Расінскі**

# Іншыя беларусы




Надзея Дземідовіч. Век так ня будзе. Менск: Архіў найноўшай гісторыі, 2002.




Уладзімер Корзун. Успаміны і роздум. Маладэчна: Бібліятэчка часопісу «Куфэрак Віленшчыны», 2004.

Пазіраю на кніжныя паліцы і адзначаю, што колькасьць мэмуараў павялічваецца. І так ужо здараецца, што некаторыя з гэтых кніжак (прыкладам, успаміны ўдзельнікаў паваеннага патрыятычнага падпольля, выдадзеныя пад назвай «Гарт», ці «Ня жаль пражытага» Сакрата Яновіча) яшчэ не прачытаныя. Бо хапаешся ў першую чаргу за тое, што бліжэй да тваіх зацікаўленьняў. У мяне гэта — міжваенны пэрыяд і ўсё зьвязанае з імёнамі братоў Луцкевічаў.

Неяк убаку апынулася і кніжка Надзеі Дземідовіч «Век так ня будзе». А цяпер, прачытаўшы гэтыя ўспаміны, буду спасылацца на іх як на доказ таго, што беларуская этнічная сьвядомасьць нават у той час, як былі абвешчаныя БНР і БССР, нават у пэрыяд Сялянска-работніцкае грамады закранула ня ўсіх заходніх беларусаў, нават у тых кутках, якія тады ўжо далі беларускаму вызвольнаму руху сваіх сыноў і дачок.

Я мог бы доўга пералічаць тых дзеячоў, што нарадзіліся ў Косаўскім, Пружанскім ды Слонімскім паветах, і вёскі Бусяж ды Дзявяткавічы, непадалёк ад якіх нарадзілася і расла Н.Дземідовіч, не магу назваць глухім кутком, а вось Раман Дземідовіч, які і ў Амэрыцы пабываў, і нават радыёпрыёмнік меў (!), і ягоныя дзеці, у тым ліку аўтарка ўспамінаў, беларусамі сябе не ўсьведамлялі — заставаліся тутэйшымі.

Калі прыйшла беларускасьць да Н.Дземідовіч і да яе большае сястры Марыі? Ці не пасьля знаёмства Марыі з Барысом Данілюком, сынам сьвятара (а раней — старшыні Ваўкавыскае павятовае рады, удзельніка Слуцкага паўстаньня) Хведара Данілюка? Як тут не згадаць і куды заможнейшых Міклашэвічаў — бацькоў Ларысы Геніюш, і саму паэтку, якая стала беларускаю толькі ў 25 гадоў, калі пазнаёмілася зь Янкам Геніюшам? Хоць Н.Дземідовіч пра гэта й ня піша, усьведамленьне *ўсіх* тутэйшых сябе беларусамі сталася магчымым у 1939—1941 г. — пры «першых саветах». Вучоба ў Беларускай прагімназіі ў Слоніме падчас вайны аўтарчыну беларускасьць умацавала.

Калі б я, памяняўшы імя й прозьвішча Н.Дземідовіч, сеў ды напісаў раман пра яе паваенныя блуканьні па пакутах (5 гадоў хавалася ад МГБ у Беларусі й Казахстане), вывеўшы вобраз гожага залётніка Сашы, які пасьля арышту гераіні ператвараецца ў афіцэра ГБ Аляксандра Іванавіча ды ўчыняе ёй першы допыт, хто-небудзь з крытыкаў назваў бы такі ход літаратуршчынай. І тое, што маці, малячыся за зьняволеную дачку, у серады і пятніцы нічога ня ела, крытык таксама назваў бы літаратуршчынаю. А тое, што ў бальшавіцкай няволі пабывалі і бацькі гераіні, і брат яе, а старэйшая сястра эміґравала, майстры сацрэалізму назвалі б згушчэньнем фарбаў. Але тут мы маем справу з успамінамі. І крытыкам з майстрамі нічога не застаецца, як сказаць — так было.

Надзея Дземідовіч нарадзілася і расла ў Заходняй Беларусі, а Ўладзімер Корзун — ва Ўсходняй. Іншае выхаваньне, іншая асьвета. Тут мне цікавыя ўспаміны пра тое, як сяляне ўцякалі ад калектывізацыі ў Заходнюю Беларусь, як хаваліся па лясах, як на іх ладзілі аблавы і як аўтар успамінаў — настаўнік — браў у такой аблаве ўдзел. Падкупляе ягонае прызнаньне: і я б выдаў «кулакоў» — уцекачоў з высылкі, «калі б ведаў пра ўцёкшых», бо «гарачы патрыятызм і савецкае выхаваньне таго часу не дазволілі б мне змаўчаць». «Доносительство» ўвайшло ў норму савецкага ладу жыцьця. І калега У.Корзуна мог нападпітку хваліцца, што ён з 1926 г. працуе на «органы».

Цікава было чытаць і пра настаўніцкія пайкі, бо ўжо сёе-тое ведаю з бальшавіцкіх газэт таго часу. Шкада, што аўтар не затрымаўся падрабязьней на так званай ліквідацыі непісьменнасьці, бо мне вядома агульная карціна: быў даведзены плян ліквідаваць непісьменнасьць да 1 траўня 1932 г. Ліквідаваць яе не ліквідавалі, але пасьля тае даты пачалася барацьба з… малапісьменнасьцю.

Успамінаючы пра час вайны і сваю партызанку, У.Корзун не ўдае зь сябе героя. Ён быў адным зь першых беларускіх падсавецкіх аўтараў, якія расказалі пра зьдзекі партызанскіх камісараў і камандзіраў зь мірных людзей (у тым ліку паказаны «подзьвігі» Героя Савецкага Саюзу Ўладзімера Ціхамірава). Прачытаем мы і пра тое, як іншы камандзір, правёўшы ноч з выляжанкаю з атраду Героя Савецкага Саюзу Віктара Ліўенцава, атрымаў ордэн за мужнасьць на «рэйкавай вайне», як партызаны забівалі бязьзбройных і параненых нямецкіх жаўнераў…

Рэдактар Міхась Казлоўскі ў сваёй прадмове да кніжкі У.Корзуна піша, што ён «ня быў антысаветчыкам, дысыдэнтам». Антысаветчыкам і дысыдэнтам у дакладным значэньні гэтага слова, мажліва, і ня быў, але іншадумцам — быў несумненна. Чалавека, які ў першай палове 1970-х браў у якасьці эпіграфу верш Алеся Гаруна, пісаў, што і Сталіна, і Гітлера трэба было павесіць на адной асіне, які паказваў разбэшчанасьць чынавенства і жорсткасьць сыстэмы (У.Корзуна вызваліла зь няволі вайна), які сьведама ўхіляўся ад сяброўства ў камсамоле і КПСС (кпліва называў іх перадавым атрадам чалавецтва), — гэтага чалавека, калі б выявілі ягоны рукапіс, чакалі б непрыемнасьці. І ўсё ж У.Корзун — у адрозьненьне ад пісьменьнікаў, якія хваліліся, што ў шуфляду не пісалі, — меў сьмеласьць расказаць пра сябе, свой род і свой час папраўдзе.

Успаміны антысаветчыцы, «заходніцы» Н.Дземідовіч і крытычна настроенага да савецкага ладу «ўсходніка» У.Корзуна ўзаемадапаўняюцца, паказваюць, што былі і іншая Беларусь, і іншыя беларусы. Мо гэтыя мэмуары належала трошкі ўкамэнтаваць (скажам, у 1920—30-х г. не было ў БССР Міністэрства асьветы), мо належала б памяняць неарыгінальны загаловак успамінаў У.Корзуна, але іх каштоўнасьць для гісторыка і краязнаўцы бясспрэчная. І для тых, хто любіць літаратуру факту, непрыдуманую прозу, таксама.

**Анатоль Сідарэвіч**

# Ад «Ойча наш»




Хрысьціянская азбука: Чытаньне для дзяцей і бацькоў. — Менск: Біблійнае таварыства ў Рэспубліцы Беларусі, 2003.

Выданьне працягвае традыцыю, пачатую ў першай трэці мінулага стагодзьдзя, але выгодна адрозьніваецца ад тагачасных выданьняў шыкоўнай паліграфіяй. Мастак Ігар Гардзіёнак стварыў запамінальны відэашэраг, хоць часам дзеля большага дыдактычнага эфэкту грашыць лубачнасьцю. «Азбука» прываблівае арыгінальна падабраным і адметна скампанаваным матэрыялам: пасьля ўступнага «Ойча наш» тут чаргуюцца прыпавесьці зь Дзіцячае Бібліі, казкі, загадкі, прымаўкі, скорагаворкі, вершы Артура Вольскага, Рыгора Барадуліна, Ніла Гілевіча, Васіля Віткі ды іншых аўтараў, збольшага старэйшае генэрацыі.

Дапаўняецца кніга пераказамі пэўных біблійных тэкстаў для чытаньня, аповедамі пра найважнейшыя хрысьціянскія сьвяты, «Слоўнічкам», а завяршае яе «Малітва» Натальлі Арсеньневай.

Трэба аддаць належнае далікатнасьці ўкладальнікаў «Хрысьціянскай азбукі», якія рознымі (часам небясспрэчнымі) спосабамі імкнуліся нівэляваць канфэсійныя разыходжаньні дзяцей, яе патэнцыйных чытачоў: імёны, назвы, паняцьці падаюцца дзе ў праваслаўнай, дзе ў каталіцкай, дзе ў пратэстанцкай традыцыі, а дзе — і ў адпаведнасьці з інтуіцыяй.

«Азбука» вельмі вартая. Біблійнае таварыства, акрамя таго, апошнім часам выдала зборнік беларускай духоўнай паэзіі «Сонца сьвятое — Хрыстос», больш ураўнаважаны й менш тэндэнцыйны ў параўнаньні з анталёгіяй «Насустрач духу», укладзенай прафэсарам Чаротам, ды «Новы Запавет» у легендарным перакладзе а.Уладзіслава Чарняўскага.

**Лявон Баршчэўскі**

# Кніга, напісаная па-філямацку

Анэкдот. На ўступным іспыце па гісторыі зьдзіўленая камісія пытаецца ў абітурыенткі: «Адкуль такія факты?! Па якім падручніку Вы рыхтаваліся?» — «Як па якім — па кнізе Чаропкі!» — адказвае дзяўчына. «А па Вальтэру Скоту не спрабавалі?»

Кніжка Кастуся Цьвіркі яшчэ менш прыдатная да таго, каб па ёй вучыць гісторыю. Але прачытаць «Край легенд» у гадоў трынаццаць не зашкодзіць — да скону не саб'ешся зь беларускага шляху. Толькі вось адсылкі да сярэдняга школьнага ўзросту ў кнізе няма.

Хоць крыніцаю творча апрацаваных фактаў аўтар называе народную памяць, сам ён падчас напісаньня відавочна карыстаўся выцінкамі, зробленымі колісь зь легендаў і хронікаў рамантыкамі-філяматамі, а пазьней — Міколам Ермаловічам ды Вітаўтам Чаропкам. З выдадзенымі й перавыдадзенымі працамі апошніх «Краю легендаў» наканавана суседзіць на паліцах кнігарняў. Ці ўлічвала гэта выдавецтва, друкуючы тысячу асобнікаў?

Аўтар дзейнічае ў стылістыцы ўлюбёнцаў-філяматаў, таму кніжку можна назваць паэмай у прозе, узьнёслым перасьпевам сухога летапіснага радка. У кантэксьце такой бэлетрызацыі натуральна глядзяцца зацяжныя пазыцыйныя баі з імпэрскімі гісторыкамі.

Тэкст абсыпаны народнымі ідыёмамі: крыжакі «падмазваюць пяты», комтур «павярнуў аглоблі» і г.д. Дзіўнае спалучэньне з па-філямацку ўзвышаным тонам. Кніжка неаднародная й стылёва. У процівагу рамантычным аповедам пра гісторыю даўнюю, разьдзел, прысьвечаны пытаньням беларуска-літоўскіх адносінаў ды лёсу Віленскага краю ў XX ст., — чыстая эмацыйцная публіцыстыка.

Бэлетрыстычны падыход вымушае аўтара падзяляць падзеі на станоўчыя і адмоўныя, а герояў — на добрых і дрэнных. Часам перахіл у бок патэтыкі надае аповедам камічнае адценьне: «Нямецкае каменнае ядро паставіла кропку на 25-гадовым княжаньні Гедыміна, выдатнага беларускага дзяржаўнага дзеяча». Там, дзе аўтар адступаецца ад прынцыпу абавязковага ўхваленьня «нашых», сюжэт ажывае. Як у выпадку з станоўчым з усіх бакоў Давыдам Гарадзенскім, які раз «падзяліў» прыгожую паланянку з польскім рыцарам, расьсекшы яе надвое.

**Яўген Квач**

## • НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ •

**Беларуска-польскія архіваліі: Стан і пэрспэктывы** / Бел. дзярж. ун-т; Варшаўскі ўн-т; Польскі інстытут у Менску; Гістар. майстэрня ў Менску; Рэд. К.Козак: Матэр. другой бел.-польск. канф. архівістаў, 10—11 кастр. 2001. — Менск, 2003. — 240 с. 100 ас.

У артыкулах на беларускай, польскай, расейскай, француськай мовах разглядаюцца асаблівасьці вядзеньня справаводзтва па сакрэтных справах пачатку XIX ст., зьмест архіваў земскіх судоў ВКЛ і іншыя пытаньні архівазнаўства.

**Новы Запавет** / Пер. на бел. мову У.Чарняўскага; Нав. рэд. пер. Ж.Некрашэвіч-Кароткая; Літ. апрац. тэксту А.Бокуна. — Менск: Біблейскае таварыства ў Рэсп. Беларусь, 2003. — 304 с. 3000 ас.

Плён шматгадовай працы ксяндза Ўладзіслава Чарняўскага. У кнігарнях прыдбаць можна за 8500 руб.

**Хрысьціянская азбука: Чытаньне для дзяцей і бацькоў** / Маст. І.Гардзіёнак. — Менск, 2003. — 96 с.: іл. 3000 ас.

Азбука, падрыхтаваная Біблійным таварыствам у Беларусі, мае на мэце ня толькі пазнаёміць дзетак з навукай чытаньня, але й закласьці ў іх асновы хрысьціянскага сьветапогляду. Караценькія тэксты гэтага дбайна аздобленага выданьня заклікаюць падумаць пра самае істотнае: добрыя й благія ўчынкі, стаўленьне да бацькоў, значэньне ведаў, сапраўднае сяброўства. На кожную літару падабраныя прыклады й запамінальныя вершаваныя радкі. Шмат у кнізе прыказак, загадак, забаўлянак, якія прывабяць малых да чытаньня.

**Echa Polesia:** Biuletyn oddziału Brzeskiego ZPB. — 2004. — № 1. — 32 s. 299 ас.

Квартальнік «Саюзу палякаў на Беларусі» друкуе польскамоўныя матэрыялы пра гісторыю Берасьцейшчыны ды Піншчыны: «Культура-асьветнае жыцьцё Пінску ў міжваенны пэрыяд», «Аматарскі тэатар Берасьця ў міжваенныя гады», «Славутыя людзі Палесься». Адзіная беларускамоўная публікацыя нумару — «Скокаўскі Рахвал» аўтара «НН» Анатоля Гладышчука.

**Тацяна Вабішчэвіч**




Цвірка К. Край легенд: Гісторыя Беларусі паводле паданьняў і легендаў/ Кастусь Цвірка. — Менск: «Беларускі кнігазбор», 2004. — 400 с.

## Твор пра каханьне

**29 красавіка — 2 траўня 2004 г. у Менску адбыўся фінал літаратурнага конкурсу «Твор пра каханьне», прысьвечанага 700-годзьдзю Ф.Пэтраркі. Падчас майстар-клясаў маладыя літаратары напісалі між іншага крытычныя зацемкі пра сваіх калегаў. Публікуем некаторыя вершы фіналістаў разам з фрагмэнтамі гэтай крытыкі.**

**Андрэй Хадановіч**



Вольга
АНІКІЕВІЧ

«Вольга Анікіевіч прыемна зьдзівіла — прынамсі, мае стэрэатыпы пра паводзіны падманутых, кінутых, закінутых, пасланых, засланых і неразасланых парушыла. Аказваецца, абсалютна на ўсе рэчы можна глядзець досыць іранічна, выкарыстоўваючы ня толькі зьдзек ды добра прыхаваную крыўду, але й самаіронію».

**Sany Dragonfly**

## Пра вечнае

Каханьне ня мае гадзіньніка.
Таму ты спазьняешся,
Таму ён чакае бязьмерна доўга,
Таму гэта шчасьце.
Каханьне ня мае тэрмомэтра.
Таму ты ня п’еш лекаў,
Таму ён ня ведае, што ўжо хворы,
Таму вы не паміраеце ад грыпу.
Каханьне ня мае золата.
Таму ты ніколі не фарбуешся,
Таму ён ніколі ня бачыць тваіх дзіравых панчох,
Таму для вас няма перашкод.
Каханьне ня мае хібаў.
Таму ён ідэальны,
Таму ты непаўторная,
Таму мы й не кахаем, бо ўсё занадта добра
І гадзіньнікі існуюць паўсюль.



Яўген
БУРЫ

«Заблукаўшы ў жыцьці, чалавек прыходзіць у парк, каб пабыць сам-насам са сваім сумам, адзінотаю й тузінам адвечных рытарычных пытаньняў. І пакрысе разбор палётаў асабістага «я» ператвараецца ў сапраўдную мэдытацыю…»

**Кацярына Марголь**

* * *

Разьвітаньне. Апошнія словы,
Што сказаць намагаліся век,
Сьсеклі вусны, сьлязою сталёвай
Адракліся дрыжачых павек.

У бяздоньні вачэй палымяных
Зьнерухомеў імклівы прамень.
Гукі сьпяць, толькі водар туману
Ахінае абуджаны дзень.

Сакавітым павейваньнем ветру
Шчодра лашчацца пасмы бяроз.
Саламонава постаць пад кедрам
Адбіваецца ў кропельках сьлёз.



Цемрык
ВЕЛЕТ

«Нешта ў лесе вялікае здохла. Можа, ня ў лесе. Можа, паўсюль паздыхала… І вынікам сталіся творы Цемрыка Велета. Магчыма, што здохла гэта ўсё менавіта ад гэтых «творыкаў», бо яго паэзію абсалютна натуральна назваць кіслотным дажджом у сучаснай беларускай літаратуры».

**Уладзімер Лянкевіч**

## (Маё паўднёвае мноства)

увечары вароны ды іншыя крыклівыя постаці
знаходзяць мэку ў вартаўнікоў
мае межакрылы не назіраюць зорнасьці
ў небе між бітага шкла парнікоў
цябе могуць знайсьці й адвезьці ў турму
бо ты чужы ненадзейны сябар
нейкага там балотнага цэнтру
дзе я толькі пакупнік і аматар
падсьвечаны й тыражаваны глухі менск
дзівіць правінцыялаў ды іншую навалач чысьцінёю
нават зімою будзе квітнець бэз
калі гэтага захочуць бамжы й героі
у віхуры танцу любімага спрадвечнага
пад гвалт калёнак і скрыгатаньне льду
аддайся мой мая маё да болю елачнае
колкае ні на што не падобнае — я іду...
мае скалечаныя й людажэрныя вершы
ніколі ня стануць прыкметай вялікага красамоўства
проста сёньня на вуліцы сьнег і першы
ліст дасланы да цябе маё паўднёвае мноства



Sany
DRAGONFLY

«Шчыра кажучы, у кожным з нас недзе глыбока-глыбока ўсё-такі сядзіць сэнтымэнтальны хлопчык на пару зь летуценным рамантыкам. І гэта вельмі добра, што ў адным і тым жа часавым і прасторавым кантынууме поруч з творамі а-ля «Бумбамліт» можна знайсьці творы а-ля Саня Страказа, дзе галоўную ролю грае якраз рамантыка».

**Юлія Шастак**

* * *

Цішэй...
Грае дождж па званюткай вадзе,
Грае дождж, ці гуканьне, ці шэпт...
Я змарную сваю надзею,
Я змарную сваю надзею,
Дзе я, дзе я,
Дзе?
Глядзі:
Мы сустрэліся, зблытаўшы сны,
Пад нагамі дрыжыць маладзік...
Мы тут воляю чараўніцы,
Мы тут воляю чараўніцы,
Сыніцца, сыніцца...
Зьнік.
Хадзем,
Я цябе праўду да нябёс,
Ты — чужы, як і я, між людзей...
Вочы твае — чысьцюткія росы,
Вочы твае — чысьцюткія росы,
Сьлёзы, сьлёзы,
Лёс.
Я змарную сваю надзею.
Дзе я,
Дзе я,
Дзе я...



Глеб
ЛАБАДЗЕНКА

«Не зьвяртаць увагі на вершы Глеба Лабадзенкі цяжка. На ягоную творчасьць існуе своеасаблівая мода… Яго любяць, яму зайздросьцяць. Прычына зайздрасьці — у літаратурным посьпеху. Прычына посьпеху — у вынаходстве новага жанру паэзіі… Пагер-вершы зьдзіўляюць, падабаюцца, шакуюць. Ня ведаю чалавека, якога б яны пакінулі абыякавым».

**Вольга Марозава**

* * *

Трымаць —
а не трымацца —
слова,
цябе цалаваць
у любы мароз.
Гэта —
сьвята
зь вясёлым назовам,
да якога я
не дарос.
Ціха палец
тулю да гашэткі,
і карціну
нясе
па акне.
Белы шалік
дарожнай
разьметкі —
ватэрлініяй
мне
на дне.



Уладзімер
ЛЯНКЕВІЧ

«Чалавек, якога забілі ў пад’езьдзе. Чалавек, які сам вызначыў паняцьце «пад’ездавасьць» ня ў сэнсе тыповасьці, бляклаcьці й брутальнасьці, а своеасаблівага стылю паводзінаў як у паэтычным радку, так і ў музыцы. Безумоўна, шмат хто пачне наракаць: «Вось яшчэ адзін гарадзкі!» — і будзе мець рацыю».

**Цемрык Велет**

* * *

Лаўка. Ён. Ляжыць.
Уткнуўшыся носам у першы нікчэмны сьнег,
ці то сон, ці то праклён, сьнег раньні, яшчэ певень зімы не
прасьпяваў.
Ляжыць. Накрыўся капялюшам.
Кажуць: «П’яны, батрак, наркаман, напаліўся, не, п’яны...
А раптам...»
Кажуць, праходзяць побач тупатам.
А ён не самагубца.
Проста не стрымаў дакору, ніхто не зразумеў.
Не пачуў.
Пакрыўдзіўся ён, як дзіця, радасна-сумна лёг і памёр.



Кацярына
МАРГОЛЬ

«Перажыць — значыць адчуць жыцьцё кожнай клеткаю сваёй плоці, кожным нэрвам сваёй душы… Героі Кацярыны Марголь — бунтары ад бясьсільля. Людзі, што прагнуць глыбіні жыцьця і таму апускаюцца на яго дно, каб зразумець, што дна не існуе».

**Яўген Буры**

* * *

Ля шыі схлусі,
Як пальцы бягуць па пацерках...
Твой позірк — бы стрэл,
Бы здрадлівы *amen* — жаліцца.
Паклянчы малітваў,
А лепей за ўсё — па мацерцы.
Ужо ўсё адно —
Ці шэптам,
Ці ўголас ляяцца.

Ты просіш чакаць.
З адчайных вярэшынь — у пакутніцы,
Пачварай спаўсьці
У бездань — красуню смуглую.
І верыць у цуд — а што калі раптам круціцца,
І веры даваць — а што калі раптам круглая.



Вольга
МАРОЗАВА

«Выбітны паэт А.Сыс напісаў: «Ёсьць прыгожыя вершы. Прыгожых паэтаў няма». Выбітны паэт А.Сыс проста ня ведаў Вольгі Марозавай. Вользе пашанцавала, што яна не мужчына, — інакш нарцысізму ёй было б не абмінуць. А прыгожай дзяўчыне можна пісаць любыя вершы. Але Вольга Марозава ня піша любых вершаў, а піша толькі харошыя».

**Глеб Лабадзенка**

* * *

Прыйшоў цягнік.
Не да мяне.
У іншы бок.
А я чакаю.

Амаль што мой,
Бо так падо-
Бны да майго.
Я не спыняю.

Цябе стварала —
Не змагла
Зьмірыцца, зь лё-
Гкасьцю змалола.

Усьведамляла.
Берагла
Свае палё-
Ты без анёла.



Віялета
ПАЧКОЎСКАЯ

«Файныя мэтафары паэткі — ня сродак нешта схаваць, наадварот, думаецца, што для Віялеты Пачкоўскай сьвет існуе ў гэткіх самых праявах, што і ў яе вершах».

**Вольга Анікіевіч**

## Напрадвосені

Ня бойся, распранайся.
Мы ідзём
Выкалваць вочы ночы. Жнівень. Твой
Салёны смак і водар палыновы.
І я — мэтафара the best да слова «восень».
Нам хопіць органаў пачуцьцяў —
Адшукаць
Чарговы ўсход і філязофскі камень,
Нам хопіць перашкодаў —
Пазабыць
Свае імёны і чужыя хайку.
Я расьцякуся па тваёй крыві,
Ты зацьвярдзееш у маіх касьцях.
Ты быў.
Я буду.
А цяпер мы ёсьць,
І немагчыма зашпіліць маланку
На голай праўдзе
Й патаўсьцелай ночы.
Я затушу апошніх сьветлячкоў.
Ня бойся, распранайся,
Мой анёле.
Ня бойся, дай руку,
Я — твая восень.



Юлія
ШАСТАК

«Часам можна пачуць, што пісаць у рыфму і з рытмам сёньня нямодна. Нібыта памер, рыфма стрымліваюць палёт думкі, кіруюць паэтам, абавязваюць, у выніку чаго выходзіць зусім ня тое, што мелася быць на пачатку. Але ў кожным правіле ёсьць выключэньне, бо калі рабіць нешта віртуозна, гэта заўсёды будзе заўважана. Такім выключэньнем ёсьць творчасьць Юліі Шастак».

**Віялета Пачкоўская**

## Рамонкавы сум

У рамонкавых зрэнках анёлаў
Адбіваюцца сумныя зьявы.
Адбываюцца сумныя зьявы
Ў сэрцах цэркваў, у сэрцах касьцёлаў.

Дзеля нейкай вясёлай забавы,
Рытуальнай падмены пярсьцёнкаў,
Спалучэньня двух вуснаў у гронку
Вас паклікаў сьвятар, дзеля справы,

На якую ў час ранішняй кавы
Пазіраюць з халоднай і тонкай
Ўсьмешкай сумныя вочы рамонкаў
Зь недасяжнай нябеснай дзяржавы,

Зь недасяжных нябесных маёнткаў.
Вось урэшце сьвятар маладжавы
Скажа «амэн» з лагодай і жалем —
І гульцам, бач, бывае няёмка.

У рамонкавых зрэнках анёлаў
Адбіваюцца сумныя зьявы.
Адбываюцца сумныя зьявы
Ў сэрцах цэркваў, у сэрцах касьцёлаў.

**Фота Андрэя Лянкевіча, Глеба Лабадзенкі**

ЛЕВЫМ ВОКАМ

# Поўны сюр



Новая трактоўка ўладамі сьвята 9 траўня — рэквіем да сотай гадавіны клясыка сюррэалізму Сальвадора Далі.

Сэміялягічныя прыгоды савецкіх сьвятаў — вялікая і цікавая тэма. 8 Сакавіка было прыдумана сацыялісткай Кларай Цэткін як дзень барацьбы «другога полу» за роўнасьць зь першым. Сёньня 8 Сакавіка выглядае як караоке мужчынскіх стэрэатыпаў у дачыненьні да фэмінаў, якія ад прыроды такія рахіткі, што трэба іх абараняць, песьціць і дарыць кветкі. Плянка маразму ўзята ў Гомелі, дзе на апошняе 8 Сакавіка жаночыя дэлегацыі ўсклалі кветкі да помніка княгіні Паскевіч. Жонка князя, які асабіста душыў паплечнікаў Цэткін у Будапэшце і Варшаве, відавочна, дасюль прапэлерам круціцца ў труне.

1 Траўня было ўведзена другім Інтэрнацыяналам як сьвята салідарнасьці працоўных, а атрымаўся «дзень дачніка», 23 Лютага было задумана як дзень жаўнераў РККА, а на выхадзе маем сьвята ўсіх, хто мае першасныя мужчынскія палавыя прыметы.

Сьвята перамогі таксама не пазьбегла ўсёлай трансфармацыі. У свой час 9 Траўня было ўведзена як сьвята перамогі над фашызмам, пад якім разумелася «тэрарыстычная дыктатура самых рэакцыйных сілаў манапалістычнага капіталу» (ВСЭ).

Нядзіўна, што ў Францыі левыя сьвяткуюць 8 траўня як дзень нараджэньня мадэлі «сацыяльнай дзяржавы»: якраз пасьля краху нацызму пачаліся такія прагрэсіўныя рэформы, як нацыяналізацыя буйных прадпрыемстваў, забарона картэляў, вольны доступ да адукацыі, наданьне жанчынам права ўдзельнічаць у выбарах…

Зразумела, у сучаснай Беларусі такая трактоўка 9 Траўня недарэчная. Уявіце сабе «расьцяжкі» над праспэктам «Студэнты, будзьце дастойныя дзядоў-вэтэранаў — патрабуйце бясплатнай адукацыі!» або прагон беларусбашы наконт таго, што манапалізацыя рынку цукру, якую праводзіць яго заўхоз, нагадвае яму маркетынгавую палітыку канцэрну Крупа пры нацыстах.

9 Траўня падносіцца як дзень павагі да вэтэранаў, хутчэй — да генэрацыі тых, каму прыйшлося прайсьці праз вайну. Ніколі не адмаўлялі сабе ўлады нагадаць нам, што сучасная апазыцыя — клоны паліцаяў і калябарантаў другой сусьветнай, у барацьбе зь якімі склаў галаву кожны трэці беларус.

У гэтым годзе да традыцыйных трактовак дабавілася яшчэ адна: камэнтуючы 9 Траўня дэфіле прэзыдента па стомэтроўцы, камэнтатар БТ некалькі разоў падкрэсьліў, што беларускія жаўнеры і партызаны другой сусьветнай «замагаліся за незалежнасьць беларускай дзяржавы».

Магу паклясьціся, што гэта цытата з Шушкевічавай прамовы на 9 траўня 1993 г.

Інтэрпрэтацыя падзей другой сусьветнай як барацьбы за незалежнасьць, магчыма, і мае грунт, аднак тое, што гэтая думка прагучала падчас клімаксу расейска-беларускіх адносін, наводзіць на шалёную думку: няўжо гэта не канец трактовак 9 Траўня? Няўжо, калі б восеньню чакаў рэфэрэндум, то са слоў БТ вынікала б, што беларусы ў 41-м ішлі ў атаку з думкай аб трэцім тэрміне? У любым выпадку чакаю ад «Беларусьфільму» новага шэдэўру пра вайну, дзе партызан, пускаючы ў паветра цягнік з карнікамі, крычыць: «Гэта вам, гады, за незалежнасьць!»

Між тым, сёньня ў Менску чатыры антыфас чакаюць судовага працэсу за бойкі з наны-скінхедамі. Баюся, што для іх 9 Траўня як Дзень перамогі над фашызмам — фуфло.

**Лёлік Ушкін**

ЛІЧБАВАНКА

Разьмясьціце спалучэньні лічбаў у пададзеную сетку

**3-значныя:**
111; 191; 231; 395; 594; 869, 961, 292

**4-значныя:**
2381; 2481; 2691; 3245; 3781; 4261; 5418; 5842; 6894; 8271; 5831; 4163

**5-значныя:**
12345; 47318; 53291; 64135; 64214; 82419; 86945; 97548

**7-значныя:**
3998524; 8247351

**9-значныя:**
648749765; 648742163

**10-значныя:**
1365894620; 8254971603



ФЭЛЬЕТОН

# «Дажынкі» — зладзеям спажыўкі

Жыве ў Ваўкавыску дзядзька Міша. Насупраць ягонай хаты ў парку ідзе падрыхтоўка да «Дажынак» — ломяць старыя пабудовы. Дзядзька Міша — гаспадар запасьлівы. Як толькі будаўнікі ўвечары сыдуць (тады ноччу яшчэ не працавалі), ён бярэ вазок — і ў парк, там можна разжыцца якімісь дошкамі, рэйкамі: усё роўна вывезуць на сьметнік, а ў гаспадарцы ўсё прыдасца. Вязе аднойчы ён свой вазок, а тут чорт нанёс машыну ДАІ (непадалёку іх база). Але ў дзядзькі Мішы зь імі свае гешэфты, і яны яго добра ведаюць, таму толькі спыталі: «Чаго ня сьпіш ноччу?» — «Дык днём жа будаўнікі не дадуць!»

Другім разам, зараз па Вялікадні, ужо як усё зламалі, вывезьлі і пачалі штосьці будаваць, дзядзьку Мішу спатрэбілася будаўнічая рошчына. Прыйшоў да хлопцаў і кажа: «Сёньня трэці дзень сьвятаў, — кідайце ўжо рабіць!» — «А вось, дзядзька, раствор як вырабім увесь, тады й кінем!» — «Дык я вам зараз дапамагу», — набраў вядро рошчыны ды дахаты. І хлопцам добра: хутчэй скончылі, і дзядзьку — дзіркі мышыныя ў склепе амаль усе замазаў, крышку толькі не хапіла. Ну нічога, заўтра дамажа.

Цяпер у многіх газэтах пішуць, што грошы, выкінутыя на «Дажынкі», ідуць на вецер. Адзін хлопец з-за Сьвіслачы хоча хату абкласьці цэглай, казаў — ёсьць магчымасьць раздабыць цэглу ў Ваўкавыску за паўцаны, цэмэнт ужо «дастаў». А колькі яшчэ пойдзе ўсяго «налева» і «направа» — невядома.

А колькі на гэтым пажывяцца мэры-пэры гораду і іх бліжнія ды набліжаныя?..

Дзядзька Міша зь вядром рошчыны паміж імі — проста анёл сьвяты.

**ПК, Хілімонаўцы, Сьвіслаччына**

УДАКЛАДНЕНЬНЕ

Мікіта Красноў, згаданы ў «Хроніцы апазыцыі» №17 як «сацыял-дэмакрат», насамрэч належыць да «Маладога фронту». Спадзяемся, што наш недаведак не зашкодзіў гонару, годнасьці й дзелавой рэпутацыі Мікіты.

ПАШТОВАЯ СКРЫНКА

**Ягору Д. з tut.by, Віталю С. зь Менску, Андрэю М. з Горадні** ды інш. Фільм А.Кудзіненкі «Акупацыя. Містэрыі» пакуль не распаўсюджваецца ў Беларусі. Яго распаўсюд на відэакасэты будзе наладжаны пасьля Маскоўскага кінафэстывалю.

**А.Н.** Няможна грунтавацца на інфармацыі спэцслужбаў (пра фальшывыя даляры Марыніча). Той факт, што Вы на ёй грунтуецеся, робіць немагчымым надрукаваньне Вашага меркаваньня ў «НН».

ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**ВІТАНЬНІ**

**Вольга У**. Віншую цябе з Днём народзінаў! Зычу, каб жыцьцё было сьветлым і шчасьлівым. Аліна

**Віншуем Вольгу У**., Сашу Г., Вольгу К. з Днём народзінаў. Жадаем усяго найлепшага. Эк-23

**КАНТАКТЫ**

**Падкажыце**, калі ласка, куды аддаць дачку (4 гады) на дадатковыя заняткі зь беларускай мовай навучаньня. Алесь. Т.: 288-63-84, 771-49-39

**Запрашаем** летам на экзатычны адпачынак у міжнародны археалягічны летнік «Камунікацыя Палятыды». Лес. Дзьвіна. Новыя сябры. www.bonalita.narod.ru. Т.: 8-029-776-26-75

**Шукаю** кантактаў зь беларусамі Нямеччыны (пажадана Паўночны Рэйн-Вэстфалія). blason@tut.by

**Сутнасьць** угледзіш праз гэтыя словы: «Любоў да Радзімы, павага да мовы!!!» МІ «Вока» http://www.voka.tk

**Прагаласуй** за «Генэралаў» на http://www.vokamusik.by.ru

**Заходзьце** на сайт МІ «Вока» http://www.voka.tk

**КНІГІ**

**Васіль Быкаў** «Выбраныя творы» — 28-ы том кніжнага праекту «Беларускага кнігазбору» — ужо ў продажы.

**Набуду**: Я.Купала — 1 том; сэрыя «Мой родны кут» — «Берасьцейшчына», «Меншчына». Т.: 259-55-40

**Дзіцячыя відэа** ды аўдыёкасэты, кнігі, а таксама рэдкія выданьні беларускага замежжа, значкі, кераміка, календары на Румянцава, 13 (ТБМ) ля Лінгвістычнага ўнівэрсытэту, з 12-й да 19-й, апроч суботы ды нядзелі. Т.: 707-40-01

**Беларускія кнігі** і часопісы ў Баранавічах. Самыя танныя кошты ў Заходняй Беларусі. Т.: 8-029-767-20-37

**Энцыкляпэдыя** «Гісторыя Беларусі» (т.2, 5, 6, 6-ІІ), «Беларусы ў ЗША» В.Кіпеля, кнігі на тэму антыбальшавіцкага змаганьня, дзіцячыя кнігі, календары, аўдыё, CD, відэа, майкі на Румянцава, 13 (ТБМ): 12.00 — 19.00, апроч суботы ды нядзелі. Т.: 8-029-707-40-01

**ПАКОІ**

**Прадаю** пакой у 6-пакаёвай кватэры. Цэнтар Менску, побач мэтро. Ірына. Т.: 8-029-660-53-12

**Здыму** пакой або кватэру (танна). Ксенія. Т.: 228-00-89 (пасьля 20-й)

**29—31 траўня**
**запрашаем у вандроўку**
**«Золота Підкова Львоўшчыны»**

Менск—Жоўква—Крэхіў—Львоў—Алеск—Падгорцы—Золачыў—Сьвірж—Менск

Кошт вандроўкі: для дарослых 45 у.а. + 15 000 руб., для школьнікаў і студэнтаў — 40 у.а. + 15000 руб.

Кошт уключае: праезд аўтобусам, начоўку ў гатэлі «Львоў», экскурсійнае абслугоўваньне без уваходных квіткоў (квіткі ў замкі каштуюць 0,1—0,5 у.а.).

Неабходныя дакумэнты: пашпарт, для непаўнагетніх — натарыяльна пацьверджаны дазвол на выезд за мяжу ад абаіх бацькоў.

Т.: 8-029-755-03-70, 222-88-76



**Шукаю памяшканьне**

**ў арэнду** (ня толькі ў Менску) пад бытавыя паслугі. У людным месцы, не вышэй за першы паверх. Ад 5 да 60 кв.м.
Т.: 8-029-626-05-41, (017)264-27-69

**ПРАЦА**

**Запрашаю** да супрацы сур’ёзных, настойлівых ды ініцыятыўных спадарыняў ды спадароў. Т.: 8-029-766-12-79. Зьмітрусь

**Якасна** выканаю пісьмовыя працы па беларускай гісторыі, літаратуры і мове. Зьвяртацца загадзя. Юрась. Т.: 235-18-72 (пасьля 17-й)

**Запрашаем у вандроўкі**



**16 траўня**

**Гомель**

Палац Румянцавых—Паскевічаў (1785—1793).
Ільлінская царква, драўляная, канец XVIII ст.
Паляўнічы домік (пач. XIX ст.).
Парк (канец XVIII — 1-я палова XIX ст.) з пажарнай вежай (канец XVIII — 1-я палова XIX ст.).
Петрапаўлаўскі сабор (1809—1824).
Пахавальня Паскевічаў (1870—1889).
Кошт — 21000 р. для дзяцей і 23000 р. для дарослых.

**23 траўня**

**Браслаў**

Замкавая гара (старажытнае гарадзішча IX ст.).
Драўляны калодзеж XIX ст.
Касьцёл 1824 г.
Царква 1897 г.
Больніца С.Нарбута (канец XIX — пач. XX ст.).
Сядзібная забудова (1-я трэць XX ст.).
!!!!!!!!!!!!! **Фэст «Браслаўскія зарніцы»**
Кошт — 21000 р. для дзяцей і 23000 р. для дарослых.

Тэлефануйце: 222-88-76, 755-03-70; http://altusplus.narod.ru

**Запрашаем на падарожжа**
**16 траўня** (нядзеля) па маршруце:
**Менск—Смургоні—Сьвір—Засьвір—Шэметава—Лынтупы—Камаі—Паставы—Нарач—Мядзел—Менск.**

**22—23 траўня**:
**Берасьце і навакольле.**

Тэл.: 232-54-58, 8-029-622-57-20 (Зьміцер); 264-12-38, 8-029-776-24-35 (Павал).

Наша Ніва КУПОН БЯСПЛАТНАЙ ПРЫВАТНАЙ АБВЕСТКІ

Запоўніце гэты купон, і мы надрукуем Вашу абвестку (ня больш за 15 словаў) бясплатна. А/с 537, 220050, Менск.

**Тэкст** ______________________________

**Імя і прозьвішча** ______________________________

**Адрас, тэлефон** ______________________________

**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

| | |
|---|---|
| сакратарка рэдакцыі | Наста Бакшанская |
| галоўны рэдактар | Андрэй Дынько |
| фота-рэдактар | Арцём Лява |
| карэктар | Сяргей Петрыкевіч |
| карэктарка | Галіна Рабянкова |
| нам. галоўнага рэдактара | Андрэй Скурко |
| тэхнічны рэдактар | Андрэй Чык |
| выдавец і заснавальнік | Фонд выданьня газэты «Наша Ніва» |

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@promedia.by**
**On-line: www.nn.by**

© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.
8 палос фарматам А2, 4 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня № 581 ад 4 ліпеня 2002 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусі. Юрыдычны адрас: г. Менск, вул. Калектарная, 20а, п. 2а. Р/р 3015212000012 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 3524. Газэта выдаецца 48 разоў на год.

Нумар падпісаны ў друк 22.00 14.05.2004.

Замова № 2826.

Рэдакцыйны адрас: Менск, Калектарная, 20а/2а